„ЦЭНТРАЛЬНАЕ БЮРО ЎСЕБЕЛАРУСКАГА АБ'ЯДНАНЬНЯ
ПОЭТАЎ І ПІСЬМЕНЬНІКАЎ „МАЛАДНЯК"

# БЮЛЕТЭНЬ

## 1-га ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ „МАЛАДНЯКА"

ВЫДАНЬНЕ ЦБ „МАЛАДНЯКА"
МЕНСК—1926

ЦЭНТРАЛЬНАЕ БЮРО ЎСЕБЕЛАРУСКАГА АБ'ЯДНАНЬНЯ
ПОЭТАЎ І ПІСЬМЕНЬНІКАЎ „МАЛАДНЯК“

# БЮЛЕТЭНЬ

## 1-га ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ „МАЛАДНЯКА“

3335

ВЫДАНЬНЕ ЦБ „МАЛАДНЯКА“
МЕНСК—1926

Біб СНК

1-я дзярж. друк. Заказ № 1922—2000 экз. Галоўлітбел № 15736.

# Прывітаньні зьезду.

ТЭЛЕГРАМА.

*Менск з Масквы*

Першаму Ўсебеларускаму Зьезду „Маладняка", будаўнікам культуры вялікага Кастрычніка на Беларусі, песьняром і пісьменьнікам пролетарскага напрамку, кавалём новых формаў літаратуры шлем шчырае прывітаньне. Пад кіраўніцтвам Комуністычнай Партыі йдзеце ў гушчы рабочых і сялян і разам з імі будуйце новае жыцьцё.

*Ігнатоўскі, Славінскі, Ульлянаў, Шукевіч-Трацьцякоў, Курцік.*

ТЭЛЕГРАМА.

*Менск з Гурзуфу*

Шчыра вітаю наш Першы Зьезд Жадаю продукцыйнае працы

*Зарэцкі*

ТЭЛЕГРАМА.

*Менск з Харкаву*

Маладнякові молодого кипіння ЗПТ мудрости і волі бажають.

*Тичина, Хвильовий, Яловий Панч.*

ТЭЛЕГРАМА.

*Менск з Харкаву*

„ПЛУГ" вітае Перший З'изд „Маладняка"

*З'ИЗД ТК ЗДС*

ТЭЛЕГРАМА.

*Менск з Харкаву*

Вітаю Всебелоруськiй З'изд Маладняковців авангард жовтневоі культури Бажаю буйного розвітку опанузання найпередовшыми технічними засобами Европи. Дінамичною сюжетністю, верлюбром.

*Валеріян Поліщук*

ТЭЛЕГРАМА.

*Менск з Харкаву*

Червоний шлях щиро вітае З'їзд „Маладняка"

*Редколегія*

ТЭЛЕГРАМА.

*Менск з Харкаву*

Дуже жалкую не можу бути на З'їзді. Щіро вітаемо Всібілоруськi З'їзд „Маладняка". Певні, що складних умовах НЕП'а білоруська пролетарська література разом пролетаріятам і партією найде правільний шлях комунізма.

За бюро ЦК *Гарту Христовий*

*Менск 25-XII—25 г.*

**Першаму Зьезду „Маладняка“.**

*Менск.*

Дарагія таварышы!

Беларускае Цэнтральнае Бюро Саюзу Эспэрантыстых Савецкіх краін шле сваё шчырае прывітаньне Першаму Зьезду беларускіх пісьменьнікаў і поэтаў „Маладняк“.

Вы—творыце новую беларускую культуру, з якой мы пазнаёмім Заходні Маладняк, які па вашых дасягненьнях будзе таксама з разьвіцьцём нацыянальнай культуры прымаць удзел супольна з Вамі у будаваньні ўсясьветнае пролетарскае культуры.

Вашаму першаму Зьезду мы жадаем продукцыйнае працы.

*Сакратарыят б. Ц. Б. СЭСК.*

**І-му З'їздові Всебілоруського Об'єднання письменників і поетів „Маладняк“.**

Дорогі товариші!

Від імени Саюзу українських пролетарських і селянських письменників в РСФСР „Село і Місто“ витаемо І-ий Всебілоруський З'їзд Об'єднання письменників і поетів „Маладняк“.

Ми глибоко переконані, що в історіі відроджэння белоруськоі культури на твердій базі соціяльних і економічних здобудків Жовтневоі Революціі „Маладняк“ буде іі важливим роздилом-частиною.

Ми, Союз СІМ надзвичайно спільно та дружно розуміемо те жахливе історичне минуле, що в ньому рідне слово білоруських робітників і селян було заковане у важкі кайдани царського гніту.

І тим більш важліве завдання лежить перед „Маладняком“, як авангардом революційноі білоруськоі літератури: дігнати те, чого вам не дало минуле і ввести білоруську літературу на рівний рівень инших цівілізованых народів.

Ми, наш Союз СІМ вважаемо, що „Маладняк“ це своі велике історичне завдання, що його поставили перед ним робітничі та селянські маси Червоноі Білорусі—виконае на усі 100 проц., працаючи вкупі з нашою партею, пролетаріятом і селянством при великому будівництві нового життя та побуту.

Хай живе вільне білоруське слово!
Хай живе Червона Білорусь!
Хай живе „Маладняк“, іі авангард!

Москва, 25 листопада 1925 р. *Центральний Комітет СІМ.*

**Дарагі Міхась Чарот!**

Прачытаў і ўспомніў аб тым, што 22/XI будзе зьезд „Маладняка“. У гэты час я буду на Віцебскай партконфэрэнцыі і ня буду мець магчымасьці быць на Зьезьдзе.

Дужа жаль, бо хацелася-б відочна бачыць маладнякоўскую моц, якая ўпраглася ў працу за інтарэсы рабочага і селяніна.

Дык ты ўжо сам перадай маё шчырае прывітаньне.

Заўсёды Ваш *Я. Адамовіч.*

## ТЭЛЕГРАМА.

*Минск Всебелорусскому С'езду „Молодняка"*

Бюро национальных секций Московской Ассоциации Пролетарских писателей, об'единяющее 17 национальных организаций, шлет горячий коммунистический привет братскому С'езду пролетарских писателей Белоруссии. Дорогие товарищи, мы твердо надеемся, что Ваш С'езд заложит правильную твердую основу Всебелорусской организации Пролетписателей, которая сплотит вокруг себя писателей. Нацмен будет руководить братской крестьянской литературой.

Мы отмечаем большой пробел Всесоюзной Ассоциации Пролетписателей—отсутствием „Молодняка". Выражаем горячее пожелание С'езду присоединиться к единственному центру литератур народов СССР—Всесоюзной Ассоциации Пролетарских Писателей.

Белоруссия должна быть с нами.

От имени армян—*Айкуыл,* киргиз—*Байдилдин,* татар—*Максудов,* мордвы—*Глухов,* чувашей—*Васьнянка,* мари—*Кузнецов,* воцяков—*Пель,* зырян—*Лыткин,* якут—*Кюнде,* евреев—*Рабин,* латышей—*Клусаис,* литовцев—*Жалнонис,* немцев—*Бартельс,* венгерцев—*Белайлеш,* болгар—*Бокалов,* французов—*Лякост,* Югославии—*Дмитрова.*

*Менск з Масквы*

Вас стварыла революцыя. Творчасьць рабочых і сялян Беларусі адбілася ў Вашым аб'яднаньні. Будуйце новую культуру, узмацняйце шэрагі пролетарскае інтэлігенцыі. Сьцяг Кастрычніка няхай заўсёды вітае над Вамі.

*Адамовіч, Баліцкі, Карп, Паўлюкевіч, Браўковіч, Пяцюкевіч.*

## ПАСТАНОВА.

Заслухаўшы даклад настаўніка Шашкоўскага аб Зьезьдзе беларускіх пісьменьнікаў і поэтаў „Маладняка", пашыраны пленум Пустынскага с-с. Сеньненскага раёну супольна з партыйнымі, комсамольскімі, піонэрскімі організацыямі, настаўніцтвам, іншымі організацыямі шчыра вітае Ўсебеларускі Зьезд „Маладняка" і жадае карыснай пасьпяховай працы.

Няхай жыве беларуская культура!

Па даручэньні *Шашкоўскі.*

7-XI-25 г.

## ВЫПІСКА

з протоколу № 5 агульнага сходу сяброў Савінічскай ячэйкі ЛКСМБ супольна з беспартыйнай моладзьдзю.

ПРЫСУТНІЧАЛА: сяброў ячэйкі 16 і беспартыйнай моладзі 22.

Слухалі:

I. Аб „Маладняку" (т. Кухальская).

Тав. Кухальская зазначае а зараджэньні і значэньні Аб'яднаньня „Маладняк", а таксама падкрэсьліла розьніцу між пісьменьнікамі маладнякоўцамі і пісьменьнікамі старэйшага пакаленьня.

Ухвалілі:

„Заслухаўшы інформацыйны даклад настаўніцы Кухальскай аб „Маладняку", азначаем, што песьні „Маладняка" зьяўляюцца нашымі песьнямі і што з дрэнным жыцьцём трэба змагацца, а не жальбаваць.

Дык зварухні-ж ты, „Маладняк“, нашу цемру векавечную, каб усе сяляне, а ня толькі перадавая частка—комсамолія, моцна на ўвесь сьвет загукалі: Няхай жыве савецкая ўлада, няхай жыве тварэц лепшай будучыны „Маладняк“.

Старшыня сходу *Я. Латышоў.*
Сакратар *З. Латышоў.*

## ПРЫВІТАНЬНЕ.

*Г. Менск. Усебеларускаму Зьезду Поэтаў і Пісьменьнікаў „Маладняк“.*

Мы, моладзь вёскі Глебаўск, шлем сваё сардэчнае прывітаньне Ўсебеларускаму Зьезду маладых пісьменьнікаў і жадаем самай станоўчай працы.

Няхай гэты Зьезд будзе новай эрай міжнароднага яднаньня пролетарыяту.

Старшыня агульнага сходу моладзі *Васілеўскі.*
Сакратар *Берговін.*

11 лістапада 1925 г.

## ТЭЛЕГРАМА.

Гарывецкі гурток беларусазнаўства супольна з сялянамі вёскі Гарывец вітае Першы Зьезд Поэтаў і Пісьменьнікаў „Маладняка“ жадае ад шчырага сэрца посьпеху ў працы, якая йдзе на карысьць усёй працоўнай грамады Беларусі.

Няхай жыве працоўная Беларусь!

Няхай жыве магутны „Маладняк“!

*Кіраўнік гуртка.*

## ПРЫВІТАНЬНІ.

Агульны сход сялян вёскі Большы-Азярэцк, даведаўшыся аб тым, што ў Менску адбываецца Зьезд Усебеларускага Аб‘яднаньня Поэтаў і Пісьменьнікаў „Маладняк“, шле шчырае прывітаньне і жадае „Маладняку“ пладавітай працы па адраджэньні беларускай нацыянальнай культуры.

*Упоўнаважны ад сходу М. А. К. В. Р.*

Агульны сход Сеньненскай Гор‘ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМБ паліт-асьветнікаў і настаўнікаў Сеньненскага раёну Віцебскай акругі шчыра вітае Першы Ўсебеларускі Зьезд „Маладняка“, творчасьць якога зьяўляецца магутным сродкам падняцьця культурнага ўзроўня краіны і пашырэньня марксыцкага сьветапогляду сярод шырокіх колаў насяленьня.

Няхай жыве беларуская пролетарская культура!

Старшыня сходу *Котаў.*

*Віцебск.*

Мы, вучні 4-ай сямігадовай школы, сабраўшыся дзеля адсьвяткаваньня 8-мі гадовай Кастрычнікавай рэволюцыі, заслухаўшы даклад аб задачах „Маладняка“, шчыра вітаем Ўсебеларускі Зьезд „Маладняка“ і абяцаемся, па магчымасьці, праводзіць у жыцьцё яго ідэі, выдзеліўшы для гэтай справы лепшых вучняў у літаратурную сэкцыю, якая ўтвараецца пры нашай сямігодцы.

*Прэзыдыум.*

## ТЭЛЕГРАМА.

Віцебскае Таварыства Краязнаўства шчыра вітае Першы Усебеларускі Зьезд „Маладняка“—чырвоную зьмену ва ўсіх галінах мастацтва.

Няхай жыве беларуская пролетарская культура!

Няхай жыве „Маладняк“!

*Прэзыдыум.*

## ПРЫВІТАНЬНЕ.

Мы, вучні Сураскае сямігодкі, комсамольцы і беспартыйная моладзь г. Суража шлем шчырае прывітаньне Ўсебеларускаму Зьезду „Маладняка“ і жадаем посьпеху ў карыснай працы, каб вынікі яе зялёнай руньню закрасавалі на гонях беларускага культурнага поля, глыбока ўзворанага плугам Кастрычніка.

Няхай жыве, квітнее й шырыцца Ўсебеларускі Пролетарскі „Маладняк“!

15-11-26 г.

# Адчыненьне зьезду 25 лістапада.

## I. Адчыненьне зьезду.

1-шы Ўсебеларускі Зьезд поэтаў і пісьменьнікаў „Маладняка“ адчыніўся 25 лістапада 1925 г. а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Беларускага Дзяржаўнага Акадэмічнага Тэатру.

Зьезд адчыніўся прамовай Міхася Чарота.

**Міхась Чарот.**

Усяго на зьезд дэлегатаў зьявілася 60. Ня прыбылі дэлегаты ад другіх Саюзных Рэспублік. Такім чынам, зьезд можна лічыць правамоцным. І вось, ад імя Цэнтральнага Бюро, Першы Зьезд Усебеларускага Аб'яднаньня Поэтаў і Пісьменьнікаў лічу адчыненым.

Т. т.! Сеньнешні дзень, бязумоўна, ёсьць гістарычны дзень для Беларусі. Сёньня адчыняецца першы Зьезд першага Аб'яднаньня беларускіх поэтаў і пісьменьнікаў. На працягу ўсёй гісторыі беларускай культуры мы ня бачылі ніводнага такога моцнага аб'яднаньня літаратурных сіл. Мінулае ў жыцьці Беларусі не давала магчымасьці ня толькі што аб'яднацца, але не давала магчымасьці вольна ўжываць беларускае слова, вольна друкаваць яго, вольна праяўляць свае творчыя сілы. Т. т., мне ня хочацца гаварыць аб усіх цёмных старонках беларускай гісторыі; яны ўсім вядомы, аб гэтым у нас шмат гаварылася. Мне хочацца толькі сказаць, што ў тыя мінулыя часы, калі Беларусь перажывала соцыяльнае і нацыянальнае прыгнечаньне, бязумоўна, ня было магчымасьці ня толькі што мець організацыю, але нават вольна гаварыць і бачыць друкаванае слова. Тыя ўлады, якія заўсёды прыгняталі беларусаў, забаранялі ўжываць беларускае слова. Чаму яны яго баяліся? Яны баяліся яго, але ўсё-ж такі мы бачым такія моманты, калі тыя-ж улады, якія не давалі вольна гаварыць на беларускай мове беларускаму рабочаму і селяніну, у некаторыя моманты самі гаварылі на гэтай мове. Вось, напр., калі мы возьмем тую гісторыю паўстаньня 1863 г., героем якога быў Кастусь Каліноўскі, мы бачым, што ў гэты час зьяўляецца друкаванае беларускае слова, і мы сёньня чытаем зварот Каліноўскага на беларускай мове. І ня толькі гэта было ў 63 годзе, гэта было ў другія моманты, калі буржуазія і панская шляхта хацела скарыстаць беларускага селяніна і рабочага, як рэальную сілу для сваіх інтарэсаў. Яны разумелі, што беларуская мова і, асабліва, беларуская мастацкая мова—гэта ёсьць зброя для іх барацьбы. Але яны не давалі ўжываць яе ў тыя моманты, калі гэтае мастацкае слова і наогул беларускае слова магло будзіць Беларусь, уздымаць яе творчы дух. І толькі вялікая Кастрычнікавая рэволюцыя, якая помніцца многім з прысутных маладнякоўцаў, якія самі былі яе ўдзельнікамі, яна дала магчымасьць сьмела загаварыць на беларускай мове, ня толькі загаварыць, але сьмела ўжываць яе, як зброю клясавай барацьбы. Тое, што сёньня мы маем такую моцную організацыю беларускіх культурных сіл, як „Маладняк“, гэта ёсьць якраз вынік той нацыянальнай політыкі, якую праводзіць увесь час Комуністычная партыя і Савецкая ўлада.

Т. т., „Маладняк“ налічвае 500 з лішкам сяброў маладнякоўскай арміі. Існуе ён толькі 2 гады. І вось, калі мы паглядзім на тую працу, якую зрабіў „Маладняк“, гэтая армія, якая толькі 2 гады існуе, якая пачала існаваньне сваё невялічкай групкай у ліку 7 чал., і паставім перад сабою пытаньне, што яна зрабіла,—то трэба сказаць, што „Маладняк“ за гэтыя цяжкія гады свайго існаваньня, у той пэрыод, калі ўсе сілы і энэргія ішлі на організацыйны бок, ішлі на тыя дэкляацыі, па якіх павінен быў ісьці „Маладняк“, то ўсё-ж такі, ня гледзячы на гэта, зроблена дужа шмат. Зараз існуюць філіі „Маладняка“ па ўсіх акругах, а таксама ёсьць нават філіі і па раёнах. Калі „Маладняк“ організаваўся, у яго ня было яшчэ вялікай арміі. Зараз яна ёсьць, бо сілы, адбуджаныя Кастрычнікавай рэволюцыяй, бязумоўна, перашлі ў тую організацыю, якая сёньня вядзе барацьбу за тыя ідэалы, якія паставіў сабе Кастрычнік. І мы бачым, што пачынаюцца організацыі філій па ўсіх кутках Беларусі. Там організуюцца групы людзей, якія прыходзяць да нас, патрабуюць наш статут, патрабуюць нашу політычную пляцформу, і калі яны знаёмяцца з ёю, то пачынаюць з намі працаваць.

Апрача гэтага, пры філіях у некаторых мясцох пачалі організоўвацца літаратурныя студыі і літаратурныя гурткі. Уся праца вядзецца ўвесь час у вакругах у самых глухіх кутках Беларусі. І ўвесь рост „Маладняка“, які мы сёньня падкрэсьліваем, ёсьць рост рабочых і сялян Беларусі. Ня тое важна, што ў нас вялікая армія, а важна, што ў нас моцная армія.

„Маладняк“ адразу ўхваліў у сваёй програме не формальна мастацкія, не літаратурныя напрамкі, а сьпярша стала вызначыў політычную і ідэолёгічную пляцформу. У гэтым сіла „Маладняка“. Што мы зараз бачым? Мы бачым, што „Маладняк“, як організацыя, ня імкнецца да розных спрэчак, як і якой формаю пісаць. „Маладняк“ кажа і лічыць, што тут, у „Маладняку“, могуць і павінны разьвівацца розныя літаратурна-формальныя напрамкі. „Маладняк“ павінен паставіць сваю працу на тэй політычнай пляцформе і ідэолёгіі, якія закладзены ў аснову програмы „Маладняка“. Наша пляцформа і наша ідэолёгічная лінія—гэта тая, якую вядзе Комуністычная партыя. „Маладняк“ вядзе ўсю працу на аснове пролетарскай ідэолёгіі. Вы ведаеце, што „Маладняк“ не організаваў пролетарскіх пісьменьнікаў, якія вышлі з шэрагаў чыстага пролетарыяту. У нас няма такога пролетарыяту, які-б даў нам пісьменьнікаў. У нас ёсьць рабочыя і сяляне. Гэтая рабоча-сялянская маса й дала нам шэраг пісьменьнікаў, літаратараў і мастакоў, каго „Маладняк“ аб'яднае ў сваёй літаратурнай організацыі. „Маладняк“ кажа, што ён зьяўляецца насіцелем чыста пролетарскай ідэолёгіі і, як вы, організоўвае рабоча-сялянскую армію.

Таварышы, мы ведаем, што на нашых абавязках ляжыць пераламаць дробна-буржуазную сялянскую ідэолёгію і зрабіць пісьменьнікаў насіцелямі ідэолёгіі пролетарскай. У гэтым мы маем вялікія дасягненьні.

Ня гледзячы на тое, што „Маладняк“ патраціў шмат сілы на вырашэньне організацыйнага пытаньня (сувязь з нашымі акруговымі філіямі і інш.), ня гледзячы на гэта—ён не патраціў свае мастацкае каштоўнасьці. Што новага ўнёс „Маладняк“? Той, хто ведае беларускую літаратуру, скажа, што „Маладняк“ сваёй творчасьцю нясе новы этап у разьвіцьці беларускага мастацтва, „Маладняк“, з другога боку, зьяўляецца моцнай мастацкай організацыяй, культурным аб'яднаньнем і вядзе вялікую політасьветную працу і творчую продукцыю. „Маладняк“ многа папрацаваў і над формай, і над тэматыкай, і над рыфмай. Вы ведаеце, што „Маладняк“ зьяўляецца рэволюцыянэрам беларускай

літаратуры—гэта не гаваровыя словы, а гэта можна даказаць творчасьцю „Маладняка". Ён сваёй творчасьцю блізкі да працы сялянскай гушчы. І калі сёньня наш „Маладняк" выступае ў рабочым клюбе ці ў аудыторыі, партыйным ці комсамольскім клюбе, мы бачым, што яго творчасьць зразумела для мас. Ён у сваёй творчасьці зьяўляецца прадстаўніком рабоча-сялянскіх і працоўных мас і, ня гледзячы на яго навізну, ён блізкі да гэтай масы. Аб гэтым гавораць тыя лісты, якія мы атрымліваем ад сялянскіх сходаў, дзе выносяцца рэзолюцыі і гэтак далей. „Маладняк" працуе і вядзе сваю працу, выходзячы з конкрэтных палажэньняў дыктатуры пролетарыяту. „Маладняк" так праводзіць тую лінію і працуе так, як працуе Комуністычная партыя і Комсамол. І толькі дзякуючы таму, што ён мае і будзе мець шчыльную сувязь у сваёй працы з Комуністычнай партыяй і Комсамолам, ён заўсёды будзе зьяўляцца насіцелем чыста пролетарскай ідэолёгіі. І калі яшчэ часам і ёсьць адмоўныя ўхілы, то, дзякуючы кіраўніцтву партыі, яны будуць адкінуты. К гэтаму мы імкнемся.

Перад зьездам „Маладняка" стаіць першае і самае галоўнае пытаньне—гэта прагледзець увесь свой пройдзены шлях, каб ён убачыў, ці зроблена правільна лінія той ідэолёгіі па тым шляху, па якім ішлі, ці ня былі зроблены адступленьні ў той ці іншы бок. У далейшым зьезду трэба праверыць конкрэтна рэзультаты працы „Маладняка" і даць дырэктывы у далейшай рабоце маладых культурных сіл Беларусі. „Маладняк" сьмела кажа, што ён зьяўляецца прадстаўніком новай эпохі ў разьвіцьці беларускай культуры. „Маладняку", акрамя сваёй працы організацыйнай і творчаска-літаратурнай, трэба весьці яшчэ вялікую барацьбу з тэй спадчынай, якая засталася ў Беларусі па гэты дзень. Вы ведаеце, што часта гавораць і адчуваюць ня толькі маладнякоўцы, але і іншыя старыя пісьменьнікі, што „Маладняк" зьяўляецца прадстаўніком новай эпохі ў разьвіцьці беларускай культуры і яму трэба цяпер весьці барацьбу з гэтай старанной літаратуры і яе прадстаўнікамі. У нас, таварышы, няма тэй вострай барацьбы, няма тых рэзкіх разьмежаваньняў у групоўках, якія мы можам сёньня знайсьці хаця-б у расійскай літаратуры. Нашы старыя пісьменьнікі не організаваны. Я казаў раней, „Маладняк"—гэта першая організацыя, а нашы пісьменьнікі—яны заўсёды былі рэволюцыянэрамі сваёй эпохі. І вось „Маладняк" з імі вядзе барацьбу. Чытаючы творчасьць многіх старых пісьменьнікаў, мы бачым, што яна ў свой час была надзвычайна рэволюцыйна, такіх твораў, якіх ня можна знайсьці ні ў расійскай літаратуры, ні ў іншых. І вось сёньня „Маладняк" хоча весьці з імі барацьбу.

„Маладняк", як я казаў ужо раней, мае свой вызначаны політычны твар. Мы ў дэклярацыях і палажэньнях і творчасьці падкрэсьліваем, што мы стаім на політычнай пляцформе Комуністычнай партыі, што мы зьяўляемся насіцелямі пролетарскай ідэолёгіі, і мы клянемся, што будзем насіцелямі гэткай. „Маладняк" і ў культурнай сваёй працы кажа, што ён за Савецкую ўладу, а ня супроць яе, і мне здаецца, што ў сучасны момант інакш быць і ня можа. Ці то будзе грамадзянін звычайны, літаратар, мастак—ён павінен сказаць сьмела з кім ён ідзе, ён павінен паказаць свой політычны твар. „Маладняк" вядзе барацьбу з усякай аполітычнасьцю. „Маладняк" ведае, што літаратура і мастацтва ня можа быць супроць Савецкай улады. Вось гэта мы і сказалі дзеля таго, каб паказаць, што няма часткі мастакоў, „Маладняк" сам гэта кажа і паставіў сваёй задачай зрабіць гэта мастацкае слова зброяй клясавай барацьбы, і мы патрабуем, каб усе культурныя дзеячы сёньня паставілі таксама гэта пытаньне перад сабой. Калі сёньня перад „Маладняком" стане пытаньне—з якімі пісьменьнікамі яму йсьці па адным шляху, дык,

бязумоўна, мы скажам, што нам па шляху з тымі, якія зьяўляюцца насіцелямі пролетарскай ідэолёгіі. Бязумоўна, „Маладняк“ кажа, што ён ня хоча быць камандырам беларускай культуры, не,—толькі барацьбітом за беларускую культуру, якая павінна быць рабоча-сялянскай.

Я раней ужо казаў, што „Маладняку“ трэба будзе весьці вялікую організацыйную працу дзеля таго, каб ён стаў вялікай арміяй, дзеля таго, каб ён стаў буйным аб'яднаньнем, дзеля таго, каб мець сілы весьці барацьбу, якая перад ім стаіць. І гэта аб'яднаньне павінна паставіць перад сабой усе задачы, якія ставяць і іншыя пролетарскія організацыі,—быць барацьбітом за адзіны фронт пролетарскай культуры. Наша апошняя інстанцыя, наша мэта, якую мы сабе ставім, гэта дайсьці да тэй культуры, якую можна будзе назваць агульна-пролетарскай.

Канчаючы сваё слова, я хочу сказаць: няхай жывуць пролетарскія поэты-пісьменьнікі, сьмелыя, адважныя барацьбіты на культурным фронце; няхай жыве і мацнее пролетарская культура ўсяго сьвету! Маладнякоўцы, вы армія рабочых і сялян, сьмела ідзеце ў бой за тую вялікую будучыну, за тую будучыну, калі будзе панаваць адна культура, культура комуністычная. *(Апладысмэнты).*

Цяпер нам трэба абраць прэзыдыум зьезду, сакратарыят і мандатную камісію. Слова для прапановы ад імя кіраўнікоў філій „Маладняка“ мае тав. Шукайла.

Тав. Шукайла: Ад імя кіраўнікоў філій „Маладняка“ прапануецца наступны сьпіс.

**У прэзыдыум:**

Чарот Міхась (ЦБ).
Вольны Анатолі (ЦБ).
Бабарэка Адам (ЦБ).
Александровіч Андрэй (ЦБ).
Дубоўка Ўладзімер (ЦБ).
Грашчэнка (ад Гомельскай філіі).
Гадзінскі (ад Украінскай дэлегацыі).
Шукайла Паўлюк (ад Слуцкай філіі).
Валяйціс (ад дэлегацыі ВАПП'а).
Гэсен (ад ЦК КПБ).
Самахвалаў Алесь (ад ЦК ЛКСМБ).
Лакціонаў (ад Чырвонай арміі).
Чарвякоў Алесь.
Адамовіч Язэп.
Ігнатоўскі Ўсевалад.
Крыніцкі А.
(Ганаровымі сябрамі прэзыдыуму).

**У сакратарыят:**

Барашка Гіляры.
Трус Паўлюк.
Якімовіч Алесь.
Падабед Язэп.

**У мандатную камісію:**

Пушча Язэп.
Крапіва Кандрат.
Чалядзінскі Сямён.

Старшыня: Ці маюцца другія сьпісы? *(Няма).*

Ці маюцца папраўкі ў сьпісе? *(Няма).*

Дазвольце сьпіс лічыць прынятым. Абраных просьба заняць месца ў прэзыдыуме *(Туш. Воплескі).*

Старшыня: Унечарговае слова мае т. Анатоль Вольны.

Тав. Вольны: Дазвольце ўнесьці прапанову аб абраньні ганаровым сябрам зьезду і прэзыдыуму нашага народнага поэту Янку Купалу. *(Воплескі. Туш).*

(Згодна прапановы з месцаў абіраецца ў склад прэзыдыуму таксама т. Алесь Адамовіч).

Старшыня: Для прывітаньня зьезду ад ЦК Ком. Партыі Беларусі мае слова т. Гэсен. *(Воплескі).*

Тав. Гэсен: Наша партыя лічыць сёньнешні зьезд адным з буйнейшых сьведкаваньняў у жыцьці працоўных Савецкай Беларусі. На тэй глебе, якая была створана грамадзянскай вайной, на тэй глебе, якая была заваёвана жорсткай і ўпартай барацьбой працоўных, на тэй глебе ўзрос малады, поўны моцы, багаты краскамі—літаратурны рух беларускай рабочай і сялянскай моладзі. Гэты малады рух узрастае з агромністай хуткасьцю. Тыя нямногія лічбы, якія былі тут агалошаны т. Чаротам, які адчыніў зьезд, паказваюць, якім хуткім тэмпам расьце, на аснове рэволюцыйных заваёў, гэты малады рэволюцыйны рух літаратуры. Мы ведаем, што ён покуль што яшчэ стаіць толькі на самых першых кроках свайго шляху, што тыя некалькі соцень маладых працаўнікоў, якія аб'яднаны ў шэрагах маладнякоўскай організацыі, зьяўляюцца толькі першым атрадам, які ступіў на гэты шлях, што „Маладняку" належыць, як ідэйна-літаратурнаму напрамку, як новай літаратуры, якая падымаецца з народных нізоў, аграмаднае і найшырэйшае будучае. Вітаючы тыя посьпехі, якія „Маладняк" мае зараз, і прадбачачы тыя дасягненьні, якія „Маладняк" абяцае ў блізкім будучым, наша партыя, разам з тым, аддае сабе сталую справаздачу ў тым, што сёньнешні зьезд і сёньнешнія посьпехі маладнякоўскага руху яшчэ раз падкрэсьліваюць правільнасьць асноўных ідэй нашай партыі, асноўных ідэй, пакінутых нам Леніным. Аднэй з гэтых ідэй зьяўляецца ідэя саюзу рабочае клясы і сялянства пад кіраўніцтвам рабочае клясы, як больш сьвядомае і перадавое. Маладнякоўская організацыя поэтаў і пісьменьнікаў зьяўляецца жывым прыкладам, жывой ілюстрацыяй гэтага саюзу рабочых і сялян, ідэйнай гегемоніяй пролетарыяту.

Чым зьяўляецца „Маладняк" па сваім соцыяльным складзе? Гэта організацыя, якая вышла з сялянства і расьце на вясковых каранёх. Чым зьяўляецца „Маладняк" па сваёй ідэолёгіі альбо, як правільна было зазначана, да чаго ён ідзе па сваёй ідэолёгіі? „Маладняк" па сваёй ідэолёгіі ідзе да сусьветнага разуменьня поглядаў рабочае клясы—вызваленца, правадыра працоўных мас усяго сьвету.

І гэты ідэёвы напрамак „Маладняка", які каранямі ўрос у вёску, а верхавінай даходзіць да пролетарскае клясавае сьвядомасьці, гэты напрамак маладнякоўскай працы ёсьць абразок таго, якім павінен быць саюз рабочае клясы і сялянства. Гэта не формальны дагавор, а баявы саюз, дзе перадавая кляса перадае свае думкі, сваю ідэолёгію, сваё кіраўніцтва клясе менш перадавой, больш адсталай, але клясе, якая павінна падняцца на належны стопень. Вось гэты маладнякоўскі рух ёсьць для нас, для Компартыі жывая і конкрэтная ілюстрацыя таго, якім павінен быць у жыцьці магутны, баявы саюз рабочае клясы і сялянства. І маладнякоўскі рух зьяўляецца для нас новым падцьвярджэньнем у правільнасьці нашай нацыянальнай політыкі.

У процілегласьць політыцы задушэньня слабых нацый, у процілегласьць політыцы русыфікацыі, полёнізацыі і г. д., якая праводзіцца буржуазнымі ўладамі і капіталістычнымі сіламі, Кастрычнікавая рэволюцыя, якая палажыла ў аснову сваёй дзейнасьці програму нашай партыі, правазьвясьціла права кожнай нацыі азначаць свой лёс самой і будаваць сваё культурнае жыцьцё на тэй мове, на якой гавораць самыя шырокія працоўныя масы. І калі мы бачым хуткі росквіт беларускай культуры, калі мы бачым, як за два гады, чуць толькі скончылася грамадзянская вайна і прашлі самыя цяжкія гады гаспадарчага распаду і голаду, пачынаюць падымацца цэлымі шэрагамі новыя літаратурныя сілы на новай, у літаратурным сэнсе, мове. Калі мы бачым гэты хуткі росквіт тэй нацыянальнай культуры, якая была задушана, перамолата жорнамі з двух бакоў—між молатам і кавадлам, між полёнізацыяй і русыфікацыяй, калі мы бачым хуткі росквіт культуры на тэй мове, само існаваньне якое нядаўна ды падчас яшчэ й цяпер лічаць спрэчным некаторыя вялікадзяржаўныя шовіністыя, калі мы бачым гэты хуткі росквіт беларускай культуры на беларускай мове, то мы павінны сказаць сабе, што правільна тая політыка, якую наша партыя праводзіць. Даць працоўным кожнай нацыі магчымасьць разьвіваць сваю культуру на роднай мове, культуру нацыянальную па форме, хоць яна й мае агульны ідэйны пролетарскі сэнс; гэты шлях дае магчымасьць працоўным найбольш кароткім шляхам, найбольш простым і з найменшымі перашкодамі падняцца на самы высокі культурны ўзровень. І тое, што сёньнешні маладнякоўскі зьезд адзначае тыя посьпехі і падлічвае тыя дасягненьні—гэта зьяўляецца для нашай партыі довадам правільнасьці яе нацыянальнай політыкі. Наша партыя з гонарам глядзіць на посьпехі „Маладняка“. Яна ведае, што ўвесь „Маладняк“ ёсьць „плоть от плоти, кость от кости“ Кастрычнікавай рэволюцыі. Мы бачым, што яны сталі з намі плячом да пляча. Мы ведаем, якія вялікія яго дасягненьні, мы ведаем, як прыгожы тыя заваёвы, якія зроблены „Маладняком“, і мы ведаем, што гэты шлях яшчэ больш вялікі па зьмесьце сваіх ідэй у літаратуры працоўных кляс. Мы ведаем, што „Маладняку“ патрэбна шмат і шмат вучыцца, каб поўнасьцю выканаць сваю шырокую програму. Калі на сьцягу „Маладняка“ напісана „Ленінізм, Марксызм“, дык гэты сьцяг гаворыць за тое, што „Маладняк“ павінен шмат вучыцца, каб да канца быць сапраўдным маладнякоўцам, каб стаць сапраўдным бальшавіком. Тыя дасягненьні, якія ўжо заваёваны, даюць упэўненасьць, што „Маладняк“ поўнасьцю апраўдае словы, напісаныя на сьцягу, што гэта будзе такая масавая організацыя рэволюцыйных пісьменьнікаў, якая будзе ўцехай і гонарам для працоўных мас Беларусі.

Маркс пісаў аб першых творах пролетарскага пісьменьніка Вэйта, што гэта дзіцячыя чаравічкі пролетарыяту, але як яны магутныя ў параўнаньні з атоптанымі ботамі буржуазіі. І калі мы глядзім на „Маладняк“, на літаратуру маладую, якая стала пад сьцяг рабочае клясы і маладую нацыю, пішучую на маладой мове (у літаратурным сэнсе), калі мы бачым яе шпаркія посьпехі, дык можна сказаць, што дзіцячыя чаравічкі беларускай літаратуры магутны ў параўнаньні з атоптанымі ботамі кволай літаратуры Заходняй Эўропы. І ў сьвядомасьці таго, якія вялікія заданьні і якое будучае адчыняецца перад гэтай маладой сілай, дазвольце вітаць Першы Зьезд „Маладняка“, ад імя Комуністычнай Партыі бальшавікоў Беларусі. Няхай жыве Вольная Савецкая Соцыялістычная Рэспубліка, якая з працоўнымі ўсіх краёў пойдзе да поўнае перамогі комунізму.

Старшыня: Для прывітаньня ад імя Комсамолу мае слова т. Самахвалаў.

Тав. Самахвалаў: Дарагія таварышы! дазвольце вас вітаць ад імя ЦК ЛКСМБ. Мы гэтым самым перабіраем у памяці тыя гады, калі пад крылом КСМ два гады таму назад выступіў першы організатар маладнякоўскай арміі. „Маладняк" вырас на комсамольскіх загонах, як сіла, якая выступае ў барацьбу за комунізм. Так яно і ёсьць па сутнасьці. Паколькі т.т. комсамольцы, якія працуюць у „Маладняку", з першага дня заснаваньня організацыі сказалі ясна, што яны ўступаюць у барацьбу за комунізм, яны гэтым самым стварылі сабе ня толькі культурную, але і палітычную сілу.

За два гады мы маем вялікія дасягненьні. Зьезд гэта падагуліць і запіша. І ўсё-ж такі, будучая праца павялічвае нашы цяжкасьці і робіць далейшы шлях больш складаным. „Маладняк" ня толькі культурная, але і палітычная організацыя. І калі гэта так, дык перш за ўсё, першая думка ЦК ЛКСМ, каб поўнасьцю заўладаць зброяй у гэтай працы. Ленінская тэорыя вучобы, якая бывае ў комсамоле, павінна прайсьці праз шэрагі маладнякоўскай організацыі. Ленінскую вучобу мы не ўяўляем як палітычную, але й як практычную працу. Сягоньня, таварышы, калі мы пераживаем вялікі паварот у працы на вёсцы і экономічны рост, калі мы маем дасягненьні ў комуністычным будаўніцтве, мы павінны ведаць, што гэтыя дасягненьні нясуць вялікую перашкоду, якую будзе адчуваць дробная буржуазія. Мы будзем адчуваць напор і нам патрэбна проціпаставіць іх сабе. Тут, таварышы, паўстае пытаньне—барацьба з нацыяналізмам-шовінізмам. Ці можа „Маладняк" любіць беларускага рабочага, як свой родны край, ці можа любіць беларускую нацыю і з любоўю адносіцца да беларускага народу—гэта магчыма. Мы любім беларускую мову, мы любім мову за тое, што на ёй гаворыць рабочы, мы любім той народ, які змог дайсьці да Кастрычніка, мы любім свой край, мы ганарымся тым, што мы жывём у Беларускім краі. Мы любім сваё мінулае за тое, што яно дало нам такую асобу, як Кастусь Каліноўскі. Мы ганарымся тым, што тут на большай частцы на стыку дзьвёх культур, пролетарскай і капіталістычнай ствараем новую культуру з другою нацыяй, якая жыве ў Беларусі. Мы ганарымся тым, што разам з другімі нацыямі будуем гэту культуру, дзе ня будзе эксплёатацыі. Вось наш гонар, гонар тых, хто любіць свой край, тую культуру, якая ў ім маецца.

З усёй агідаю мы адкідаем усё тое, што замінае выконваць нашы мэты. Да гэтага йдуць нашы комсамольцы і нашы маладнякоўцы. Наш шлях вельмі цяжкі, у далейшым ён будзе яшчэ цяжэйшымі, але й дасягненьні ў нас вялікія, мы можам імі пахваліцца. Але адначасова нам трэба быць сапраўднымі ленінцамі, нам трэба змагацца за тыя дасягненьні, якія мы маем, змагацца за тыя пэрспэктывы, якія перад намі адчыняюцца, не забываць тых цяжкасьцяй, якія перад намі стаяць, не забываць тых памылак, якія мы можам зрабіць. Трэба праверыць усю сваю праробленую працу і не забываць аб тых цяжкасьцях, якія могуць на нашым шляху стаяць—гэта адзін з выразаў Леніна, і мы павінны гэта памятаць.

Два гады за намі пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам рабоча-сялянскіх мас; за намі моладзь, за намі сталыя організацыі. На новы шлях, сьмела наперад маладнякоўскімі крокамі!

Старшыня: Для прывітаньня ад імя Беларускага ўраду слова мае тав. Чарнушэвіч.

Тав. Чарнушэвіч (ЦВК БССР): Таварышы, больш чым два гады таму назад мінула з таго часу, калі я працаваў у Ігумені. Малад-

някоўцы тады яшчэ толькі з'арганізаваліся, прыяжджалі да нас у Чэрвень дзеля таго, каб азнаёміць нас з тымі мэтамі, якія стаялі перад імі. Мы сабраліся тады ў сваім клюбе ў доме селяніна, куды прышлі рабочыя і сяляне. І вось тады яны рабілі даклады свае на беларускай мове, перад рабочымі і сялянамі, якія прысутнічалі тут і першы раз пачулі сваю мову з вуснаў маладнякоўцаў. Гэта, таварышы, паказвае, што з самага пачатку заданьні і мэты „Маладняка“ былі досыць правільнымі, яны знашлі водгук у самай гушчы рабоча-сялянскіх мас, заваявалі давер'е сярод рабочых і сялянскіх мас Беларусі. З кожным месяцам і годам маладняцкія сілы расьлі і мацнелі, расьлі колькасна. Мы бачым, што гэта моцная арганізацыя мае больш за 500 сяброў, якія працуюць над беларускай літаратурай і мастацтвам, дзеля таго, каб зблізіць працаўнікоў Беларусі, з гэтай вялікай культурай, з ідэолёгіяй пролетарыяту. Гэтае першае беларускае аб'яднаньне дае магчымасьць і Компартыі, і Савецкай уладзе праз творы „Маладняка“ прыблізіць працоўныя масы да культуры. Мы маем надзею, што больш таго, аб чым гаварыў тав. Чарот, таго ўціску, які перанесла Беларусь у часы царызму, уціску, зьдзекаў у Беларусі ня будзе, што далей Беларусь—Савецкая дзяржава—будзе расквітаць прыгожым роcквітам, што да яе далучыцца тая частка, якая цяпер яшчэ ня ў нас.

Будзем мець надзею, што „Маладняк“ у гэтай працы прыме вялікі ўдзел, што ён вырасьце ў такую магутную сілу, якая ажыцьцёвіць наказы Леніна аб тым, што і апошняя кухарка можа кіраваць дзяржавай.

Няхай жыве моцны „Маладняк“!

Няхай жыве пролетарская культура, поэзія і літаратура на Беларусі!

Старшыня: Ад Чырвонай арміі слова для прывітаньня мае камандыр 2-й Беларускай дывізіі тав. Лакціёнаў.

Тов. Лакціёнаў: Дазвольце мне, таварышы, перадаць гарачае прывітаньне першаму зьезду беларускіх маладых пісьменьнікаў ад чырвонаармейцаў, камандыраў і політпрацаўнікоў 2-й Беларускай дывізіі. Таварышы, другая Беларуская дывізія мае свае асаблівасьці ў параўнаньні з тымі вайсковымі часьцямі, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі. Гэтыя асаблівасьці заключаюцца ў тым, што яна зьяўляецца ня толькі Беларускай дывізіяй, але і нацыянальнай дывізіяй, што яна ў сваіх шэрагах мае 50 проц. каманднага і політычнага складу беларусаў і звыш 90 проц. беларусаў чырвонаармейскага складу, што ў яе склад уліліся вялікія масы беларускага маладняка.

Калі мы хочам утварыць культурны быт нашых часьцей, то мы сустракаемся з гэткімі недахопамі, у якіх мы самі, камандыры і політпрацаўнікі, без пашыраных маладых культурных сіл у васобе маладнякоўцаў не ў састаяньні разрашыць. Гэта сувязь у сучасны момант ужо выяўляецца ў тым, што маладнякоўцы прынялі культурнае шэфства над 6-м палком, які стаіць у Менску, і гэта шэфства забясьпечыць утварэньне гэтага культурнага быту. Мы маем недахоп у тым, што ў нас няма хрэстоматый, у нас няма значнага ліку, патрэбнай для Чырвонай арміі, літаратуры, той літаратуры, якая ажыцьцяўляла-б у штодзеннай працы нашага чырвонаармейца. Нам патрэбна добрая бадзёрая песьня, якая-б заклікала чырвонаармейца да яго будучых пабед. Нам патрэбны апавяданьні і ў гэтым пытаньні вялікая патрэба.

Ад імя 2-й Беларускай дывізіі выказваю ўпэўненасьць, што тая сувязь, якая фактычна ажыцьцяўляецца паміж дывізіяй і маладнякоўцамі будзе моцная і дасьць магчымасьць вырашыць бытавыя і культурныя пытаньні, якія яшчэ так востра стаяць перад дывізіяй.

Дазвольце, таварышы, пажадаць маладым культурным сілам поэтау і пісьменьнікаў Беларусі далейшага разьвіцьця беларускай культуры і далейшых посьпехаў у іх працы.

Няхай жывуць маладыя беларускія поэты і пісьменьнікі! Няхай жыве беларуская культура! Няхай жыве Савецкая Беларусь! *(Аплёдысмэнты, беларуская марсэльеза).*

Старшыня дае слова прадстаўніку украінскіх пролетарскіх пісьменьнікаў тав. Гадзінскаму, якому зьезд утварае овацыю.

Тав. Гадзінскі *(паукраінску)*: Беларуская рэволюцыйная літаратура і ўкраінская рэволюцыйная літаратура радзіліся ў часы Чырвонага Кастрычніка. Таму мы з вамі браты. Прыехаўшы вас вітаць і ўдзельнічаць у вашым першым зьезде заўважаем, што ён няпоўны. Будзе ён поўны тады, калі з вамі будуць вашыя браты з-за кордону, якія яшчэ дагэтуль знаходзяцца ў капцюрох белапольскага арла. *(Воплескі).*

Цэнтральны камітэт украінскіх пролетарскіх пісьменьнікаў у РСФСР „Сіло і Місто“ даручыў мне вітаць вас гэтым лістом *(зачытвае прывітальны ліст. Гл. дадатак).*

Тав. Каранеўскі: Сёньня Народны Камісарыят Асьветы з радасьцю вітае І-ы Усебеларускі Зьезд „Маладняка“. Ня гледзячы на тое, што „Маладняк“ у сваім жыцьці мае толькі два гады працы, яго культурна-асьветная праца надзвычайна вялікая. Цяпер вы ня ўбачыце ні аднэй газэты, часопісі, хрэстоматыі, дзе-б ня было процантаў на 75 матэрыялаў маладнякоўскай працы. І трэба сказаць, што самая ўдалая па сваім зьмесьце, па сваёй ідэолёгіі, дынаміцы, гэта ёсьць тая частка нашай літаратуры, якую дае „Маладняк“. Справа ў тым, што мы ў сваіх культурна-асьветных установах, асабліва ў той частцы, якая выкоўвае моладзь, павінны выкаваць добрых рэволюцыянэраў. Такі матэрыял дзеля выкоўваньня моладзі і дае маладняцкае аб'яднаньне. Там вы адчуваеце і калёсы фабрыкі, і рух рэмня, і бадзёры размах касца, і песьню жнейкі, і па такіх бадзёрых вясёлых настроях нам і трэба выхоўваць нашу моладзь. Усё тое жывое творчаска-новае, што нясе з сабой моладзь,—гэта групуецца каля „Маладняка“ і цяпер у аб'яднаньні „Маладняк“ ідуць з вялікай ахвотай.

Пажадаем, каб „Маладняк“ пашырыў сваю працу ў бліжэйшыя гады намнога больш, чым цяпер. Пажадаем, каб экономічная база дала больш мажлівасьці атрымаць тое неабходнае, тую творчасьць на якой будзе выхоўвацца наша моладзь, якая будзе адбудоўваць новую Савецкую Чырвоную Беларусь, якую яшчэ ня поўнасьцю маем. Заходняя Беларусь з вялікім здаваленьнем глядзіць на працу „Маладняка“ і зачытваецца тэй літаратурай, якую дае „Маладняк“.

Няхай жыве аб'яднаньне „Маладняк“, няхай у лепшых абставінах творыць сваю працу па ажыўленьні беларускай літаратуры.

Старшыня: Ад Інбелкульту вітае тав. Смоліч.

Тав. Смоліч: Я маю гонар, таварышы, вітаць ад Інбелкульту вас, прадстаўнікоў новых радоў беларускіх культурных працаўнікоў, новых поўных энэргіі тварцоў на ніве беларускай культуры. Пакаленьне ваша, таварышы, цяпер усходзіць на гістарычную арэну Беларусі. Вы, таварышы, па Інстытуту Беларускай Культуры бязумоўна дасьцё шмат больш, чым змаглі даць ранейшыя пакаленьні.

Ранейшым пакаленьням трэба было весьці барацьбу ў агні рэволюцый 1905—17 г.г. Трэба было весьці барацьбу ў царскіх астрогах, польскіх астрогах за тое, каб беларускі народ меў мажлівасьць распачаць творчую працу.

Калі кастрычнікавая рэволюцыя адчыніла беларускаму народу мажлівасьць гэтай творчай працы, дык цяпер з самых гушчаў народу сталі вы, таварышы маладнякоўцы, вы, дзеці Кастрычніка, дзеці беларускага народу, каб замацаваць гэтую справу, якая была на працягу дзесяткаў, соцен год. І цяпер у вашых шэрагах няможна не пранікнуцца вялікай надзеяй і вялікай радасьцю аб тым, што цяпер беларускаму народу няма чаго баяцца за свою культурную будучыну, за мажлівасьць свайго далейшага жыцьця.

У вашых руках цяпер яшчэ маладая, але ўжо моцная па сваёй шчыльнай сувязі стыхія Беларусі, бязумоўна, ваша творчасьць дасьць лепшую культуру, якая праславіць ня толькі Беларусь, але і яе пісьменьнікаў.

Ваш зьезд, які падводзе вынікі вашай працы, паложыць фундамант для далейшага разьвіцьця організацыі пролетарскіх і сялянскіх пісьменьнікаў. Ён будзе значным этапам на шляху разьвіцьця ўсёй беларускай культуры і працаўнікам Інбелкульту хутка падрыхтуецца зьмена ня толькі ў галіне культуры і мастацтва, але таксама і ў галіне навукі і ўсяго грамадзкага жыцьця.

Вы працуеце дзеля таго народу, які толькі цяпер распачаў будаваць сваё жацьцё. Ваша організацыйнасьць і вашы маладыя сілы дадуць беларускаму народу, беларускай культуры вялікае разьвіцьцё, якога не маглі дабіцца да гэтых часоў.

Профэсар П я т у х о в і ч: Ад імя літаратурнай сэкцыі Інбелкульту, як прадстаўнік катэдры беларускай літаратуры ў нашым Дзяржаўным Унівэрсытэце я вітаю Ўсебеларускі зьезд „Маладняка“, як новага вартаўніка, новай рэволюцыйнай сілы ў беларускай літаратуры. Усяго два гады таму назад на літаратурным беларускім краявідзе „Маладняк“ прадстаўляў сабой толькі нязначны пункт, які за гэты час пераўтварыўся ўжо ў узор. Гэты буйны рост організацыі „Маладняка“ зьяўляецца вынікам рэволюцыі. Эпоха рэволюцыі, кажа адзін социолёг гэтае эпохі, штурм унд дранг пэрыоду.

З гэтым становішчам социолёга нам трэба згадзіцца. Ва ўсіх эпохах ёсьць проціваледласьці, але ў эпоху комуністычную яны набываюць асаблівую астрату. У эпоху, калі барацьба паміж старым і маладым пакаленьнямі выяўляецца ва ўвесь рост. Тут можна прывесьці шмат ілюстрацый гэтаму становішчу. На памяць мне прыходзіць адна паралель: у канцы XVIII стагодзьдзя быў вялікі крызыс пераходу ад навуковых формаў да новых формаў буржуазнай экономікі. І мы бачым, што на аснове гэтага ў Нямеччыне сярод моладзі таго часу паяўляецца новы літаратурны напрамак. Бюргерская моладзь таго часу з усім запалам занялася разрушэньнем цьвярдыні мяшчанства. Цяпер мы перажываем таксама, можа быць яшчэ больш крытычную эпоху, мы перажываем эпоху пераходу ад капіталістычных формаў да новых социяльных формаў гаспадаркі, і мы бачым, што наша моладзь нападае на цьвярдыні капіталізму пад напорам Вялікага Кастрычніка.

У Беларусі маецца такое аб'яднаньне „Маладняка“, сапраўды тут ёсьць значная розьніца паміж тым напрамкам: там мы бачым ідэолёгічныя падставы, тут, наадварот—поўны індывідуалізм. Я можа не памылюся, калі скажу, што „Маладняк“ у беларускую літаратуру ўнёс настрої штурм унд дранг пэрыоду. У беларускую поэзію ўвашоў юны энтузіазм, ёсьць імкненьне да лепшай будучыны. У „Маладняку“ выяўляецца буйнае імкненьне адбудаваць лепшае жыцьцё і колектывізм. „Маладняк“ у беларускую поэзію ўнёс новыя рытмы, новыя пры-

ёмы. „Маладняк“ беларускай літаратуры—усё новыя і новыя самастойныя рэволюцыйная пасты—гэта і ёсьць штурм унд дранг Беларусі.

Няхай жыве і мацнее „Маладняк“!

Старшыня: Ад яўрэйскай літаратурнай сэкцыі Інбелкульту мае слова для прывітаньня тав. Ойсьлендэр (*гаворыць паяўрэйску).*

Старшыня: Слова для перакладу мае тав. Каплан.

Тав. Каплан: Таварыш гаворыць ад імя яўрэйскай сэкцыі Інбелькульту. Ён кажа, што зараз карэньні яўрэйскай і беларускай культуры пераплятаюцца ў сваіх мотывах. У той час, калі Янка Купала пісаў, што „не вясёлая старонка наша Беларусь“, у той-жа час яўрэйскі поэта Мэндэле Мойхер Сфорым пісаў гэтак сама аб гэтай невясёлай старонцы, аб тым уціску, у якім знаходзіліся яўрэйскія насельнікі на Беларусі.

Таварыш далей кажа, што ня толькі ў мінулым, але і ў сучасны момант мотывы беларускай і яўрэйскай культуры пераплятаюцца там, за кардонам, за гэтым, што там як беларуская, так і яўрэйская культура ўціскаецца польскімі панамі.

Але Савецкая ўлада звольніла ўсе нацыянальнасьці і дала мажлівасьць шырокаму разьвіцьцю яўрэйскай культуры. І толькі пры Савецкай уладзе, пры той нац. політыцы, якую праводзіць Ком. партыя, ёсьць глеба для разьвіцьця як беларускай, так і яўрэйскай і наогул усіх нацыянальных культур. *(Аплёдысмэнты і бел. марсэльеза).*

Старшыня: Ад яўрэйскай групы поэтаў „Юнгэр Арбэйтэр“ слова мае т. Броншгэйн *(гаворачы паяўрэйску, вітае свайго сабрата па пяры і працы ў рабоча-сялянскіх гушчах Беларусі—„Маладняк“).*

Старшыня: Слова мае прадстаўнік Гомельскай філіі тав. Грашчанка.

Тав. Грашчанка: Гомельская філія „Маладняка“ вітае 1-шы Ўсебеларускі зьезд пісьменьнікаў і поэтаў і ўпэўнена, што гэты зьезд, калі будзе падагульваць сваю працу і будзе глядзець што прашло ў яго працы за 2 гады, зьнішчыць тыя ўхілы, якія маглі закрасца ў працы. Цяпер на гэтым зьезьдзе асабліва Беларусь зарубежная з зацікаўленасьцю глядзіць на працу зьезду. Яна ведае, што з іх шэрагу выйдуць пісьменьнікі, якія будуць браць матэрыял з іх крыніц. Наша моладзь, савецкая, рабоча-сялянская, якая выхоўваецца ў умовах дыктатуры пролетарыяту пад кіраўніцтвам Комсамолу і Ком. партыі мае надзею, што хутка зьменіць стары лад, як казаў стары маладнякоўца, М. Чарот, „што сьвет стары зьніштожым і пабудуем новы“, а сябар нашай філіі, новы маладняковец, упэўненым тонам казаў, „што мы, моладзь, новае жыцьцё адбудуем. Мы, моладзь, к новаму ідзем“. Ён ведае, што літаратура можа быць толькі як зброя, і падходзіць да яе, як да зброі—гэта літаратура ўжо ёсьць. Зарубежная Беларусь чакае, як жадаў-бы прадстаўнік Украіны, каб тыя ўхілы, якія былі, каб яны на зьезьдзе былі зьніштожаны, каб на другім зьезьдзе былі прадстаўнікі замежнай цяпер Беларусі, і „Маладняк“ пад кіраўніцтвам комсамолу і Ком. партыі прывёў усю рабоча-сялянскую гушчу да сьветлай будучыны—комунізму.

Ад Музычнага Тэхнікуму вітае т. Дрэйзін. Шчырае і сардэчнае прывітаньне ад Бел. Дз. Музычнага Тэхнікуму 1-му зьезду „Маладняка“, на які працаўнікі музычнага мастацтва глядзяць, як на сваіх братоў, бо поэты і музыканты працуюць адным і тым-жа арудзьдзем у сваёй вытворчасьці, бо і тон і слова ёсьць зык, і ня трэба запамінаць, што першая музыка, якая была напісана, гэта ёсьць злучэньне тону і слова.

І вось гэта становішча між поэзіяй і музыкай існуе да гэтага часу. Музыка—ёсьць мова, ды яшчэ якая мова. Шэйн Бах казаў, што гэтую мову разумее ўвесь сьвет. Яшчэ стары композытар Г....., калі яму казалі, што ён ня ведае чужаземных моў, дык ён у вадказ на гэта казаў, што маю мову ведае ўвесь сьвет. Працаўнікі Беларускага Музычнага Тэхнікуму мараць аб тым будучым, калі творчасьць беларускай культуры будзе стаяць на належнай вышыні, калі там будуць не старыя працаўнікі, а „Маладняк“, якія зьявяцца будаўніком гэтай новай культуры. Музыка думае аб стварэньні ня толькі музыкі і поэзіі, але і ўсяго мастацтва Беларусі. Аб гэтым марыў і нямецкі композытар Вагнэр і расійскі С. П. Срабін; яны аб гэтым ніколі ня перастануць думаць. З часам гэта прыдзе, у гэтым глыбока ўпэўнены музычныя працаўнікі, і тады „Маладняк“ зьліецца ў адно агульнае аб'яднаньне для таго, каб пабудаваць новую беларускую культуру, якая ўвойдзе, як важная частка ў вялікую агульную людзкую культуру. Музычны тэхнікум з гэтым пачуцьцём яшчэ раз вітае першы Ўсебеларускі зьезд „Маладняка“.

Старшыня: Паступіла яшчэ шмат запісаў т. т., жадаючых вітаць Усебеларускі зьезд „Маладняка“, але за адсутнасьцю часу гэтыя прывітаньні мы заслухаем заўтра і ў іншыя дні нашай працы. Зараз паступіла некалькі тэлеграм і адрасаў на імя зьезду.

Тав. Александровіч зачытвае прывітаньні *(глядзі прывітаньні).*

Старшыня: Цяпер нам трэба прыняць парадак дня і рэглямант. Апрацаваны ЦБ парадак дня і рэглямант наступныя:

1. Задачы „Маладняка“—*Крыніцкі.*
2. Справазд. ЦБ „Маладняка“—*Вольны.*
   Садаклады філій—*кіраўнікі філій.*
3. Шлях разьвіцьця пролетарскай літаратуры ў умовах дыктатуры пролетарыяту—дакл. *Гэсэн.*
4. Організацыйнае пытаньне—дакл. *Чарот.*
5. Творчы шлях „Маладняка“—дакл. *Бабарэка,* садакл. *Ул. Дубоўка.*
6. Праца сэкцый.
7. Перавыбары ЦБ „Маладняка“.
8. Розныя пытаньні.

**Рэглямант зьезду.**

Праца зьезду праводзіцца ад 11 да 3-х гадзін і ад $5^1/_2$ да $7^1/_2$ гадзін увечары. Даклад—1 гадзіна, слова ў спрэчках: першае—15 хвілін, другое—10 хвілін, трэцяе—5 хвілін, садаклад—40 хвілін. Заключнае слова—30 хвілін. Працуюць сэкцыі:

1. Організацыйная, 2. Літаратурная, 3. Тэатральна-музычная і выяўленчага мастацтва.

Тав. Старшыня: Ці маюцца якія зьмены, альбо папраўкі? *(Няма).* Будзем лічыць парадак дня і рэглямант прынятым.

Старшыня: Таварышы, я ў заключным слове буду кароткім. Мы тут маем паказальныя вынікі маладнякоўскай працы. Тут маюцца надзвычайна цікавыя пастановы сялянскіх сходаў і прывітаньняў, якія яны прыслалі да зьезду. Яны цікавы ў тых адносінах, што паказваюць, што сяляне па ўласнай ініцыятыве ня толькі тады, калі прыяжджае да іх маладняковец, выдзелены намі, а самі зьбіраюцца, застаўляюць граматнага хлопца чытаць маладнякоўскія творы і пасьля гэтага яны прысылаюць прывітальную тэлеграму і свае протоколы зьезду.

Усе гэтыя протоколы і прывітаньні „Маладняк“ прыймае не як прывітаньні. „Маладняк“ на гэтых прывітаньнях вучыцца. Мы ня ду-

маем, што гэта нас хваляць. Па гэтых прывітаньнях і протоколах „Маладняк“ глядзіць, якія хібы ў яго працы.

Сёнешні зьезд падкрэсьлівае тыя дасягненьні, якія ён мае за два гады свае працы. Я хачу, таварышы, зьвярнуць вашу ўвагу на адно. Тут ёсьць такія людзі, якія гавораць, што зараз ідзе барацьба між маладымі, старымі і што гэта наогул процэс барацьбы „отцов и детей“, якія ў часы рэволюцыі прыймаюць больш бурны характар. Т.т., гэта праўда. Хай будзе вам вядома, што „Маладняк“, гэта організацыя, аб'яднаючая людзей не па гадох. Вы ведаеце, што ў „Маладняку“ ёсьць такія, якім больш 40 гадоў. У Маскоўскай філіі ня так даўно прынёс заяву з цэлай кіпай сваіх твораў т., якому 66 год, які сказаў: „Ня дзівецеся, што я хачу ў М-кі; пад разуменьнем „Маладняк“ я разумею організацыю, аб'яднаючую людзей не па гадох, а па сваіх творах, па тэй сіле і бадзёрасьці, якая ў ім адчуваецца“. Так сапраўды трэба разумець „Маладняк“. „Маладняк“, бязумоўна, разумеюць па яго творчасьці больш усяго, і маладнякоўская творчасьць, гэта, бязумоўна, ёсьць тая моладасьць, якая характарызуе нас.

Я скажу ў заключэньне, што „Маладняк“ за 2 гады пры самых дрэнных умовах змог з'організаваць армію ў 500 чалавек. Трэба думаць, што ў далейшым умовы палепшацца, і праца наша пойдзе больш пасьпешна. Мы верым у сваю пабеду, дзеля таго што маладнякоўцы— гэта такая армія, якая ваюе ня толькі пяром, але, калі трэба будзе, яна кіне пяро і возьме ў свае рукі аружжа. Дык няхай жыве „Маладняк“ *(Аплёдысмэнты. Бел. марсэльеза).*

Пасяджэньне абвешчана закрытым.

## Пасяджэньне першае.

*Даклад тав. Крыніцкага на І-м Усебеларускім Зьезьдзе „Маладняка“ (26 лістапада).*

### Аб задачах „Маладняка“.

Буду я гаварыць аб тых палітычных абставінах, у якіх мы працуем, аб агульна-палітычных задачах, якія стаяць перад рабочай клясай, перад працоўнымі краіны і нашай Рэспублікі, і аб задачах „Маладняка“.

У Кастрычнікавым нумары „Праўды“ тав. Сталін параўнаваў пэрыод перад Кастрычнікам у 1917 годзе і перад 8-й Гадавінай Кастрычнікавай Рэволюцыі,—і той і другі пэрыоды зьяўляюцца падрыхтаваўча-пераходнымі к надыходзячаму 25-26 году. Зараз мы бяромся за будаўніцтва зусім новых адносін. І пры гэтым мы будзем будаваць з посьпехам пры ўмовах моцнага саюзу рабочай клясы з бяднейшым і сярэднім сялянствам. У адносінах да сярэдняга сялянства—ня толькі нэўтралізаваць сярэдняе сялянства, але весьці яго за сабою, ісьці з ім, як з моцным саюзьнікам, „ідучы ўперад шырокай масай разам з сялянствам“.

У прадстаячы пэрыод мы павінны ўвесь зьмест нашай працы накіраваць да паглыбленьня соцыялістычных задач Кастрычнікавай Рэволюцыі. Пад гэтым кутам гледжаньня мы азначаем наша палажэньне, нашы агульныя задачы ў Беларусі, а таксама задачы „Маладняка“.

### „Незалежнасьць“ і незалежнасьць БССР.

БССР—член саюзу, і БССР незалежная Рэспубліка па нашай Констытуцыі. Але, таварышы, у слова „незалежная“ можна ўкладваць розны зьмест. Незалежнай БССР можа быць у *дэмократычным* разуменьні гэтага слова, калі момант нацыянальны прэвалюе над моман-

там клясавым. З гэтага пункту гледжаньня соцыяльна-эканомічны лад Беларусі, забесьпячэньне дыктатуры пролетарыяту зацямняецца перад задачамі „агульна-нацыянальнымі“—гэта ня наша незалежнасьць, гэта—дэмократычная „незалежнасьць“, гэта буржуазны лёзунг.

Мы гаворым аб такой незалежнасьці БССР, як аб краіне дыктатуры рабочай клясы, у якой забясьпечана па гэтым самым разьвіцьцё культуры пролетарскай—па зьмесьце, у якой толькі і можа быць забясьпечана разьвіцьцё нацыянальнай па форме культуры. Мы гаворым аб незалежнасьці, пры якой забясьпечваецца і экономічны рост, як соцыялістычны рост. Гэта незалежнасьць у ўмовах акружэньня імпэрыялізму мажліва толькі тады, калі БССР зьяўляецца сапраўды членам СССР, знаходзіць падтрыманьне ў Саюзе. Толькі пры такіх умовах БССР і можа стаяць у шэрагу краін, якія змагаюцца з капіталізмам, з імпэрыялізмам. Толькі, будучы зьвязана з „Масквой“, як адзіным на зямлі рэволюцыйным цэнтрам у сучасны момант, Беларусь можа адстаяць сваю незалежнасьць, як Савецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

І адгэтуль першая задача „Маладняка“—выхаваць у кожным рабочым і селяніне Беларусі правіловае разуменьне незалежнасьці БССР, разуменьне неабходнасьці сувязі рабочых і сялян Беларусі з пролетарыятам усяго нашага Саюзу, разуменьне сутнасьці, што толькі такі моцны Саюз усіх Рэспублік у ўмовах шалёнай барацьбы імпэрыялізму супроць соцыялізму можа памагчы кожнай Рэспубліцы і ўсяму Саюзу адстаяць незалежнасьць, пашырыць тэрыторыямі межы дыктатуры пролетарыяту. І другое, аб чым патрэбна гаварыць,—гэта аб дыктатуры пролетарыяту ў БССР. Што значыць дыктатура пролетарыяту? Цяпер дыктатура пролетарыяту—значыць кіраўніцтва рабочай клясы ў адносінах да сялянства, гэта значыць будаўніцтва соцыялізму ў нашым краі, як і ва ўсёй краіне. І вось патрэбна сказаць, што наш пераходны пэрыод, пэрыод нэпу, ён з большай, чым калі-б то ні было, астрынёй выклікае блытаніну разуменьня дыктатуры пролетарыяту. Наш лёзунг, наша асноўная лінія—„узмацаваньне дыктатуры пролетарыяту“, падменьваецца другой—„працоўных“, часам падменьваецца дыктатура працоўных—гэта памылка. Працоўны—значыць і рабочыя, і сяляне, і бядняк, і серадняк, і кулак, і інтэлігент, і пролетарскі інтэлігент, і мелка-буржуазны інтэлігент. Пад гэта разуменьне працоўнага ўключаецца значная частка жыхарства, можа быць 90 проц. Пры нашым ладзе, у нашай краіне дыктатуру пролетарыяту можа ажыцьцёвіць толькі рабочая кляса, вядучы за сабою рэшту працоўных. Часам гэты лёзунг „дыктатура пролетарыяту“ перакручваюць інакш і разуменьне „ўлада рабочых і сялян“ усюды й абы-дзе. Выхаваць на гэтай уладзе рабочых і сялян—уладу рабочых і сялян. Гэта правілова ў тым сэнсе, што наша дзяржава, наш лад—дыктатура рабочай клясы—трымаецца на саюзе рабочых і сялян, але не правілова ў тым сэнсе, што гэты лёзунг „улада рабочых і сялян“ пры зацямненьні лёзунгу „дыктатура рабочай клясы“ прыводзіць да таго, што ў рабочых губляецца разуменьне ролі рабочай клясы, як кіраўніка, як гегемона. У сялян і беднякоў і ў сераднякоў, а кулакоў і пагатоў утвараецца разуменьне таго, што рабочая кляса не зьяўляецца кіраўнікам, што рабочая кляса зьяўляецца такім саюзьнікам з сялянствам, пры якім кіраўніцтва належыць і сялянству і рабочай клясе. Часта падменьваюць лёзунг „дыктатура пролетарыяту“ лёзунгам „саюз рабочых і сялян“—гэта неправілова ў тым сэнсе, што саюз рабочых і сялян, саюз, без якога дыктатура рабочай клясы трымацца ня будзе. Саюз рабочых і сялян—гэта задача на доўгія гады. Але, таварышы, саюз

рабочых і сялян можа быць моцны толькі тады, калі ў гэтым саюзе кіраўніцтва належыць рабочай клясе.

І ўрэшце апошняе неразуменьне, з якім прыходзіцца спатыкацца ў пытаньні дыктатуры пролетарыяту.

Чуў я некалькі разоў ад прадстаўнікоў інтэлігенцыі заявы, што мы, інтэлігенцыя, таксама пролетарыят—чаму? Таму што наша матэрыяльнае становішча, ровень жыцьця, нашы адносіны да ўласнасьці—такія, як у рабочых. У нас няма ўласнасьці. І тут, таварышы, адразу відаць тое самае неразуменьне, якое прыблізна было ў т. Кацэнбогена на нарадзе комуністычнага студэнцтва ў пытаньні аб тлумачэньні беларускага руху. Ён ставіў пытаньне так, што роль інтэлігенцыі Беларусі ў тым, што яна павінна за сабою забясьпечыць монопольнае становішча ў пытаньні культурнага будаўніцтва, дзеля гэтага яна так актыўна ў пытаньні беларусізацыі тлумачыла гэту..... ў двукосьсі, старалася вытлумачыць беларускі рух тым, ці іншым роўнем заработкаў; другімі словамі, яна клясавую лінію выводзіла, асноўна на адносінах да прыбытку, тых ці іншых прыбыткаў данай соцыяльнай групы ў той час, як мы гаворым, што справа ня ў гэтым. Папершае, справа ў тым палажэньні, якое соцыяльная група займае ва ўсёй сыстэме грамадзкага вырабу ў адносінах да прылад вытворчасьці, і з гэтага пункту гледжаньня пролетарыят і інтэлігенцыю мы ня можам зьмешваць; ужо затым мы ня можам зьмешваць, што і інтэлігенцыя не ўяляе з сябе адзіную, цэлую, аднародную групу. Яна ў сваіх шэрагах налічвае людзей цалкам рознастайнай клясавай лініі.

Мы, таварышы, гаворым, што нашай задачай і нашай лініяй зьяўляецца сапраўды саюз рабочых і сялянства беднейшага і серадняцкага, але пры абавязковым варунку кіраўніцтва рабочай клясы, і ў Беларусі гэта кіраўніцтва рабочай клясы выяўляе сабою комуністычная партыя. Рабочая кляса мае авангард у васобе комуністычнай партыі. Гэта ня значыць, што ў гэтым авангардзе ёсьць толькі рабочыя. У комуністычную партыю ўваходзіць і сялянства і інтэлігенцыя, стаўшая на пункт гледжаньня пролетарыяту. І калі мы ставім задачай Беларусі ўзмацаваць дыктатуру пролетарыяту, то гэта ў значнай меры азначае ўзмацаваць комуністычную партыю, узмацаваць яе шэрагі, узмацаваць яе кіруючую ролю ва ўсіх галінах будаўніцтва.

Калі гаварыць у тым кірунку аб задачах „Маладняка", то яны зводзяцца да таго, каб выхаваць у кожным рабочым Беларусі разуменьне ролі рабочай клясы, як кіраўніка саюзу рабочых і сялян,—мы адзначаем у Беларусі беднасьць разуменьня гэтай існасьці рабочымі, мы адзначаем ня зусім глыбокую актыўнасьць рабочых. Наша літаратура, ня толькі наша газэта, публіцыстыка, але і ў „Маладняку" павінны шмат папрацаваць над тым, каб у рабочым выхаваць гэта разуменьне і куды большую актыўнасьць.

Другая ваша задача ў гэтым сэнсе—у селяніне выхаваць правільловыя адносіны да рабочае клясы, як да кіраўніка саюзу рабочых і сялян, у інтэлігенцыі выхаваць разуменьне таго, што яна не зьяўляецца аднароднай групай, што ў шэрагах інтэлігенцыі ёсьць людзі, якія прадстаўляюць ідэолёгічную верхавіну той ці іншай клясы, той ці іншай з асноўных соцыяльных груп.

Калі гаварыць аб дыктатуры пролетарыяту ў галіне экономічных адносін, трэба ізноў такі тут адзначыць некаторае неразуменьне. Дыктатура рабочай клясы будзе замацоўвацца тады, калі наш край будзе экономічна расьці, і ня дарам партыя выкінула лёзунг „росквіт Беларусі—экономічны, культурны росквіт". Але, як бачым, буржуазныя дэмократы, кожны буржуазны ўрад бярэ лёзунг росквіту сваёй

краіны, але мы подкрэсьліваем, па соцыялістычным шляху. Калі вы ўспомніце на сэсіі ЦВК пастаноўку пытаньня аб адраджэньні і адбудове гаспадаркі Беларусі, дык у наш лёзунг уваходзіць і культурная вёска. Калі гэта наш лёзунг у поўнай меры, то пад гэтым лёзунгам падпішацца кожная буржуазна-дэмократычная партыя—так, багатая культурная вёска, але якая ідзе па шляху соцыялістычнага разьвіцьця. У ўмовах дыктатуры пролетарыяту, коопэруемай вёскі, такой вёскі, пры якой коопэрацыя пераварачваецца ўсё больш у грамадзкую сілу і пры якой коопэрацыя ўсіх вялікіх і малых гаспадарак прывязвае да соцыялістычнай прамысловасьці. У гэтых адносінах задача „Маладняка"—дапамагаць рабочай клясе падымаць соцыялістычную прамысловасьць, разьвіваць яе, бо гэта апора нашай соцыялістычнай гаспадаркі. Падругое, на вёсцы ўсякім чынам дапамагаць росту і разьвіцьцю коопэрацыі, бо коопэрацыя—асноўны шлях, па якім сялянская гаспадарка будзе разьвівацца і падцягвацца да соцыялістычнай прамысловасьці.

Далей аб дыктатуры пролетарыяту. Трэба сказаць, што ў галіне культурнага будаўніцтва мы, таварышы, найбольш адсталыя, мы самыя адсталыя ва ўсёй краіне, бо да апошняга часу павінны былі біцца над тым, каб ускорыць гаспадарчы рост. Мы да гэтага часу біліся над тым, каб прайсьці асноўны процэс па адбудаваньні, зараз мы яго канчаем. Мы зараз бяромся да больш высокага роўню экономічнага росту і пры гэтым наша культурнае будаўніцтва мы павінны разьвіць у куды большай меры, чым да гэтага часу. Мы падыходзім да падрыхтоўкі культурнай рэволюцыі, аб якой многа гаварыў т. Ленін у ўмовах разьвярнутага нэпу, і пры тых супярэчнасьцях, якіх вельмі шмат, гэта задача асабліва востра стаіць. Калі мы тут празяваем, дык у галіне культуры на ідэолёгічным фронце нас будуць цясьніць, у гэтых адносінах кіраўніцтва рабочай клясы будзе губляцца, адціскацца. На Беларусі гэта задача культурнага будаўніцтва яшчэ больш востра стаіць, бо беларуская культура адстала больш, чым у шмат іншых раёнах краіны, у параўнаньні з аснаўнымі цэнтральнымі раёнамі нашага Саюзу. Пры гэтым, таварышы, патрэбна адразу паставіць пытаньне аб тым, што нам ужо не хапае культурнага росту наогул. Правілова, патрэбна дабівацца таго, каб рос лік пісьменных, каб расла і разьвівалася наша школа, каб было больш газэт, больш кніг. Трэба праводзіць беларусізацыю і разьвіць школы і апарат, і літаратуру на мове нацыянальных меншасьцяй—яўрэйскай і польскай,—другімі славамі—разьвіваць нацыянальныя формы нашай культуры. Але ўсяго гэтага мала. Зараз, больш, чым калі-б то ні было, мы падышлі да задачы папрацаваць над зьместам нашай культуры, навакол гэтага пытаньня барацьба будзе ў хуткім часе разьвівацца сурь'ёзьней, куды больш глыбока. Ленін не адзін раз гаварыў аб культуры, аб тым, што мы ня можам адразу невядома адкуль яе выдумаць. Ён гаварыў, што пролетарская культура не зьяўляецца выскачыўшай невядома адкуль, не зьяўляецца выдумкай людзей, якія называюць сябе спэцыялістымі пролетарскай культуры. Але *(чытае).*

І вось да гэтага часу наша задача ў значнай меры зводзілася да таго, каб больш усяго зьвяртаць увагу на тое, каб тая культура, якую нам пакінула буржуазнае грамадзянства, каб хоць яе прысвоіць у нашай краіне, у культурна адсталай. Над гэтай задачай прыдзецца вельмі шмат працаваць, і цяпер яшчэ трэба куды больш грунтоўна заняцца пераапрацоўкай гэтай культуры. І пры гэтым, таварышы, у гэтым разуменьні пролетарскай культуры ёсьць усялякая блытаніна. Часам мы спатыкаем ацэнку таго ці іншага літаратурнага твору, што ён зьяўляецца пролетарскім. Ён зьяўляецца пролетарскім толькі па форме,

па фразэолёгіі, толькі таму, што там вы спаткаеце шмат слоў, якія ўжываюць рабочыя ў фабрычна-заводзкім жыцьці. Часам пролетарскім лічаць выступленьне, затым што там матэрыял з фабрык, заводаў, але гэта ня значыць, што твор зьяўляецца такім, які па зьместу можна назваць пролетарскім. Мы гаворым аб пролетарскай культуры, як аб пролетарскай культуры, якая дапамагае ўзмацненьню дыктатуры рабочай клясы і ўсяго культурнага будаўніцтва. Мы ацэньваем у гэтых адносінах з пункту гледжаньня, ці ўзмацняе дыктатура рабочае клясы, кіраўніцтва рабочай клясы ці не. І ў гэтых адносінах задача маладнякоўцаў працаваць над зьместам сваёй працы, над зьместам усяго культурнага будаўніцтва з тым, каб рост культуры, культурны рост Беларусі быў ровен узмацненьню дыктатуры рабочай клясы, ішоў пад гэтым лёзунгам, трэба памагаць разумець гэта кожнаму культурніку, настаўніку, інтэлігенту, кваліфікаванаму інтэлігенту, які працуе ў галіне культурнага будаўніцтва, трэба дапамагаць разумець гэту думку. У гэтых задачах, таварышы, нам прыдзецца і прыходзіцца спатыкацца з шмат якімі супярэчнасьцямі нашага росту ўмацненьня дыктатуры пролетарыяту і ўмацаваньня социялізму. Мацнеюць нашы камандуючыя высоты—прамысловасьць. Рабочая кляса расьце колькасна, мацнее, выхоўваючы сваіх дзяцей, мацнее дзяржаўны крэдыт, мацнее коопэрацыя, мацнее партыя і Комсамол—яе памоцнік; партыя, як аснаўное арудзьдзе рабочай клясы, мацнее, мацнеюць нашы сілы. Але адначасна мы наглядаем рост элемэнтаў капіталізму і ў горадзе і ў вёсцы,—у вёсцы таму, што там маюцца расслаеньні. У вёсцы выдзяляюцца заможныя буржуазныя вярхі і пытаньне, якое Ленін паставіў у першыя гады нэпу: хто каго пераможа—дыктатура пролетарыяту, ці капіталізм, да гэтага часу застаецца нявырашаным. Клясавая барацьба ідзе і нам прыходзіцца працаваць у больш складаных абставінах, чым у гады грамадзянскай вайны, таму што ворага ня бачым, вораг маскіруецца ў самыя рознастайныя формы.

Задачы маладнякоўцаў—гэта бачыць клясавыя супярэчнасьці ў нашай краіне, у нашым пэрыодзе умець рабочых і сялян выхоўваць, каб бачыць гэтыя супярэчнасьці, весьці пры гэтым правіловую клясавую лінію.

Усе гэтыя задачы і гаспадарчае будаўніцтва, і палітычную працу, і культурнае будаўніцтва рабочая кляса не выпаўняе толькі сваймі рукамі. Рабочая кляса апіраецца, кіруючы ў сваёй працы на ўвесь камандны склад. Сюды ў камандны склад патрэбна аднесьці і спэцаў, і інтэлігенцыю самых розных профэсій, і настаўніцтва, і агрономаў, і ўрачоў, і кваліфікаваных культурнікаў, і вучоных. І вось гэта задача прыцягненьня да справы рабочай клясы тых спэцыялістых, тую інтэлігенцыю, тых вучоных, якія пакінены ад буржуазнага ладу, гэта задача прыцягненьня застаецца і на доўгі час яшчэ будзе заставацца нязьменнай задачай партыі і рабочай клясы. Але гэта ня значыць, што партыя і рабочая кляса не павінны крытыкаваць абмылкі тых людзей, якіх прыцягваюць да будаўніцтва і працы, не зазначаць на абмылкі, на тыя супярэчнасьці, якія выяўляюцца ў працы гэтых прадстаўнікоў інтэлігенцыі і спэцыялістых—супярэчнасьці дыктатуры рабочае клясы. Мы ў Беларусі павінны за гэтым тое самае сказаць аб шэрагах той інтэлігенцыі, якая працуе тут. Я, гаворачы аб беларускай інтэлігенцыі, тое самае павінен сказаць: гэтую лінію партыі і партыя, і рабочая кляса праводзілі, праводзяць і будуць праводзіць, але пры гэтым мы не павінны губляць кіраўніцтва рабочай клясы, кіраўніцтва партыі. І вось калі аналізаваць, у якой меры гэта кіраўніцтва партыі ў адносінах да інтэлігенцыі, прыцягненай да будаўніцтва новых

грамадзянстваў, можа ажыцьцяўляцца, каб адказаць на пытаньне, трэба паглядзець, ці зьяўляецца аднароднай наша інтэлігенцыя.

Мы ў Беларусі інтэлігенцыю павінны разьдзяляць на тры асноўныя групы: першая—наша пролетарская інтэлігенцыя, у поўнай меры пролетарская, якая і на справе і ў барацьбе даказала, што стаіць на позыцыях рабочай клясы і дыктатуры пролетарыяту. Гэта тая інтэлігенцыя, якая ў шэрагах КПБ зьяўляецца значна большай часткай, тая інтэлігенцыя, якая ў шэрагах Комсамолу, гэта інтэлігенцыя, вышаўшая з шэрагаў рабочых, якія на рабфаках выкоўваюцца ў новую інтэлігенцыю. Гэта інтэлігенцыя і ёсьць ідэолёгічным верхам рабочай клясы ў галіне культурнага будаўніцтва ўсёй культурнай працы.

Другая група самая вялікая, у якую ўваходзіць большасьць інтэлігенцыі, яна працуе з намі. Сюды адносім такія групы вельмі значныя па ліку, як настаўніцтва, якое ў значнай частцы павінна быць аднесена да гэтай другой групы, большую частку студэнцтва, агрономаў, урачоў, значную частку працаўнікоў Наркамасьветы і яго органаў, Інстытут Беларускай Культуры. Да гэтай групы можна аднесьці, таварышы, і маладнякоўскую організацыю, як організацыю культурную, як літаратурную групу ў большай сваёй частцы беспартыйную. Вось гэта другая група інтэлігенцыі, яна на словах у поўнай меры з рабочай клясай на позыцыях дыктатуры пролетарыяту разам з комуністычнай партыяй, яна на справе стараецца, хоча сапраўды і робіць, узмацняе справу рабочае клясы, яна ахвотна прызнае памылкі, яна не зацямняе сваіх памылак, яна за словамі падтрыманьня дыктатуры пролетарыяту не зацямняе іншых позыцый,—гэта большая частка інтэлігенцыі.

Нарэшце, трэцяя група па ліку нязначная—нацыянал-дэмократычная інтэлігенцыя. Гэта ня толькі група людзей, але можна сказаць, што ў гэтай групе мы часта знойдзем з ясна выяўленай нацыянал-дэмократычнай ідэолёгіяй людзей, у гэтай групе нацыянал-дэмократычны настрой мы можам вельмі часта спаткаць нечакана сярод тых ці іншых прадстаўнікоў інтэлігенцыі. У гэтай групе, лікам невялікай, групе інтэлігентаў, трэба сказаць, што тут мы бачым тыя самыя словы і агульны настрой і савецкі, і комуністычны, словы падрыманьня дыктатуры пролетарыяту, але на справе па сутнасьці, калі даходзіць да больш глыбока вызначэньня позыцыі, мы часта бачым нацыянал-дэмократычнае. Я, таварышы, магу прывесьці матэрыял дваякага сорту дзеля таго, каб ахарактарызаваць гэту групу. Мы маем яскрава выяўленае выступленьне Трамповіча („Савецкая Беларусь" ад 21 кастрычніка). Усе мы яго вельмі добра ведаем і напэўна чыталі яго. Надзвычайна цікавае выступленьне і можна сказаць, што гэта выступленьне ў поўнай меры характарызуе позыцыі гр. Трамповіча. Думаю, што нельга сказаць, ня зусім магчыма, што пад націскам крытыкі гр. Трамповіч папраўляе і бярэ свае словы назад—гэта магчыма наогул. Але да чаго яго выступленьні зводзяцца?—Яны зводзяцца да таго, каб кіраўніцтва партыі замяніць сумеснай працай з Комуністычнай партыяй, г. зн. рабочай клясай, адпаведнасьць за будучае ўзяць на сябе, у той час, як гэту адпаведнасьць ў поўнай меры бярэ на сябе рабочая кляса, прыцягваючы да справы будаўніцтва і інтэлігенцыю і ўтвараючы імавернасьць і самыя простыя таварыскія адносіны. Вось два асноўных тэзісы, якія гавораць аб тым, што гр. Трамповіч пераглядвае правіловасьць нашых позыцый. Па гэтым пытаньні пакуль можа быць і не наўмысьля няма паправак і вусна прыходзіцца мець справу, як з незаконным палітычным выразам.

Другі вельмі поўны закончаны матэрыял, гэта матэрыял аднэй з апошніх спраў ДПУ, матэрыял, які я агалашу. Тут ужо мы наглядаем

групу зусім закончаную, нацыянал-дэмакратычную групу, якая організавана, пачала афармляцца, якая мела ячэйкі ў Слуцкай і Менскай акругах, вяла актыўную перапіску, мела ячэйкі, якія імкнуліся зьвязаць і настаўніка, і вучня, выпушчала лістоўкі, выпусьціла 2-3 экзэмпляры падпольнай часопісі. Што прадстаўляе з сябе гэта група? Я зачытаю некалькі дакумантаў, яны ў мяне пераведзены на расійскую мову, таму што гэтыя матэрыялы скарыстаны ня толькі ў аднэй Беларусі *(чытае).*

Тут мотывы супроць бальшавікоў, супроць інтэлігенцыі, мотывы ўтварыць сваю ўласную Беларускую дзяржаву супроць бальшавікоў, супроць інтэлігенцыі; лёзунг: буржуазная незалежнасьць.

Далей мы бачым лістоўкі супроць бальшавікоў *(чытае).*

Тут ізноў бачым апрача кулацкіх позыцый, позыцыі яскрава шовіністычныя. Калі, таварышы, паглядзім па перапісцы, якая пляцформа гэтай групы, то мы бачым *(чытае).*

На чале з Якубам Коласам (гэтыя людзі ссылаюцца на Коласа) яны гавораць: організуйце супроць і замест РКП сапраўдных беларусаў. Гэта ёсьць яскрава буржуазна-нацыянал-шовіністычная пляцформа супроць дыктатуры пролетарыяту, супроць РКП. Гэтыя людзі ссылаюцца на Якуба Коласа, але калі гаварылі з ім і выясьнілі, наколькі гэта праўда, дык ён гаварыў, што гэта ня так. У яго ёсьць шмат магчымасьцяй заяўляць, што гэта ня так, ня праўда, але ён да гэтага часу гэтага не зрабіў, чаму гэтыя людзі цягнуцца да Коласа? Зусім зразумела, што ДПУ павінна было азнаёміцца з дакумантамі, якія гаварылі аб удзеле ў гэтым Якуба Коласа, у яго ёсьць пара вершаў, якія адбіваюць тое самое. Гэтыя дакуманты ўсё-ж такі гавораць, што людзі працягваюць руку Коласу, бачаць у ім адзінага чалавека, які будзе спачуваць гэтаму кірунку.

Надзвычайна цікавае азначэньне „Маладняка" ў адным лісьце. Гэтыя людзі разважаюць такім чынам *(чытае).*

Гэта тая організацыя, праз якую рабочыя хацелі прывабіць, падманіць сялян. Гэтыя людзі бачаць, што гэта організацыя зьяўляецца, бязумоўна, організацыяй, якая ў сваіх шэрагах павінна перавыхаваць, перавесьці сялян на позыцыі рабочай клясы на справу замацаваньня дыктатуры рабочае клясы. Гэта ня ёсьць мана, а мы проста гаворым, што задача „Маладняка" перавыхаваць сялян.

Затым надзвычайна цікавая гаворка аб арміі, гаворка, якая паказвае, што настрой вельмі сур'ёзны *(чытае).*

Далей, калі гаварыць аб задачах беларусаў, дык мы бачым тойжа самы дакумант аб гэтых людзях *(чытае).*

Так што тут і самі нацыянал-шовіністыя ставяць пытаньне не аб тым, каб праводзіць беларусізацыю Чырвонай Арміі, яны ставяць ня так пытаньне, а гутарка ідзе аб тым, каб *(чытае).*

Патрэбна зьвярнуць увагу, таварышы, на тыя цікавыя вершы, якія былі знойдзены ў Якуба Коласа, дзе мы маем: што бальшавікі горш жандараў, горш, чым цар Нікалай, і далей дабавак—„пойдзем перамагаць".

Нарэшце, апошні дакумант, гэта аб плянах, думках селяніна. Там аўтар выказвае думку селяніна *(чытае).*

Другімі словамі,—гэта яскрава выяўленая нацыянал-дэмократычная група. Што мы тут бачым? Бязумоўна, буржуазны нацыяналізм, шовінізм. Другая сялянская позыцыя, адпавядаючая позыцыям заможнага сялянства, якая сабе ставіць супроць рабочую клясу ў агульных позыцыях супроць дыктатуры пролетарыяту, супроць комуністычнай партыі.

Вядома, таварышы, ні ў якой меры немагчыма ставіць знак роўнасьці паміж выступленьнем Трамповіча і падобнымі дакумантамі. Тут мы бачым пэўную контр-рэволюцыйную супроцьсавецкую групу, там мы гэтага ня бачым. Там мы бачым добрае жаданьне памагчы Савецкай уладзе, Комуністычнай партыі. Але справа ня ў гэтых добрых жаданьнях, а справа ў тэй агульнай тэндэнцыі, якая выказвае і там, і тут аслабленьне ліквідацыі кіраўніцтва Комуністычнай партыі і рабочай клясы. Пры гэтым у шэрагах інтэлігенцыі, як групы, якая ўключае вярхі дробнай буржуазіі,—наданьне гэтай інтэлігенцыі ініцыятывы, самастойнасьць і адпаведнасьць за будучае, адпаведнасьць кіраўніцтвам рабочай клясы; наогул тэндэнцыя адна і тая. Але калі другіх людзей можна аднесьці ў поўнай меры да нацыянал-дэмократаў, дык Трамповіча напэўна можна аднесьці... Тут перарываецца настрой, які наогул, як палітычнага культурніка, відавочна не характарызуе.

Вось, таварышы, як абстаіць справа з тэй інтэлігенцыяй, з тымі сіламі, з якімі рабочая комуністычная партыя Беларусі павінна будаваць новае грамадзянства, павінна падымаць край і экономічна і культурна.

Да чаго зводзяцца нашы палітычныя задачы „Маладняка"? Папершае, паглыбляць уплыў партыі на ўсе слаі інтэлігенцыі, забіраючы асноўную масу інтэлігенцыі—другую групу, аб якой я гаварыў: настаўніцтва, агрономы, урачы і г. д., кваліфікаваных вучоных працаўнікоў, усіх людзей, якія з намі, якія гэтага жадаюць, памагаюць і сапраўды на справе становяцца на нашай позыцыі.

Другая задача нашай партыі і вас, „Маладняка"—разаблачыць нацыянал-дэмократычныя памылкі, адкрыць іх без зацямненьня да канца, разаблачаючы простай крытыкай без усялякіх замазваньняў і зацямненьняў, якія-б аўторытэты пры гэтым ні прыходзілася закранаць.

Трэцяя задача—ні ў якой меры не дапушчаць такога палажэньня, каб падымалася гэта простая крытыка, як жаданьне адпіхнуць ад працы, як нежаданьне працаваць сумесна з гэтай групай інтэлігенцыі. Мы ўжо павінны ясна зразумець, што калі-б нават быў у васобных людзей настрой нацыянальна-дэмократычнага парадку, мы адкрыта будзем крытыкаваць, будзем зазначаць памылкі, але ў той час да працы будзем прыцягваць, да справы нашага гаспадарча-культурнага будаўніцтва гэтых людзей, мы будзем прабаваць працаваць над тым, каб утварыць самыя простыя адносіны, але ў той час няўхільную да канца крытыку. І ў гэтым сэнсе „Маладняк" павінен шмат папрацаваць над тым, каб, з аднаго боку, крытыкай, з другога—ні ў якім выпадку не дапушчаць аніякіх адценьняў цкаваньня, утварэньне няшчырасьці, недавер'я ў адносінах з прадстаўнікамі ў даным выпадку, у тэй лікам невялікай групе інтэлігенцыі, якая зьяўляецца нацыянал-дэмократычнай, якая адносіцца варожа да дыктатуры пролетарыяту.

Чацьвертая асноўная задача, пры якой толькі і зможа „Маладняк" свае палітычныя задачы выпаўняць—гэта ўзмацніць свае шэрагі. „Маладняк" не зьяўляецца аднароднай організацыяй, па сваёй тэндэнцыі „Маладняк"—гэта пролетарская організацыя, гэта організацыя блізкая да Компартыі і яшчэ ў значнай меры да Комсамолу. Гэта організацыя, якая ў сваёй працы ў шмат чым замацоўвае справу дыктатуры рабочае клясы, справу будаўніцтва соцыялізму. Але, таварышы, і ў гэтых вашых шэрагах ёсьць промахі і ўся справа ў тым, каб вы замацнілі свае шэрагі, каб на справе зрабілі пролетарскую па зьмесьце працу, каб вы конкрэтна памаглі таварышам, якія робяць промахі, іх выпростваць і набліжаць да асноўнай лініі. „Маладняк"—гэта органі-

зацыя, якая, бязумоўна, організуецца і вырасьце ў вялікую сілу, якая і зараз ужо займае не малое месца ў культурным будаўніцтве Беларусі, але гэта будзе толькі тады, калі „Маладняк“ добра ўявіць свае політычныя задачы і свае шэрагі зможа замацаваць, каб у поўнай меры на справе стаць пролетарскай організацыяй. *(Аплёдысмэнты).*

Тав. Крыніцкі: Адказ на запытаньне аб організацыі, якая была выкрыта ў Слуцку.

Я павінен сказаць, што там вядомых беларускаму руху людзей ня было, былі там настаўнікі і супрацоўнікі розных савецкіх устаноў. Далей т. просіць прачытаць поўнасьцю верш; я чытаў толькі самыя характэрныя месцы ў вершы, якія выяўлялі дзейнасьць і настроі гэтага гатунку інтэлігентаў. Тут яшчэ ёсьць пытаньне аб „Маладняку“, чым была вызвана гарачая дыскусія; т. просіць даць выказаць сваю думку. Я лічу, што зьмяшчэньне рознага матэрыялу, як, напрыклад, верш „Буржуй і Пролетарый“, зьяўляецца вялікаю абмылкаю і гаварыць аб тым, што ў гэтых выпадках быў сур'ёзны промах,—гэта гаворыць аб тым, што ў наступным зборніку вам прыдзецца больш такога матэрыялу не зьмяшчаць, справіць абмылкі, прыдзецца папрацаваць над сабою і не пролетарскіх уплываў у сваіх творах не адбіваць. Цяпер я пераходжу к вашым асабістым справам; т. піша, што рабіць, калі на мясцох не наладжаны добрыя адносіны „Маладняка“ з другімі організацыямі і яму не дапамагаюць, ня хочуць лічыцца з ім і г. д. Я думаю, і так павінна быць, што ўсе запатрабаваньні „Маладняка“ павінны ставіцца прад партыйным камітэтам, усё роўна, якія-б ні былі пытаньні, пажаданьні, яны праз Комсамол павінны даходзіць да партыі, а з Комсамолам „Маладняк“ зьвязаны добра. Калі вашы жаданьні не задавальняюцца, у вас ёсьць ЦБ організацыі, ёсьць цэнтральныя партыйныя ўстановы, якія будуць разьбірацца ў вашых справах, і каму трэба, будзе давацца адпаведнае тлумачэньне.

## Спрэчкі па дакладу т. Крыніцкага.

Старшыня: Слова мае тав. Дубоўка.

Тав. Дубоўка: Сёньня мы мелі гонар заслухаць даклад Сакратара ЦК КП(б) Беларусі. Гэты даклад дае нам у ваднэй частцы свайго рода настаўленьні, рады і, я сказаў-бы, дырэктывы для нашай далейшай працы, на якія мы належным чынам адгукнемся ў сваёй рэзолюцыі.

З другога боку, т. Крыніцкі ў сваім дакладзе высьветліў найбольш яскравы ўхіл, які заўважаны ў жыцьці нашай „матушкі-провінцыі“, у жыцьці Слуцкай акругі. З гэтага я і пачну.

Ня трэба траціць слоў, ня трэба доўга даводзіць, што ў гэтым выпадку—політычнае шахрайства.

Гэта „слаўная“ група інтэлігенцыі ці не інтэлігенцыі (трэба яшчэ прыглядзецца да гэтага) пэўна атрымала і натхненьне і „пінёндзы“ ад яснавяльможнага панства з-за кардону або спадзявалася атрымаць іх пасьля „працы“.

У гэтым мяне пераканалі лёзунгі гэтай групы, якія вам толькі што былі зачытаны.

Што-ж сказаць аб іх? Аб „Маладняку“ гутаркі ня можа быць—ня гледзячы на сваю моладасьць, мы пакаштавалі даволі панскіх бізуноў і толькі чакаем часу, калі гэтыя бізуны выплацім панам ды з процантамі. Малы лік удзельнікаў гэтай групы гаворыць ясна, што і беларуская працоўная інтэлігенцыя за ёй не пашла і ня думала ісьці.

Чаму? Мне здаецца, што я не памылюся, калі дам наступнае тлумачэньне.

Ні царская ўлада, ні Керанскія, ні паны са сваімі лёкаямі тыпу Булак-Балаховіча не далі Беларусі нічога, апрача абяцаньняў, зьдзекаў і турам.

Комуністычная партыя можа мала абяцала, але затое зрабіла надзвычайна многа для рэальнага адраджэньня беларускай культуры і экономікі. 5-6 год таму назад ніхто ня мог падумаць, што мы будзем мець такія дасягненьні, якія маем цяпер. Ня ўсё яшчэ зроблена, гэта праўда. Але апошняе якраз і загадвае нам шчыльней згуртавацца ля Комуністычнай партыі, каб пад яе кіраўніцтвам ісьці да новых і новых дасягненьняў. Вось тое, аб чым хочацца сказаць у зьвязку з правакатарскай чыннасьцю выкрытай у Слуцку групы.

Цяпер—аб асноўных момантах дакладу. Аснова маладнякоўскай творчасьці, компас — пролетарская ідэолёгія. Ідэолёгічна вытрыманы зьмест—правіла. А форма, а формальна-мастацкія адзнакі—не як сама мэта, а як сродак для дасягненьня таксама асноўнага ў адносінах да літаратурнай творчасьці—„літаратура, як сродак клясавага змаганьня". На ўсёй сваёй працы маладнякоўцы імкнуліся і павінны імкнуцца надалей дапамагаць сталёваму правадыру рабочых і сялян Комуністычнай партыі ў будове соцыялізму, у будове соцыялістычнай культуры. Новае, да чаго мы імкнемся,—агульна-людзкія мотывы. Рэгулятарам нашым на гэтым шляху зьяўляецца знамянітая формула таварыша Сталіна:

*Нацыянальная па форме, пролетарская па зьмесьце—вось тая агульна-людзкая культура, да якой вядзе соцыялізм.*

Сказаўшы аб гэтым, няможна ня ўспомніць прысутнага тут шаноўнага прадстаўніка расійскіх пролетарскіх літаратурных аб'яднаньняў тав. Валайтэса.

Наколькі я ўцяміў, прачытаўшы прывезены ім часопіс, ён і яго кампанія вінавацяць нас, украінцаў і кіргізаў у тым, што мы ня йдзем за імі, а йдзем за Комуністычнай партыяй, а ў асобку, па шляху вызначаным тав. Сталіным у пададзеным вынятку. Я падкрэсьліваю яшчэ раз, што той кірунак, які мы ўзялі, правільны, і мы будзем праводзіць яго надалей. Крытыка тав. Валайтэса, які на чужых гонях ні чорта не разумее, нас не саб'е з дарогі, а павядзе да новых і новых дасягненьняў. Яшчэ больш падмацоўваюць мяне ў гэтым словы тав. Крыніцкага, які сказаў, што ўвага партыі зьвернута на тое, каб стварыць спрыяючыя ўмовы для будаваньня новае культуры. Яшчэ раз кажу, што толькі разам з Комуністычнай партыяй, пад яе кіраўніцтвам мы здолеем будаваць новае жыцьцё.

Тав. Крыніцкі сказаў, што большасьць маладнякоўцаў—беспартыйныя. Я ня ведаю, чаму гэта так: у „Маладняку" 70% сяброў—партыйцаў і комсамольцаў.

Кажучы аб далейшай практычнай працы, трэба зазначыць, што мы ня будзем затыкаць дзіркі ў старой літаратуры, а будзем тварыць актыўна і сьвядома новую.

У сучасным становішчы мы бачым вялікую зацікаўленасьць да мастацкай літаратуры. Найбольш характэрна сьведчаць аб гэтым учарайшыя весткі з вёсак („Сав. Бел." ад 25-XI-25 г.). Калі ўспомнім, што нам казалі ў пачатку—„Маладняк ня дасьць нічога новага", калі параўнуем з тым, што ёсьць цяпер,—дык і гаманіць шмат ня трэба. Можна глянуць, як распаўсюджваюцца маладнякоўскія творы—нарасхват купляюць іх. Тлумачыцца гэта, бязумоўна, іх мастацкасьцю, іх вытрыманасьцю.

Канчаючы, я вярнуся яшчэ раз да інтэлігенцыі. Тав. Крыніцкі падзяліў інтэлігенцыю на тры катэгорыі. Ня ў гэтым справа—можна падзяліць і на дзьве, можна падзяліць і на дзесяць. Але ў яго катэго-

рыях ня бачу аднэй—калі тры, дык чацьвертай—чорнай сотні, якая вывучыла (пэўна са сьлязьмі на вочах) беларускаю мову, якая „тоже“ творыць беларускую культуру—гэта і тыя самыя „гармадзяне“ са Слуцку, і ім падобныя, якія яшчэ бадзяюцца на нашых абшарах.

Тав. Крыніцкі сказаў, што мы павінны зьвярнуць увагу на 3-ю катэгорыю, каб не абражаць яе, ня крыўдзіць, а ўцягваць у працу. Гэта думка адпавядае агульнаму становішчу рабоча-сялянскай краіны, запатрабаваньням сёнешняга дня, і мы будзем выконваць яе з усёй энэргіяй і шчырасьцю, якая заўсёды была з намі.

Старшыня. Слова мае т. Сяргейчык.

Тав. Сяргейчык. Тав., сёнешні дзень я лічу сьвятам. Даклад тав. Крыніцкага даў нам магчымасьць чытаць напісанае між радкоў. Заслухаўшы даклад і добра ведаючы настроі працоўных мас і сялянства, мы сьмела можам адказаць, што працоўныя масы ня пойдуць за такімі організацыямі, аб якіх гаварыў т. Крыніцкі. Рабочая кляса ў нас служыць прыкладам і вядзе за сабою шырокія гушчы сялянства. Мы мала зварочвалі ўвагі на серадняцкія і кулацкія элемэнты, спадзяючыся, што нам яны нічога ня могуць зрабіць. Цяпер мы бачым, што кулацкая група інтэлігенцыі ставіць прад сабою адпаведныя контр-рэволюцыйныя заданьні, і нам, маладнякоўцам, трэба зьвярнуць увагу на гэтую групу слуцкіх інтэлігентаў з тым, каб іх шкадлівая праца не адбівалася на вёсках і гарадох нашае Рэспублікі.

Старшыня. Слова мае т. Валайтэс.

Тав. Валайтэс. Я думаю, таварышы, што з дакладам тав. Крыніцкага трэба згадзіцца, але, таварышы, я толькі тры пункты адзначу, спынюся на пытаньні, якое зьяўляецца бадай што спрэчным і на якім тав. Крыніцкі ня спыніўся. Пакольні ён зачапіў яго павярхоўна, мне прыдзецца спыніцца якраз на пытаньні, што такое культура нацыянальная, падругое, у вадносінах да спэцаў, калі гэта расшыфраваць, то гэта азначае ў адносінах да папутчыкаў і, трэцяе, адносна рабоча-сялянскай ідэолёгіі. Аб гэтым тут адзін з таварышоў, ня помню прозьвішча, здаецца т. Дубоўка, гаварыў, што да Беларусі вымаганьні павінны быць зусім іншыя, чым да высока разьвітых краін. Карл Маркс у 40-х гадох сказаў наступнае: „вы павінны перажываць 15—20—50 год грамадзянскай і міжнароднай войнаў, каб ня толькі зьмяніць адносіны, але і для таго, каб зьмяніць саміх сябе, каб маглі палітычна панаваць“. Гэта было сказана ў адносінах да Нямеччыны. Маркс гаварыў, што 50 год мы павінны саміх сябе перавыхоўваць і дзеля гэтага, калі мы гаворым аб Беларусі даволі адсталай, Беларусі сялянскай, дык мы больш запатрабаваньняў, як у Нямеччыне, прад'яўляць ня можам.

Само сабой зразумела, што організацыя „Маладняк“ іграе надзвычайна вялікую ролю, і таму тут мы можам гаварыць аб тэндэнцыях, аб ухілах яго, і калі гавораць аб організацыі Усесаюзнай асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў і таварышу няпрыемна чуць, дык можна сказаць, што на злодзеі шапка гарыць, таму што ён узяў гэта ў адносінах да сябе. Мы павінны адзначыць, што сярод некаторых літаратур: украінскай, беларускай, кіргіскай, карыстаецца посьпехам агульна-нацыянальная літаратура па сутнасьці рэакцыйная, не патрэбна хаваць, што яна зьяўляецца опортуністычнай і ліквідатарскай. З гэтымі іншымі літаратурнымі ўхіламі нашай нацыянальнай літаратуры, таварышы, прыдзецца і прыходзіцца весьці ўпартую барацьбу. Тут сказана (нават не паказана імя) аб тым, што на Беларусі сярод літаратараў маюцца такія тэндэнцыі агульна-нацыянальнай літаратуры, т-е. літаратуры ня клясавай. Мы, таварышы, у Маскве азнаёміліся падра-

бязна з справаздачай пленуму „Маладняка“ і павінны сказаць: „Маладняк“—організацыя баявая, организацыя, якая ідзе па тым самым шляху, па якім ідзе і МАПП. Само сабой зразумела, што разам з разьвіцьцём літаратуры і культуры „Маладняк“ у свой час пабудуецца таксама ў організацыю, якая ў сучасны момант ёсьць МАПП і ВАПП. Я хачу адзначыць што мы, напрыклад, з вялікай прыемнасьцю ў 9 нумары „Октября“ надрукавалі адрывак з поэмы т. Чарота „Босыя на вогнішчы“. Гэта даказвае, што беларуская літаратурае дае такія творы, якія цэняцца ў саюзным маштабе і заслугоўваюць пракладу на іншыя мовы ня толькі СССР, але і замежныя. Таварышы, ня можа быць ідэолёгіі рабоча-сялянскай; бо што такое ідэолёгія рабоча-сялянская? Гэта не марксыцкая лёгіка, затым што ідэолёгію сялянскую мы не прызнаём, ·ідэолёгіі сялянскай няма. Яна ёсьць, але гэта ідэолёгія дробна-буржуазная, мы можам гаварыць толькі аб ідэолёгіі рабочай, пролетарскай.

Таварышы, вельмі шкода, што ў ВАПП не ўваходзіць „Маладняк“, але гэта організацыя агульна-нацыянальная і пажадана было-б, каб „Маладняк“, як такі, далучыўся да нашай пляцформы, увашоў у нашу організацыю і тады будзе лягчэй змагацца як з унутранай, так і з надворнай эміграцыяй. Я хачу яшчэ зазначыць на спрэчнае пытаньне, на якім тав. дакладчык спыніўся,—гэта ў адносінах да спэцаў. Я думаю, што таварыш дакладчык узяў церасчур мэханічнае разьвязаньне гэтага пытаньня, ён паставіў гэта пытаньне аб спэцах, наогул, але-ж спэцаў інжынэраў, дактароў, іх можна прымусіць працаваць пры дапамозе розных мэтодаў, пры дапамозе вышэйшых акладаў; як мы ведаем, у час грамадзянскай вайны інжынэраў прымушалі будаваць масты пры дапамозе бізуна. Мост інжынэр можа пабудаваць і для буржуазіі, і для белагвардзейшчыны, і для Чырвонай арміі, калі будзе над ім надзор. Інжынэр можа пабудаваць мост, калі яго прымусяць, але калі мы ўжо пераходзім да такіх спэцаў, як пісьменьнік, літаратар, тут пытаньне такое становіцца: пісьменьнік-жа, як мы ведаем, піша ня толькі пры дапамозе разумовых здольнасьцяй, сюды ўваходзяць яшчэ і другія элемэнты, і загэтым мы ня можам ад буржуазнага пісьменьніка патрабаваць і жадаць, каб ён адразу пачаў пісаць і даваць такую продукцыю, якая-б была карысна для СССР рабочай і сялянскай масы, загэтым тут патрэбна мець іншы падыход. Тут, таварышы, патрэбна зазначыць на адносіны самога тав. Леніна. Вельмі шкода, што няма з сабою кніжкі, але я пастараюся напамяць сказаць: таварыш Ленін у гутарцы з Кларай Цэткін у вадносінах да спэцаў літаратуры, да спэцаў мастацтва, сказаў наступнае: што я ад душы ненавіджу іх, але паколькі ў нас няма сваіх спэцаў мастацтва і літаратуры, то нам прыходзіцца імі карыстацца, але ён выразна робіць тут разьмежаваньні. Вось, таварышы, тыя тры ўвагі па дакладу тав. Крыніцкага,—г. зн. рабоча-сялянская ідэолёгія, больш дакладнае азначэньне, што такое культура нацыянальная і адносна спэцаў. Я зараз скончу свае слова і зазначу на наступныя задачы, якія стаяць перад „Маладняком“; гэта, папершае, „Маладняк“ павінен будавацца па адзнаках масавай організацыі і, само сабой зразумела, рабкоры і селькоры павінны быць галоўным рэзэрвам для вашай організацыі. Патрэбна перасьцерагчы вашы асобныя небясьпекі, якія спатыкаюцца ў організацыі, калі ў вагоне дырэкторыя, а пад вагонам тэрыторыя. Трэцяе пытаньне—гэта каб іменна організацыя „Маладняка“ не замыкалася толькі ў Беларусі, у яе межах. Іменна тут „Маладняк“ не павінен зачыняць дзьвярэй перад нацыянальнымі меншасьцямі Беларусі: яўрэямі, палякамі і іншымі нацыянальнасьцямі, якія ёсьць.

Старшыня: Слова мае тав. Гадзінскі.

Тав. Гадзінскі *(гаворыць паукраінску):* Я хачу ў некалькіх словах даць параўнаньне тых умоў, якія існуюць на Беларусі ў літаратурным становішчы і на Украіне, аб якіх нам гаварыў наш тав. Валайтэс. Я, прыехаўшы на ваш зьезд з Украіны, павінен сказаць, што літаратурныя ўмовы ў нас, на Украіне, больш складаныя, чым на Беларусі, я так думаў да гэтага зьезду. Цяпер я бачу, што гэта наадварот і прычыны наступныя: на Украіне мы ня маем такога становішча таму, што там слупы украінскае контр-рэволюцыі, як Вінічэнка і інш., знаходзяцца за кордонам. Нам пасьля Кастрычніка была база для літаратуры без шкадлівых элемэнтаў, якія эмігравалі заграніцу. У вас-жа, можна сказаць, літаратурнае эміграцыі стаўпоў (правадыроў) контр-рэволюцыі няма. Апрача таго, пасьля Кастрычнікавай рэволюцыі наша украінская інтэлігенцыя выявіла сваю політычную фізыономію на 60% і нават такія пісьменьнікі, як Максім Быльскі і г. д., якія працавалі для рэволюцыі, працуюць і цяпер разам з Савецкаю ўладаю.

У беларускай літаратуры такія пісьменьнікі, як Колас, Янка Купала, усё яшчэ маўчаць і не выяўляюць свайго політычнага я. Я звярочваюся да тэй часткі інтэлігенцыі, якая яшчэ ня выявілася. Прышоў час паказаць сябе з боку політычнага. За тою групаю, якіх дакуманты чытаў нам тав. Крыніцкі, сяляне ня пойдуць. Цяпер, таварышы, ня час маўчаць, трэба проста і адважна сказаць: „выявіце, т., калі ласка, сваю політычную фізыономію". Мы даўно ўжо чулімастацтва для мастацтва, мы-ж гаворым, што літаратура—гэта агульна, клясавае заданьне. Адносна моцы беларускае літаратуры, адносна багацьця я не памылюся, калі скажу, што тую барацьбу, якую вядзе „Маладняк", ён яе правядзе да перамогі. Няпраўду казаў тав. Валайтэс, што „Маладняк" прыцягвае папутчыкаў. Тав. Валайтэс сам быў першым ворагам папутчыкаў у ЦК РКП і, не правёўшы сваёй лініі, праваліўся са сваімі папутчыкамі. Вось некалькі слоў, якія я хацеў сказаць адносна Валайтэса і па дакладу тав. Крыніцкага.

Тав. Мазуркевіч: Кожнае выяўленьне мае пад сабою якуюнебудзь базу, і калі мы з заслуханага дакладу тав. Крыніцкага выявілі частку нашае інтэлігенцыі, то тут мы маем ведамы прыметны контррэволюцыйны ўхіл. Нам прыдзецца падкрэсьліць словы тав. Крыніцкага, што такі ўхіл, такая інтэлігенцыя зьяўляюцца вельмі шкадлівай у савецкай рэспубліцы. Нам трэба пашкадаваць, што частка нашае інтэлігенцыі адрываецца ад нашага культурнага будаўніцтва. У гэтым напрамку перад „Маладняком" стаяць вялікія задачы ў барацьбе з такой ідэолёгіяй. Нашы заданьні—распаўсюдзіць нашыя творы сярод сялян і рабочых. І я пэўны, што бядняцкія элемэнты пойдуць за Комуністычнай партыяй. Прадстаўнік ВАПП'у гаварыў нам аб выпраўцы ідэолёгічнай лініі. Я проста заяўляю, што ў літаратуры мы будзем вясьці тую ідэолёгічную лінію, якую вялі да гэтага часу пад кіраўніцтвам Комуністычнае партыі. Тав. з ВАПП'у заўважыў, што „Маладняк" вядзе політыку прыгнечаньня нацыянальных меншасьцяй. У нас ёсьць непаразуменьні з ВАПП'ам, але, каб мы праводзілі такую політыку,—гэта няпраўда. Мы стараемся ўзяць кіраўніцтва над тымі інтэлігентамі, якія хочуць працаваць над будаўніцтвам пролетарскае культуры. Тых, якія імкнуцца ў сваёй творчасьці да старога, да выяўленьня дробна-ўласьніцкіх поглядаў, мы будзем гнаць. Мы ўжо маем сваю літаратуру, якая заняла пачэснае месца, і надалей мы будзем яе тварыць і карыстацца ўказаньнямі Компартыі.

Тав. Іогансэн *(прадстаўнік ад Украіны, гаворыць паукраінску):* „Маладняк", таварышы, як выявілася з прывітаньняў праводзіць тую

лінію ў сваёй літаратуры, якую праводзім і мы на Украіне, і, бязумоўна, нашая лінія правіловая. Аб гэтым гаварыць ня прыходзіцца, але калі выступіў тав. Валайтэс, які выступае на ўсіх зьездах у якасьці гумарыстага, дык трэба сказаць, што нашым маладым пролетарскім сілам літаратуры страшэнна трудна бароцца з буржуазіяю, інтэлігенцыяю ў адносінах да мастацкай творчасьці. Так што, тав. Валайтэс, хто не разумее мясцовых умоў і мінулага літаратуры, той не зразумее і новага і ня можа атрымаць, як вы, прозьвішча спэца ўсіх літаратур. Гаварыць аб тым, што „Маладняк" уступіць да ВАПП'у, ня прыходзіцца, пакуль нам ВАПП ня прышле другога прадстаўніка, замест тав. Валайтэса. *(Овацыя).*

Тав. Касьпяровіч: Як гаварыў таварыш з цэнтру, нам цікава выясьніць свой сьветапагляд па дакладзе. Выказалася сёньня шмат т. і т. з ВАПП'у, і дарма толькі тут было адзначана, што гаварылі т. т. не па дакладзе. З погляду заданьняў „Маладняка" я лічу, што ўсё было па дакладзе, усё мела адносіны да заданьняў „Маладняка". Тав. Крыніцкаму, які першы выступаў і характарызаваў інтэлігенцыю, адносіны да маладнякоўцаў партыі, мы вельмі ўдзячны. Па шляху, які здабылі сабе маладнякоўцы ў працягу організацыі, мы і далей будзем ісьці. Запытаўшыся, куды мы ідзем, я сьмела адказваю, што ўсе мы йдзем па шляху Компартыі. Тав. Крыніцкі адзначыў ужо наш вялікі ўплыў на сялянства. Яно йдзе насустрэч нам, а ня з тымі інтэлігентамі, аб якіх гаварылася. Калі ёсьць сярод сялянства і няпрыхільныя адносіны, дык іх можна бачыць у заможна-кулацкіх элемэнтах. Такім чынам, нам у першую чаргу прыдзецца зьвярнуць увагу на нашу соцыял-дэмократычную інтэлігенцыю ў горадзе і на русыфікатарскія элемэнты на вёсцы. Нашы задачы больш складаныя, чымся думаюць. Нашая організацыя літаратурная, а літаратурная цяпер распадаецца на розныя кірункі. Расійскае мастацтва ў аднэй сваёй частцы складаецца пераважна з элемэнтаў буржуазных. Ясна, што мы, аднак, павінны дагаварыцца з расійскім аб'яднаньнем пісьменьнікаў і хоць мы менш зварочвалі на гэта ўвагі, дык яны павінны нас паклікаць і ўцягнуць у сваю працу. Мы павінны павялічыць лічбу сялянскіх корэспондэнтаў.

Ужо т. Дубоўка выясьніў аб 4 групах інтэлігенцыі. 4-я група ёсьць, яна ёсьць ня толькі ў Случчыне, а нават у нашых акругах, Полацку, Менску і г. д. Хоць яны, можа, і карысталіся аўторытэтам, але аўторытэт гэты быў зусім другога гатунку. Каб выявіць усе моманты па дакладзе, нам прыдзецца затрымацца на дыскусіі з ВАПП'ам. Мы лічым, што такая пастаноўка пытаньня аб беларускай і іншых літаратурах зьяўляюцца ганебнаю для нас, і калі таварыш нам радзіць далучыцца да ВАПП'у, што мы ня йдзем па шляху пролетарскае ідэолёгіі, то я скажу, што гэта толькі байка: мы ідзем па лініі, акрэсьленай Комуністычнай партыяй. Гэта павінна быць разабрана камісіяй, якая будзе апрацоўваць рэзолюцыю па дакладзе. Трэба нам сказаць, што ніякага прыгнечаньня другіх нацый у нашай літаратуры няма, і ў далейшай працы мы будзем ісьці пад сьцягам вызваленьня і роўнасьці.

Тав. Шукайла: Дакладчык вельмі характэрна адзначыў тыя тры групы, на якія падзяляецца наша інтэлігенцыя. Калі хто з вас чытаў артыкул Трамповіча, дык бачыў, што праз увесь зьмест праходзіць тая думка, што адраджэньне беларускай нацыянальнай культуры павінна праводзіць інтэлігенцыя. Гэта вялікая памылка, агляд якой мы павінны зрабіць тут і ахарактарызаваць, крытыкаваць лягер такіх інтэлігентаў. Гэта зусім другі лягер, чымся мы бачылі ў Случчыне. Мы бачым, што гэты рух ня выказвае думку сялянскай гуш-

чы—гэта рух часткі беларускае інтэлігенцыі 4 разраду, і правілова зазначыў т. Крыніцкі, што рух гэты нацыянальна-дэмократычнага пахаджэньня. Тут ёсьць думкі монархічныя, як—бі жыдоў і г. д. Інтэлігенты-дэмократы адносяцца не да 2-3 групы, а імення да 4, і яны знаходзяцца ня толькі ў Слуцку, але і ў Менску, Калініншчыне, Полацку і г. д. Нам трэба з такой інтэлігенцыяй праводзіць актыўную барацьбу. Тут мы заслухалі прадстаўн ка ВАПП'у і МАПП'у і чулі, што нашая літаратура, а таксама і украінская, а гэта зазначаў афіцыяльны прадстаўнік т. Валайтэс, мае толькі нацыяналістычны кірунак. Тав. Валайтэс, вызначаючы такі характар нашае літаратуры, ні на чым фактычна не абасноўваецца. Яшчэ адно важнае пытаньне ў адносінах організацыі. Мы бачым, што нас заклікаюць да ВАПП'у, каб аб'яднаць літаратурныя сілы. Т. Валайтэс, мы два гады вялі сваю організацыйную працу і зусім вас ня бачылі, за такі тэрмін мы акрэплі і не баімся сваёй залежнасьці ад ВАПП'у і можам таксама абходзіцца без яго. *(Овацыя).*

Тав. Ганчарык: „Маладняк" нарадзіўся нядаўна, і затым тыя элемэнты яго працы, якія стаялі ў пачатку працы, стаяць і цяпер: організацыйны і творчы бок. Памылкі, якія ёсьць і могуць здарыцца, я тлумачу тым, што ў нас праца павінна была праводзіцца ў цэлым колектыве больш актыўна, і яе трэ' праводзіць у трох галінах: організацыйнай, выхаваўчай і па выяўленьні творчых маладых пролетарскіх сіл. Організацыю нашу цяпер можна лічыць моцнаю. Выхаваўчую працу мы павінны вясьці між сабою, выяўляючы разам з тым воблік тэй інтэлігенцыі, якую падзялялі на 4 групы і якая фактычна падзяляецца на 2 групы. Адна група, якая адпала ад жыцьця, і другая група, якая выхавалася на нашым грунце, нашай пролетарскай ідэолёгіі. Можа гэта трохі і ня тычыцца дакладу, аднак я зазначу, што тут з т. з ВАПП'у вышла блытаніна ў разуменьні, што ў нашай літаратуры ёсьць нацыянальна-дэмократычныя памылкі; такія элемэнты, бязумоўна, ёсьць, мы самі разумеем, і мы павінны з нацыянальна-дэмократычнымі элемэнтамі змагацца. Тав. з ВАПП'у думае зрабіць падзел нашае літаратуры і раскалоць яе на пролетарскую і сялянскую. Тав. з ВАПП'у, мы ня думаем так рабіць, і сяляне і пролетары Беларусі будуць будаваць літаратуру пад сьцягам пролетарскае ідэолёгіі, а дзяліцца мы ня будзем. Т. т., „Маладняк" можна параўнаць з маладою нявестаю, да якой падвярнуўся багаты жаніх ВАПП, як ён сам сябе лічыць, але які мала вядомы, калі судзіць па выступленьні таварыша з ВАПП'у. Зразумела, што такога жаніха мы ня прымем, і надаль будзем ісьці па шляху, вызначанаму Компартыяй і пад яе кіраўніцтвам. *(Овацыя).*

Тав. Міхась Чарот: Многа гаварылася зусім не па дакладзе т. Крыніцкага. Закранаді пытаньні, якія яшчэ будуць разглядацца. Па дакладзе т. Крыніцкага я хачу зьвярнуць увагу на адно становішча—на Слуцкую організацыю, вядомую контр-рэволюцыйную організацыю, якая зьявілася на 8-ай галавіне рэволюцыі. На гэтай організацыі мне хочацца спыніцца. Тут, як вы ведаеце, падкрэсьлівалі, што такая організацыя ня мела карэньняў сярод працоўных мас. Слуцкая інтэлігенцыя, якая складала організацыю, як было адзначана, належыць да 4 разраду інтэлігенцыі і яна мела на сваёй увазе, як казаў т. Крыніцкі, Якуба Коласа, які працуе тут у Менску і добра нам вядомы. Такая контр-рэволюцыйная організацыя закранула імя нашага вялікага поэты. Якая тут прычына, над чым нам трэба задумацца? Чаму так сталася? Я гавару, што сталася гэта таму, што частка нашай інтэлігенцыі ня выявіла яшчэ свайго політычнага твару, і зусім зразумела, што сёньня мы бачым, што організацыя чыста контр-рэволюцыйная

можа спыніцца на т. Коласе. Такая арганізацыя польскае дэфэнзывы для нас ня страшна. Мы бачылі не такія арганізацыі, а Якуб Колас тут ні пры чым. І інтэлігенцыя толькі мела моральную падмогу ссылацца на яго. Калі ў артыкуле Трамповіча ён хоча працаваць з Компартыяй, то Слуцкая арганізацыя мае другія мэты, і нам, я кажу яшчэ раз, такая праца нам ня страшна. Мне хочацца спыніцца на прамове тав. Валайтэса. Мне здаецца, што ён хоча праводзіць неправіловую лінію ў мастацкай літаратуры народаў, вызваленых Кастрычнікам, і такі ў яго падход на ўсіх канфэрэнцыях і зьездах, дзе ён толькі прысутнічае. Вы, т. Валайтэс, абвінавачваеце нас у аполітычнасьці. Я разумею, што вы больш аполітычны, чым мы, і мы з вамі да гэтага часу, к вялікаму жалю, не маглі паразумецца. Вы гаворыце аб нашых папутчыках, а ці ведаеце вы хоць адзін твор беларускі, ці ведаеце вы хоць аднаго нашага песьняра, я не гавару ўжо аб прозьвішчы, вы проста ня ведаеце нашых умоў. Мы ведаем добра вашых папутчыкаў, як Андрэя Белага, Салагуба, і каб з імі раўнаць нашых папутчыкаў, трэба прачытаць іх творчасьць, а розьніца між імі ёсьць вялікая. Калі мы будзем разглядаць нашых пролетарскіх пісьменьнікаў, то трэба сказаць, што яны большаю часткаю пісьменьнікі сялянскія, а таго т. Валайтэс ня ведае. Так толькі можна ставіць пытаньне. У нас задача—паставіць літаратуру на пролетарскую ідэолёгію і выкрысталізаваць яе. Нашы маладнякоўскія творы зьяўляюцца маладымі творамі, і раўняць іх з творамі вашай літаратуры можа яшчэ і рана. ВАПП хоча, каб наша арганізацыя была масаваю, такою яна ёсьць і сёньня. Мы бачым пастановы і прывітаньні ад рабочых і сялян, якія сьведчаць аб нашай працы. Канчаючы я хачу сказаць, што ў арганізацыі, аб якой ня трэба было гаварыць, ёсьць такі асобны пункт на парадку працы і нам трэба, каб усе пролетарскія сілы Саюзу Рэспублік бязумоўна зьліліся ў адну, каб нам лягчэй было змагацца з дрэннымі ўхіламі ў поэзіі. „Маладняк“ чакае ад вас, т. Валайтэс, пачыну: вельмі шкода, што вы ў сваіх артыкулах зашлі недалёка і шмат мыляецеся.

Старшыня: Рэглямант закончаны і заключнае слова таварыша Крыніцкага заслухаем мы пасьля паўдня. Зьявіцца трэба на пасяджэньне ў $5^1/_2$ гадзін.

## Пасяджэньне 2.

*Заключнае слова тав. Крыніцкага.*

Таварышы, спрэчкі паказалі вельмі добрую пастаноўку пытаньня аб унутрыпартыйных адносінах сіл, аб уплыве ЛКСМ і беспартыйнай гушчы. Такія пытаньні, пастаўленыя ў шэрагах „Маладняка“, сьведчаць аб тым, што „Маладняк“ разумее тыя шкадлівасьці, аб якіх мы гаварылі. Адмоўнае становіш а спрэчак было тое, што „Маладняк“ у сваіх выступленьнях на зьезьдзе проста выказаў свае адносіны да часткі інтэлігенцыі, якая ня спрые нам. Гаворачы аб палітычных заданьнях „Маладняка“, прыходзіцца затрымацца на тым, што гаварыў поэта Дубоўка. Ён казаў, што за апошнія шэсьць год мы шмат чаго зрабілі ў нацыянальнай палітыцы і іншых галінах нашага жыцьця, літаратуры і г. д., мы нават не чакалі гэтага. Калі-ж, таварышы, мы параўнаем нашы дасягненьні з тымі, што нам трэба, то можна сказаць, што мы зрабілі вельмі мала ў адносінах да нашага агульнага комуністычнага будаўніцтва. У кірунку нашага будаўніцтва „Маладняк“ толькі пачынае працу над справаю культурнага разьвіцьця соцыялістычнай лініі. Ці разумеюць нашы, таварышы, палітычныя заданьні? Праўда, нашыя заданьні разумеюць, але не ва ўсім. Некаторыя таварышы гаварылі аб-

беспартыйнай большасьці організацыі; я даю справку: у організацыі ёсьць беспартыйных 77, ЛКСМ—90, партыйных—26. 26 чалавек партыйных—выстарчаючая лічба. 90 ЛКСМ вельмі вялікая лічба, каля 45%. Ня трэба забываць, што ЛКСМ ня партыя. ЛКСМ вялізарная грамадзянская організацыя, культурная-політычная, якая ў сваіх шэрагах някепска выгадоўвае моладзь, прыбліжае яе да Комуністычнай партыі, гэта—школа кандыдатаў і сяброў партыі. Праўвялічваць значэньне іх ня трэба, можа быць пераацэнка сваіх сіл. Матэрыялізм, Ленінізм, барацьба політычная жадае ацэнкі і правіловай ацэнкі сваіх магчымасьцяй без абмылак. Вялікая нагрузка і другія спэцыфічныя рысы ЛКСМ не пазваляюць партыйнаму ядру зрабіць гэтую організацыю роўнай Компартыі. Нам ня трэба пераацэньваць і памяншаць апаскі ў асяродку „Маладняка", а такая апаска ўзрастае, яна ёсьць. Тав. Шукайла гаворыць, што мы крэпкія, не баімся і г. д. Ён вельмі храбры, і гэта ёсьць пераацэнка сіл. Я думаю, што „Маладняк" яшчэ ня знаў хваробы росту—але будзе знаць, ён яшчэ не дарос да хваробы росту, але ня міне яго, і калі тав. Шукайла ставіць пытаньне, што мы акрэплі—гэта таксама неразуменьне апаскі. Тав. Валайтэс ставіў пытаньне, каб падзяліць організацыю і г. д. Ня трэба падзяляць на групы пролетарскую і сялянскую. У сялянскай групы ёсьць „прекрасный" настрой, поўнае жаданьне, каб на справе зрабіцца пролетарскімі пісьменьнікамі, такое жаданьне ёсьць, і ў ім ніхто з нас не „сомневается". Добрае такое жаданьне дыктуецца ім той гушчай, з якой яны вышлі і якая на іх робіць уплыў, з чым трэба лічыцца, а не адразу адкінуць. Мы так зрабіць ня можам. Ня гледзячы на іх нават пажаданьні, адкінуць уплыў масы яны ня могуць. У такім напрамку перад „Маладняком" стаяць дзьве задачы вялізарнай важнасьці: 1) выкаваць пролетарскіх пісьменьнікаў, выхаваць сялян і другая задача—трэба рупіцца аб тым, каб глядзець ды не заглядацца, каб не папасьці ў паласу большых перашкод, каб не апынуцца і ня йсьці па коўзкай дарозе. На гэта трэба глядзець. Ня трэба, таварышы, глядзець на „искренность": гэта вялікая памылка, не аб гэтым ідзе рэч. У політыцы стаіць пытаньне не аб добрых думках, а аб тым, што выходзіць. Ня трэба забывацца аб гэтым. Некаторыя таварышы ў спрэчках, як Касьпяровіч, правілова кажуць, што мы маем такія апаскі на кожным кроку, трэба ведаць скрытага ворага, і тав. Сяргейчык, які кажа, што трэба ўмець чытаць між радкоў. Справа тут ня так простая. Мы бачым людзей, якія не адразу ўступілі ў барацьбу супроць нас; ворагі нашыя замацоўваюцца, і такога нашага становішча ня трэба забываць, калі нам гавораць аб тым, што яны хочуць працаваць пад лёзунгам марксызму, ленінізму, матэрыялізму, калі гавораць, што хочуць працаваць пад лёзунгам Компартыі. Такія жаданьні вельмі цяжкія на справе ў выкананьні і трэба шмат вучобы, якой у „Маладняка" якраз не хватае. Трэба пераапрацаваць вялізарныя матэрыялы, матэрыялы старой беларускай літаратуры, якраз літаратуры аполітычнай. Трэба спадчыну буржуазнай культуры пераварыць, каб умець працаваць пад лёзунгам марксызму, комунізму і, толькі перарабіўшы ўсё гэта, вы будзеце мець магчымасьць чытаць між радкоў. Ня трэба гаварыць, патрэбна вялізарная праца. Я хачу затрымацца на нацыянальна-дэмократычных настроях. Тут выказана была думка, што такая організацыя для нас ня страшная, што гэта справа дэфэнзывы, так гаварыў тав. Чарот. Ня так, аднак, абстаіць справа. Організацыя ў Слуцку ня трымалася на шырокіх слоях сялянства, яна зьяўлялася верхам заможнага сялянства супроць дыктатуры пролетарыяту. Такія групы і лініі сярод інтэлігенцыі выдзяляюцца ва ўмовах нэпу, і я не скажу, што яны для нас ня страшныя. Падобныя настроі ёсьць у Ка-

лінінску, Менску, ў заявах паасобных настаўнікаў, інтэлігентаў. Апаска гэта ёсьць і вылілася ў закончаны тып соцыял-дэмократаў. Гэта група інтэлігентаў знаходзіцца чуць не на вяршыне паўстаньня і г. д. Слуцкая група дала толькі нам магчымасьць падняць сярод гэтага скандал. Другая пастаноўка пытаньня тав. Валайтэса. Ён кажа аб тэй пагрозе, якая існуе ў беларускай літаратуры з боку розных эмігрантаў і г. д. Аднак, тав. Валайтэс пераацэньвае апаску эміграцыі. Людзі з эміграцыі, якія знаходзяцца тут, кваліфікаваныя інтэлігенты, працуюць у нас і яны ўсе маюць уплыў соцыял-дэмократычнае тэндэнцыі. Мы знаходзім сярод іх людзей, якія вельмі згаджаюцца з намі; знаходзяцца між імі людзі, праўда, зусім апалітычныя, якія стаяць з боку ад палітыкі. З гэтага боку прадстаўнік ВАПП'у і МАПП'у, які сьцеражэ партыйную лінію, памыліцца. Гэтак пытаньне ставіць нельга, гэта будзе літаратурны фашызм у адносінах да інтэлігенцыі, гэта будзе абмылка ў адносінах да кваліфікаванай інтэлігенцыі. Аб адносінах Якуба Коласа да слуцкіх інтэлігентаў я скажу, што хоць дакуманты ставяць апошняга ў вельмі двухсмысьленае становішча, аднак я згаджаюся з Чаротам, і трэба адзначыць, што Коласу трэба найхутчэй выбрацца з такога становішча. Мы ня думаем, што Колас знаходзіўся з ворагамі Савецкае ўлады. Наш прыхільнік заўсёды знойдзе месца для рознага роду заяў. Становішча Коласа з пункту погляду грамадзянскай думкі немагчымае і трэба як найхутчэй выбрацца з яго. Можна было-б шмат чаго гаварыць аб заявах тав. Валайтэса, аднак я лічу, што гэта не па дакладзе і трэба адлажыць такія спрэчкі на другі даклад.

Тав. Чарот: Таварышы, тут прысутнічае вядомы беларускі поэта Цішка Гартны. Ёсьць прапанова прасіць яго ў прэзыдыум.

*(Цішка Гартны запрашаецца ў прэзыдыум. Па дакладзе т. Крыніцкага прымаецца прапанова: даручыць прэзыдыуму выпрацаваць рэзолюцыю і ўхваліць яе пасьля).*

Тав. Чарот: Тав. Валайтэс просіць слова па асабістай нечарговай заяве. Я думаю, мы можам здаволіць яго, а цяпер, я прачытаю атрыманыя тэлеграмы. 1. Мы атрымалі тэлеграму ад старшыні Саўнаркому т. Адамовіча. Ён шкадуе, што ня можа прысутнічаць у нас, ён шле пажаданьне, каб „Маладняк" мацнеў, разьвіваўся і працаваў у інтарэсах рабочых і сялян і пад сьцягам Компартыі давёў-бы сваю справу да канца. 2. Маскоўская сэкцыя аб'яднаньня пролетарскіх пісьменьнікаў ста дваццаці нацыянальнасьцяй ш е комуністычнае прывітаньне зьезду беларускіх пісьменьнікаў. „Дарагія таварышы, мы верым і спадзяемся, што ваш зьезд дасьць цьвёрды фундамант для творчасьці і ўвядзе літаратуру маладнякоўцаў у рамкі ўсяго Саюзу".

Слова мае т. Валайтэс.

Тав. Валайтэс: Таварышы, дазвольце мне зрабіць адпаведную заяву, каб ня было непаразуменьняў, што прыехаў таварыш з Масквы, які хоча процівставіць Маскву Менску. У партыйным парадку я павінен заявіць, хоць былі пярэчаньні па дакладзе т. Крыніцкага і самы аналіз іх вывадаў гаворыць, што ВАПП і МАПП быццам цёмныя організацыі. ВАПП і МАПП мае сваіх прадстаўнікоў на пасяджэньні ЦК РКП, які не сумняваецца, што між ім і ЦК КПБ ёсьць расходжаньні. Я вельмі шкадую, што я ня мог узяць слова перад т. Крыніцкім. Я хачу дапоўніць, што гаварыў. Я добра ня ведаю расійскай мовы і ня мог выказаць сваіх думак добра. Я не маскаль, не вялікарус, я якраз ваш сусед—літовец. Сам паходжу з Літвы і нядаўна прыехаў з падпольнае працы. Я хачу зрабіць заяву. Тут т. Чарот пазваляе сабе назваць мяне як-бы клоунам, і я лічу, што гэта недапусьціма ў нашым сходзе. Каб гэта было сказана ў адносінах чыста індывідуальных

я можа-б не абразіўся; але калі мяне так абзываюць, як прадстаўніка міжнароднага бюро пролетарскіх пісьменьнікаў,—хоць, праўда, цырк не зьяўляецца ў нас пазорнаю організацыяю, хоць людзі і там працуюць і не нясуць ніякага пазору збоку другіх грамадзян,—але паскольні мяне назвалі клоунам, дык гэты сход ці зьезд можна было-б назваць цыркам. Таварышы, гэта было сказана такім тонам, што мне прышлося абразіцца. Цяпер у вадносінах да папутчыкаў. Зусім неправілова думка, што мы зьяўляемся спэцаедамі. На пасяджэньні ЦК РКП было пастаноўлена, каб з'організаваць фэдэрацыю савецкіх пісьменьнікаў, у якую ўвойдуць усе пісьменьнікі Саюзу ўсіх нацыянальнасьцяй.

Тав. Чарот:—Таварышы, я дам адказ т. Валайтэсу. Не асабіста я пакрыўдзіў таварыша Валайтэса, я ня думаў яго крыўдзіць. Калі я назваў яго клоунам пролетарскае літаратуры, дык меў на ўвазе тое, што зьявілася ў літаратуры ў друку аб ВАПП'е—рэзолюцыю, вынесеную на пленуме ЦК партыі. У мяне і прадстаўленьне такое. Я ведаю, што наша організацыя для іх была невядомай, і ўсё, што было зроблена для ўвязкі нашых організацый, была адна камэдыя.

У гэтым мы праканаліся на першым зьезьдзе, у якім мы прымалі ўдзел. Я сягоньня яшчэ раз падкрэсьліваю, што мы імкнемся ня толькі да сувязі з ВАПП'ам, але і да сувязі з усім сьветам. Аб міжнародным бюро я нічога не сказаў. Калі хочуць з намі дагаварыцца сапраўды, дык мы будзем дагаварвацца. Заўсёды ў ВАПП'е адносіны між „Маладняком“ і другімі нацыянальнымі організацыямі былі ня вельмі добрыя і іх трэба ўладзіць. І калі ВАПП хоча гаварыць з намі як роўны з роўным, мы дагаворымся, а калі не, дык, магчыма, нічога ня выйдзе.

Тав. Гадзінскі: Я павінен констатаваць, што саюз украінскіх пісьменьнікаў два з паловаю гады таму назад хацеў працаваць з ВАПП'ам. Але мы праканаліся, што працаваць разам немагчыма, аб чым мы падалі ў ЦК РКП сваю дакладную пісульку. Такая-ж пісулька была і ад імя „Маладняка“, і мы вышлі ці, правілова будзе, не ўвашлі ў яе. Пролетарскае клоунства ў гэтай організацыі мусіць скончыцца.

Тав. Чарот: На гэтым скончым. Слова для справаздачы аб працы ЦБ „Маладняка“ мае тав. Вольны.

## Пасяджэньне 3.

### Даклад Віцебскае філіі.

Тав. Касьпяровіч: Для таго, што брак часу, я кароценька спынюся на сваёй філіі, якая жыве толькі год. Яна зьявілася ў лістападзе 1924 г., была адчынена А. Дударом. У лістападзе нас было 5 ч., у сьнежні—16, у лютым—18, у сакавіку—24, красавіку—25, чэрвені—30, верасьні—24, кастрычніку—18, лістападзе 1925 г.—25 і к сёнешняму дню, пасьля першае акруговае конфэрэнцыі, лічба павялічылася.

### Справаздача ЦБ „Маладняка“.

Тав. Вольны: Сучасная нам эпоха Кастрычніка абудзіла творчы імпэт да мастацтва працоўных мас. За гэта нам гавораць шматлікія аб'яднаньні мастакоў розных галін мастацтва ў нашых братніх рэспубліках, а таксама і на Беларусі; выяўленьнем гэтага зьяўляецца Ўсебеларускае Аб'яднаньне поэтаў і пісьменьнікаў „Маладняк“, якое зараз ужо пачынае ахопліваць усе галіны мастацтва: літаратуру, музыку, вобразнае мастацтва і тэатральнае.

У гушчах беларускага працоўнага народу хаваецца шмат талентаў, толькі гісторыя мінулага не давала магчымасьці выявіцца гэтым талентам і закрасаваць на ніве роднае культуры. Яны калі і зьяўляліся, дык павінны былі ўбіраць сабою чужыя палеткі, прыкладам чаго

можна прывесьці гэткія імёны: Міцкевіч і Сыракомля (Кандратовіч) з Навагрудчыны. З імем першага польская літаратура ўвашла ў склад сусьветнай, у музыцы імем кампазытара Манюшкі, які даў бясьсьмертнае для польскай музыкі. Беларуская народная мэлёдыя жыла ў закуранай вясковай хаце, тагды як яна была крыніцай творчага натхненьня вялікага поэта і кампазытара. Таго, калі раней беларуская літаратура мела права друкавацца толькі пад відам баўгарскай, гэтага мы зараз ня маем. Кастрычнік даў ёй права называцца сваім уласным імем.

Наша сучасная эпоха характарызуецца словам колектывізм. На Беларусі ўзрост колектыву пісьменьнікаў і мастакоў усіх галін толькі і тлумачыцца рэнэсансам Кастрычніка.

Зараз, калі мы глянем на пройдзены шлях гісторыі „Маладняка", дык заўважым, што на ім вызначаюцца два галоўных кругабегі:

а) організацыйнае аформленьне і ўзрост;

б) узмацаваньне і замацаваньне творчых позыцый.

Кругабег організацыйнага аформленьня і ўзросту „Маладняка" выявіўся:

— у той час, калі 28-га лістапада 1923 году ў ініцыятыўнай жменьцы „Маладняка" было 6 чалавек, сягоньня ў Аб'яднаньні 199 маладнякоўцаў, ня лічачы студыйцаў і шматлікіх маладнякоўскіх гурткоў.

Зараз некалькі слоў аб гісторыі Аб'яднаньня.

28-га лістапада 1923 году ў клюбе КІМ'у сабралася шэсьць таварышоў: М. Чарот, Александровіч, Дудар, Пушча, Бабарэка і Вольны, якія пад сьвет агарку сьвечкі і ўтварылі Аб'яднаньне. Пасьля гэтага на сходы „Маладняка", якія адбываліся ў гасьцяпрыімным пакоіку „Савецкай Беларусі", пачалі загортоўвацца ўсё новыя і новыя маладнякоўцы. У першых шэрагах былі: Трус, Якімовіч, Падабед, Пфляумбаум, Чарнушэвіч, Кузьма Чорны, Алесь Гурло, Зьмітрок Бядуля і іншыя.

Адначасова пачынаюцца захады па організацыі філіі па акруговых гарадох і вёсках у гэты час пашыранай Беларусі і па-за межамі яе. І ўсё гэта пры абсолютнай адсутнасьці матэрыяльных сродкаў.

Першымі з філій, якія організаваліся, былі: Маскоўская на чале з поэтаю Дубоўкам. Калі-ж былі зроблены захады і ўтвораны ініцыятыўныя групы па організацыі філіі ў Віцебску, Полацку і Магілеве, „Маладняк" пачаў звацца ня толькі „Маладняком", а Ўсебеларускім Аб'яднаньнем Поэтаў і Пісьменьнікаў „Маладняк".

Пасьля гэтага было ўтворана часовае Цэнтральнае Бюро, якое паставіла сваім заданьнем організацыю філій па ўсіх акругах Беларусі, распрацоўку статуту і наладжваньне сувязі з нашымі ідэолёгічнымі кіраўнікамі ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ. Адначасова ў „Маладняку" паўстае пытаньне па зьбіраньні творчых маладых сіл іншых галін мастацтва, як, напрыклад, сэкцыя вобразнага мастацтва пры Віцебскай філіі. Пачынаецца плянавая організацыя працы з разьлікам даць найбольшыя выяўленьні індывідуальных здольнасьцяй кожнага маладнякоўца. Пад гэтымі штандарамі і праходзіць першы этап нашае працы. Паўстае пытаньне аб скліканьні першага маладнякоўскага пленуму, які павінен быў, скарыстаўшы практыку нашае працы, накіраваць яе належным далейшым шляхам. Вось тыя радкі, якімі характарызавалася праца „Маладняка" ў організацыйнай галіне на пленуме ЦБ.

Год таму назад зарадзілася нашае Аб'яднаньне з 6 чалавек, якія паставілі сабе мэтаю перарадзіць беларускую літаратуру. „Маладняк" пачаў яе перараджаць, „Маладняк" сваім юнацкім запалам акамсамоліў і амаладнячыў і тых старых пісьменьнікаў, якія ўвашлі ў „Маладняк".

Працаваць нам спачатку было вельмі цяжка. Мы спаткаліся са старою літаратураю, і пачаліся спрэчкі паміж „Маладняком" і старымі пісьменьнікамі за ўплывы і г. д.

Рэволюцыя выбіла глебу з-пад ног старых пісьменьнікаў. Яны путаюцца ў сваіх творах, ня маюць конкрэтнасьці думкі. Некаторыя з іх зусім адарваліся ад новай плыні грамадзкага жыцьця.

Старая беларуская культура вельмі акадэмічная. Інбелкульт утварае культуру акадэмічным шляхам, „Маладняк" гэткім мэтодам не карыстаецца. „Маладняк" практычным шляхам праводзіць у жыцьцё новую маладняцкую культуру.

Старая і новая культуры спаткаліся ня вельмі дужа спагадна адна да другой. Старая культура старалася падарваць маладняцкія ўсходы. Мы не маглі друкавацца. Дзяржаўнае Выдавецтва прынцыпова не згаджалася прымаць да друку нашыя творы. Нашым маладнякоўцам прыходзілася выпускаць зборнічкі сваіх твораў за свае ўласныя грошы. Напр., так быў выдадзены зборнічак вершаў „Комсамольская нота". І толькі як гэты зборнічак хутка разышоўся, ДВБ зьвярнула нам грошы.

Старая наша крытыка была самай нявытрыманай у адносінах да „Маладняка".

Усе гэтыя бойкоты і напады на „Маладняк" рознымі шляхамі з боку прадстаўнікоў старой беларускай культуры прымусілі „Маладняк" пачаць бой „з гарматы па вераб'ёх" і інш.

Матэрыяльныя магчымасьці нашай організацыі былі зусім сумнымі.

Аснова нашай працы да ўтварэньня філій была ў Менску. Менская філія ўзяла на сябе ініцыятыву да організацыі філій ува ўсіх акругах. Гэта было выканана таксама Менскай філіяй.

Цяпер у нас маецца 7 філій, шэраг студый, сэкцый розных галін мастацтва і іншых культурных організацый.

Выхаваўчая праца вялася, галоўным чынам, у Менскай філіі.

Выезды для інструктаваньня кіраўніцтва філіямі ЦБ рабіліся больш-менш частыя.

Цяпер „Маладняк" ужо перарос сябе, як літаратурная організацыя. „Маладняк" сягоньня—гэта маладая організацыя, аб'ядноючая новую беларускую культуру.

Рэзкую лінію ў адносінах да старых культурных дзеячоў нам трэба яшчэ весьці.

### Організацыйная праца.

Ня гледзячы на тое, што „Маладняк" працаваў у цяжкіх умовах без усялякай матэрыяльнай дапамогі, дзякуючы моральнай дапамозе партыі і комсамолу, ім за мінулы год праведзена вялікая організацыйная праца па ўтварэньні маладнякоўскіх філій у вакругах і ўзмацаваньні маладнякоўскага ядра.

Факт росту „Маладняка" за кошт рабочых і сялян за год з 7 ініцыятараў да 200 чал. (апрача студыйцаў), а таксама факты організацыі філій у Магілеве, Віцебску, Полацку, Маскве, Бабруйску, Горках, Барысаве,—говорыць за тое, што „Маладняк" стаіць на правіловым пролетарска-клясавым грунце, увесь час узрастаючы за кошт рабочасялянскіх мас.

Констатаваць, што „Маладняк“ у організацыйных галінах перарос сябе, як літаратурнае аб'яднаньне, што сьведчаць факты організацыі тэатральнай, музычнай і інш. сэкцый пры „Маладняку“.

Ухваліць лінію ЦБ па ўтварэньні пры „Маладняку“ сэкцый нацменшасьцяй на Беларусі.

**Організацыйны плян далейшае працы.**

1. Выявіць у працягу месяца магчымасьці організацыі філій у тых акругах, дзе іх яшчэ няма.
2. Узмацаваць асноўнае ядро „Маладняка“, для чаго спыніць прыём у сябры непасрэдна і пераглядзець сучасны склад „Маладняка“.
3. Правесьці падрыхтоўчую кампанію па скліканьні зьезду „Маладняка“.
4. Узмацаваць працу па організацыі сэкцый: тэатральнай, музычнай, мастацкай і інш.
5. Аб'яднаць усіх пісьменьнікаў нацменшасьцяй, якія стаяць на аднэй з намі ідэолёгічнай пляцформе, шляхам утварэньня пры „Маладняку“ сэкцый: жыдоўскай, польскай, расійскай і інш.
6. Прыняць захады ў пагоджанасьці з Галоўполітасьветай да ўтварэньня маладнякоўскіх літгурткоў, драмгурткоў і хораў пры рабочым клюбе і хаце-чытальні, трымаючы цесную сувязь з рабочымі і селькорамі.
7. Узмацніць інструктаваньне філій. Дзеля гэтага трэба наладзіць перапіску і перасылку літаратуры, а таксама організаваць выезды сяброў ЦБ і пашырыць інформацыі ў друку.
8. Трымаць самую цесную сувязь з адзіночкамі.

Хоць сягоньня не са ўсімі гэтымі палажэньнямі пленуму можна пагадзіцца, але-ж большасьць з іх ажыцьцёўлена, як, напрыклад: організаваны філіі па ўсіх акругах, узмацавана асноўнае ядро „Маладняка“, праведзена ня толькі падрыхтоўчая кампанія па скліканьні зьезду, а і праведзены акруговыя конфэрэнцыі і скліканы першы Ўсебеларускі Зьезд „Маладняка“. Узмацавана праца па організацыі сэкцый: тэатральнай, музычнай і вобразнага мастацтва. Узмацавана інструктаваньне філій:

Папершае—выездамі, якія былі зроблены сябрамі ЦБ у Чэрвень, Барысаў, Магілеў, Полацак, Клімавічы, Крычаў, Чэрыкаў, Гомель, Бабруйск, Клімавічы, Краснапольле і раёны: Клімавічы, Крычаў, Мсьціслаў, Маляцічы, Ворша, Мазыр, Ворша, Віцебск, Полацак, Віцебск, Масква, Барысаў, Слуцак, Гомель, Ворша, Магілеў, Віцебск, Полацак,— разам 35 выездаў, на што трэба было патраціць 105 дзён. Акрамя выданьня старонак і часопісаў, у часе маладнякоўскага выезду было наладжана больш 140 выступленьняў.

Падругое—інструктаваньне праводзілася часовым адкамандыраваньнем сяброў Цэнтральнага Бюро па акругах. Так, былі камандыраваны: у Полацак—Дудар, у Магілеў—Каплан, у Клімавічы—Александровіч, у Горкі—Дубоўка. Акрамя таго, Цэнтр. Бюро дапамагала акругам працаўнікамі. Так, у Полацак быў накіраваны для працы Хурсік, у Клімавічы—Падабед і ў Слуцак—Кузьма Чорны.

Адным словам, ажыцьцёўлены асноўныя палажэньні, вызначаныя першым Пленумам Аб'яднаньня і ў сёньнешні дзень мы стаім перад фактам існаваньня не 6-ці маладнякоўцаў, а 190 і перад фактам не адной філіі, а 12, з якіх некаторыя маюць пры сабе і сэкцыі.

Вось ілюстрацыя агульнага складу „Маладняка“ на сёньня:

| Філіі. | Сяброў | Кандыд. | Студыйцаў | Партыйцаў | Комсамольцаў | Іншых | Рабочых | Сялян | Іншых | У %% |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Менск . . . | 22 | 18 | — | 5 | 17 | 18 | 3 | 24 | 13 | |
| Клімавічы . | 18 | 3 | 86 | 2 | 13 | 6 | 1 | 13 | 7 | |
| Барысаў . . | 12 | 8 | — | — | 12 | 8 | 3 | 11 | 6 | |
| Віцебск . . | 12 | 7 | — | — | 7 | 12 | 2 | 9 | 8 | |
| Полацак . . | 9 | 9 | — | 1 | 6 | 11 | 2 | 11 | 5 | |
| Масква . . | 8 | 4 | — | 6 | 4 | 2 | 2 | 7 | 3 | |
| Бабруйск . . | 7 | — | — | 2 | 2 | 3 | 3 | 3 | 1 | |
| Слуцак . . | 5 | 1 | — | 2 | 3 | 1 | — | 6 | — | |
| Гомель. . . | 2 | 18 | — | 2 | 11 | 7 | 2 | 12 | 6 | |
| Магілеў . . | 2 | 12 | 42 | 2 | 9 | 3 | 1 | 12 | 1 | |
| Мазыр . . . | 2 | 6 | — | 2 | 3 | 3 | — | 5 | 3 | |
| Ворша . . . | 2 | 3 | — | 2 | 2 | 3 | 1 | 3 | 1 | |
| | 101<br>53,2% | 89<br>46,8% | 128 | 26 | 92 | 74 | 20 | 116 | 54 | |

Лічым, што ў контурах першы організацыйны кругабег больш-менш высьветлены; пераходзім да другога кругабегу нашае працы, які можна ахарактарызаваць наступнымі словамі:

**Узмацаваньне і замацаваньне творчых позыцый.**

Кінем вокам на творчыя здабыткі сёнешняга „Маладняка“ два гады назад. Трэба сказаць на нашым маладнякоўскім зьезьдзе праўду: яны былі вельмі мізэрныя; за выключэньнем нашумеўшай „Босых на вогнішчы“, „Завірухі“—Чарота і „Стромы“—Дубоўкі мы больш зборнікаў ня мелі. Мы былі ў творчых адносінах слабымі. Мы ў той час у разьвіцьці сучаснай беларускай літаратуры не сказалі новага „я“. Амаль уся літаратурная сучаснасьць была за прадстаўніцтвам нашаніўскага пэрыоду. Трэба было ўзяцца за паступовую і ўпартую творчую працу, каб унесьці новую мастацкую каштоўнасьць у далейшы росквіт і разьвіцьцё беларусскай літаратуры. Праўда, адразу зрабіць гэта было немагчыма, ды ня толькі гэта ў беларускіх умовах, а і наогул у разьвіцьці кожнай літаратуры.

Трэба было паказаць, што мы прышлі на ніву беларускай літаратуры не для гульні, а для сур'ёзнай працы.

І цяпер, калі прасачыць за паступовым творчым узростам „Маладняка“, трэба сказаць:

Папершае, увесь час у нашай творчай працы адчувалася колектыўная загартованасьць і соцыолёгічна-сучасны і ідэолёгічна вытрыманы зьмест нашай творчасьці. Самы колектыў даваў імпэт для творчасьці як старэйшым, так і малодшым маладнякоўцам. Колектывізм у „Маладняку“ даў свае рэальныя вынікі і ў творчасьці.

Калі два гады таму назад мы бачылі ў беларускай літаратуры з маладых толькі аднаго Чарота, а з літаратурных плыняй—адраджанізм, сёньня-ж мы налічваем каля 40 новых больш-менш выявіўшыхся поэтаў і пісьменьнікаў і таксама тое, што на зьмену адраджанізму прышоў маладнякізм.

Калі мы возьмем тэматыку—мотывы і формальна-мастацкае іхняе ўвасабленьне, дык яно само па сабе рознастайна і новае ў беларускай літаратуры. У ім гучыць сучаснасьць мастацкіх дасягненьняў агульналюдзкай літаратуры, пераплеценай са зьместам, які кідае сьвет на шлях да соцыялізму.

Вось гэта і дало правы грамадзянства на існаваньне маладнякоўскай творчасьці.

Праца ЦБ была накірована ў гэтай галіне так, каб выяўляць таленты і самародкі і даць ім найбольш блізкі шлях для выяўленьня свайго творчага запалу. І ў гэтых адносінах організацыя і існаваньне 12 маладнякоўскіх філій дало магчымасьць дасягнуць гэтага. Праўда, можа мы часам не сьпяшаліся друкаваць першыя творы нашых маладнякоўцаў, але даваліся таварыскія рады, і гэта давала ім магчымасьць працаваць больш над сваім разьвіцьцём і даваць больш каштоўныя творы.

І каштоўнасьць і якасьць твораў палепшылася і паляпшаецца відавочна. Сёньня мы можам прывесьці цэлы шэраг выхаванцаў „Маладняка“, якія толькі ў маладнякоўскім колектыве згартаваліся і выхаваліся. Гэта—поэты Трус, Глебка, Дубовік, Туміловіч, Фамін і г. д. і г. д.

Таварыская самакрытыка „Маладняка“ прымушала кожнага больш працаваць над зьместам і формай сваёй творчасьці. У кожнага з маладнякоўцаў з кожным днём паляпшалася гэтая творчасьць, адначасова яна і павялічвалася. Паўстала пытаньне аб рэалізацыі маладнякоўскай продукцыі і разам з тым пытаньне і аб тым, каб даць рабочым і сялянам танную кніжку. Першыя крокі маладнякоўскага выдавецтва—гэта гісторыя барацьбы „Маладняка“ за сваё існаваньне. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва ў першыя часы катэгорычна адмаўлялася друкаваць і нават чытаць альбо разглядаць маладнякоўскую творчасьць. Друкавацца па поглядзе Выдавецтва маглі толькі патэнтованыя поэты. Сваёй працай, творчым узростам і колектыўнаю сілаю мы заваявалі сабе месца ў мастацкім пляне БДВ, і паступова маладнякоўскія творы пачынаюць друкавацца. За мінулыя часы БДВ маладнякоўскай літаратуры выдадзена на 25 аркушоў.

| | | |
|---|---|---|
| 1. | „Камсамольская нота“ | 1 арк. |
| 2. | „Два“ | 4 „ |
| 3. | „Ваўчаняты“ | 4 „ |
| 4. | „У віры жыцьця“ | 8 „ |
| 5. | „Паўстанцы“ | 1 „ |
| 6. | „Беларусь бунтарская“ | 1 „ |
| 7. | „Па беларускім бруку“ | 2 „ |
| 8. | „Трысьцё“ | 4 „ |

Апрача гэтага, выдаваліся маладнякоўскія часопісі. Але гэта „Маладняк“ не здавальняла. Паўстала пытаньне аб выданьні маладнякоўскай кніжніцы дзеля таго, каб даць магчымасьць выявіць сябе і рэалізаваць сваю творчасьць маладнякоўцу. І пасьля таго, як у красавіку месяцы былі вылучаны, праўда, хоць і невялікія, але ўсё-ж такі

сродкі, ЦБ прыступіла да выдавецкай працы. За мінулыя 7 месяцаў выдадзена 23 кніжкі маладнякоўцаў. Гэта значыць выдавалася амаль што адна кніжка ў тыдзень. Тыраж усёй нашай продукцыі—46.000 экз., кожная кніжка адзін-два аркушы, што разам складае 41 друкаваны аркуш. Іначай кажучы, гэта палова выдавецкага пляну па мастацкай літаратуры Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва на 1926-27 год.

Па назвах маладнякоўская кніжніца выдавалася ў гэткім парадку:

1. Міхась Чарот—выбраныя вершы.
2. Ул. Дубоўка—Там, дзе кіпарысы.
3. Кузьма Чорны—Апавяданьні.
4. Адам Бабарэка—Апавяданьні.
5. Язэп Пушча—Раніца рыкае.
6. Крапіва—Асьцё.
7. Маладняк—Янку Купалу.
8. Сымон Хурсік—Першы паўстанак.
9. М. Зарэцкі—Пела вясна.
10. А. Якімовіч—Вершы.
11. А. Дудар—Сонечнымі сьцежкамі.
12. А. Гурло—Спатканьні.
13. Ул. Дубоўка—Credo.
14. Я. Пушча—Vita.
15. А. Вольны—Чорнакудрая радасьць.
16. А. Александровіч—Сутарэньні.
17. Слуцкія песьняры
18. М. Чарот—Карчма.
19. К. Чорны—Апавяданьні.

ЦБ лічыць, што за сем месяцаў параўнаць сваю выдавецкую продукцыю па мастацкай літаратуры з Бел. Дзярж. Выдавецтвам, гэта буйнае дасягненьне ў нашай працы. Акрамя гэтага, трэба дадаць, што нашу выдавецкую працу ўвесь час тармазіла Бел. Дзярж. В-ва, што відаць з таго, што В-ва ня выканала амаль што ніводнага пункту з нашага дагавору.

Да гэтага трэба дадаць яшчэ і тое, што ў сучасны момант з нашых кніжак, падрыхтованых да друку, шмат яшчэ чакае чаргі ў Выдавецтве і ў Галоўліце. З гэтых кніжак трэба вызначыць пераклады маладнякоўцаў з іншакраёвых моў, як, напрыклад:

1. Пераклад Дуброўскага — „Баляда Рэдынскай турмы“ Оскара Уайльда.
2. Пераклад Дрэйзіна—„Антыгона“ Софокля.
3. Пераклады Гаўрука з нямецкай мовы.

## Вывады.

Першы кругабег „Маладняка“ быў пераважна організацыйны. Па лініі выхаваўчай за мінулы час сябры „Маладняка“ дасяглі шмат чаго. Гэта выявілася на творчасьці ў пашырэньні тэматыкі, удасканаленьні формальна-мастацкага боку. У далейшым „Маладняк“ таксама павінен зьвяртаць найвялікшую ўвагу на сваё выхаваньне. Папершае, гэта павінна выявіцца ў пашырэньні марксыцкага сьветагляду, у грунтоўным азнаямленьні з дасягненьнямі нашых суседніх

літаратур, асабліва ў галіне формальна-мастацкай і, пераважна, у вадносінах да прозы і драмы. Зразумела, што ўсё гэта можна будзе дасягнуць добра толькі тады, калі сябры Аб'яднаньня будуць добра ведаць чужаземныя мовы. Адгэтуль заданьне: да чарговага маладнякоўскага зьезду кожны маладняковец павінен дасканальна вывучыць ня менш, як адну іншакраёвую мову. І гэта заданьне, якое цяпер стаіць перад зьездам, можа быць выканана лёгка, бо ў гэты ўжо час ёсьць у нас, у „Маладняку", больш дзесятка сяброў, якія ведаюць па аднэйдзьве, а некаторыя тры і чатыры іншакраёвыя мовы, аб чым красамоўна сьведчаць пераклады з Шэкспіра, Оскар Уайльда, Гэйнэ і інш. на беларускую мову.

Адначасова паўстае пытаньне аб вывучэньні ўсходніх моў, як грузінскай, армянскай, пэрсыдзкай. Сябры „Маладняка" павінны зьвярнуць яшчэ большую ўвагу на якасьць сваёй творчасьці з тым, каб узьняць беларускую літаратуру на сапраўднае ўзвышша. У выдавецкай галіне наша мэта—даць зразумелы па зьмесьце і даступны па цане твор для комсамольскай, рабоча-сялянскай моладзі, настаўніцтва, інтэлігенцыі і г. д. Надалей у выдавецкай працы трэба імкнуцца побач з паляпшэньнем тэхнікі выданьня да ўдзешаўленьня кнігі. Адначасова трэба зьвярнуць большую ўвагу на выданьне тэатральных твораў, мастацкай прозы і перакладаў сучасных твораў з чужаземных моў. Лічба сяброў у кастрычніку паменшылася дзеля таго, што была праведзена перарэгістрацыя. Адзін сябра выбыў сам сабою і адзін быў выключаны агульным сходам. Я ўжо зазначыў, што ўсіх сяброў было 25 і пасьля першай конфэрэнцыі лічба павялічылася. Калі разглядаць сяброў па сэкцыях, то ў літаратурнай сэкцыі—18 чалавек і ў мастацкай—7. Дзякуючы таму, што пролетарыят і сялянства імкнуцца да творчасьці, наша літаратурная сэкцыя павялічылася 7—18 сяброў. Па асьвеце: вышэйшай асьветы—3 і сярэдняй—22. Па партыйнасьці: на 18 лістапада 6 кандытатаў партыі, ЛКСМ—12, партыйцаў—4 і 3 беспартыйных. У першым паўгодзьдзі было на 1 партыйца менш і на конфэрэнцыі 4 партыйцамі больш. Ад 20 гадоў да 30 ў нашай організацыі ёсьць 15 чалавек, а рэшта старэй 30 гадоў; па соцыяльным паходжаньні мы маем сялян 22 і рабочых—3. Склад нашае філі і паказвае, што трэба зьвярнуць вялікую ўвагу на павялічэньне работніцкага складу філіі. Чаму гэта ня было зроблена? Організацыя нашая яшчэ маладая, яна не разьвярнула сваёй працы як трэба, далей тое, што Віцебшчына была як-бы адарвана ад Рэспублікі, перашкаджала нам у нашай працы. Галоўнае, наша праца насіла выхаваўчы характар. На гэта была зьвернена вялікая ўвага. Усяго адбылося 35 сходаў, бюро — 11, агульных — 16, літаратурнай сэкцыі —5, мастацкае—3. Сходаў бюро было мала дзеля таго, што сябры былі заняты працаю па сваёй профэсіі. На нашых сходах было 48 дакладаў, прысьвечаных разгляду твораў, 12 дакладаў па тэорыі мастацтва і гісторыі. Бюро займалася організацыйнаю працаю. Трэба адзначыць, што намі было рэалізавана 54 творы. Пасьля конфэрэнцыі нам была прадастаўлена газэта для друкаваньня сваіх твораў, адзні-два творы мы можам зьмяшчаць у газэце, а раней гэтага ня было. Літаратурных твораў было надрукавана 33 за 1 год, выстаўлена для публічнага агляду 21 твор, сюды уваходзяць і творы, якія былі на 1 выстаўцы. У Віцебскай філіі быў вялікі ухіл у бок грамадзянскай працы. Мы бралі людзей у філію з масы, сярод якіх і вялі выхаваўчую працу. Усіх выступленьняў філіі было 58, з якіх 31 было ў вёсцы і 19—у горадзе. Мы імкнуліся вясьці падрыхтоўку рабочых мас у горадзе. Зроблены 21 даклад аб „Маладняку", пасьля-ж дакладаў чыталіся тво-

ры маладнякоўцаў. Было організавана 2 экспэдыцыі па фольклёру, 2—па орнамэнту. Было сабрана каля 500 казак, песень, 5 альбомаўзарысовак. Гэтая праца ішла разам з мясцовымі організацыямі краязнаўства. Там было надрукавана некалькі брошурак, і наогул у краязнаўчым таварыстве мы, таварышы, мелі больш магчымасьці друкаваць, чым у другіх організацыях. На нашай акруговай конфэрэнцыі вышла непаразуменьне. Наш сход, які адбываўся ў лістападзе, залічылі за конфэрэнцыю. Праца падрыхтоўчая да конфэрэнцыі была ўжо закончана і мы парашылі склікаць яе. На конфэрэнцыі нашай было шмат прывітаньняў ад акруговага партыйнага камітэту і ад гасьцей. Увечары 18 лістапада ў нас было 137 чалавек, 19-га раніцою—63 і вечарам 19-га—328. Гэта тлумачыцца тым, што мэтаю гэтага вечару мы зрабілі выступленьне, і калі вылічыць тых, якія прышлі на спэктакль, астаецца 100 чалавек. Наша конфэрэнцыя паказала, што маладнякоўская філія ў Віцебску сур'ёзная. Конфэрэнцыя выявіла шмат добрага. У нас ёсьць сэкцыі, у якіх налічваецца да 100 чалавек, што паказвае, што моладзь імкнецца да нас. Філія „Маладняка" ў Віцебску, трэба адзначыць, вядзе змаганьне з рознымі элементамі, шкадлівымі для агульнага будаўніцтва, і правілова разумее тую партыйную лінію, аб якой гаварыў т. Крыніцкі. Яна мае вялікае моральнае значэньне ў утварэньні сувязі між рабочымі і сялянамі, і вядзе сваю лінію ў тым кірунку, каб ня было ў акрузе такіх здарэньняў, якія мы бачым у Случчыне. Сувязь з ЦБ была, можна лічыць, выстарчаючаю.

## Справаздача Менскай філіі.

Тав. Пушча: Калі мы параўнаем Менскую філію з іншымі, то пабачым вялікую розьніцу. Мы весь заўтра будзем сьвяткаваць 2-х гадовы юбілей „Маладняка", гэта будзе разам і юбілей Менскае філіі. Яна зьяўляецца самай старэйшай філіяй у Аб'яднаньні і, бясспрэчна, як старэйшая, павінна быць і самай моцнай ад іншых. Так яно і ёсьць. Я не хвалюся гэтым, але яно так і ёсьць; гэта відаць было з справаздачы і ЦБ. Усяго, што было зроблена ўсім Аб'яднаньнем, бясспрэчна, што большая частка прыпадае на Менскую філію. Прычынаю гэтага асабісты склад філіі. Менская філія налічвае 75 чалавек: 22 сталых сяброў, 18 кандыдатаў і 35 студыйцаў. Студыйцы складаюць дзьве студыі: адна пры часопісі „Чырвоны Сьцяг", другая пры комуністычным унівэрсытэце. Калі таварыш тут гаварыў, што ёсьць студыі па 100 чалавек, дык, бязумоўна, такі лік студыйцаў у ваднэй студыі зусім немагчымы. Менская філія прымала ў студыю толькі такіх, якія ведаюць што-небудзь, ад якіх можна спадзявацца карысьці ў галіне творчай, бяздарнасьцяй ня прымала, аб гэтым гаворыць нам практыка і мінулага. Год працы ў студыі пры політэхнікуме даў належныя вынікі. Адно апавяданьне—„Зоська" было там напісана колектыўна і даволі добра; відаць, што студыйцы шмат працавалі, і шмат якія з іх сягоньня ўжо ўваходзяць у лік пісьменьнікі. З гэтых студыйцаў некаторыя пішуць ужо так, што пачынаючыя пісаць ужо могуць павучыцца ў іх. Мы ў Менскай філіі маем на ўвазе ўзяць у студыі рабкораў і селькораў і дапамагчы ім, выйсьці ў пісьменікі. Нашыя студыі ўжо паказалі сябе. Калі вы прагледзіце ўважліва творчасьць „Маладняка", дык фактычна гэта-ж творчасьць Менскай філіі. Трэба сказаць, што, разьвіваючы свае маладыя творчыя сілы, Менская філія ўжо заняла сталае месца ў беларускай літаратуры. Яна ўнесла ў яе скарбніцу іх новыя здабыткі. Тое, што „Маладняк" унёс у беларускую літаратуру новага ў галіне формальна-мастацкай, трэба сказаць праўду, гэта ўнесла Менская філія. Выхаваўчая праца Менскае філіі праводзілася

так: на сходах ставіліся даклады тэорытычнага характару, зачытваліся творы старэйшых маладнякоўцаў, разьбіралі іх, а таксама знаёміліся ня толькі з літаратураю СССР, а і з літаратураю Заходняй Эўропы. Вось што рабілася ў галіне выхаваўчай. Так і цяпер стаіць пытаньне аб выхаваўчай працы філіі. Нашае пісьменства сучаснага пэрыоду будуецца колектывам рабочых і сялян і нам трэба было падзяліцца нашымі дасягненьнямі з гэтым колектывам,—і гэта было выпаўнена. Мы рабілі даклады на заводах, у комсамольскіх клюбах і г. д. Вось асноўная праца Менскай філіі. Можна было-б гаварыць аб працы больш, але кожны з вас яе добра ведае.

## Даклад Аршанскае філіі.

Аршанская філія адна з маладых. Яна з'організавалася ў першай палове мая і існуе 5-6 месяцаў. З пачатку організацыі быў 1 сябра і 3 кандыдаты. Умовы працы у Воршы ня вельмі спрыяючыя. Справа ў тым, што беларускі культурны рух ў Воршы быў слабы. Калі мы ў Віцебску бачым сьвядомых беларусаў, этнографаў і г. д., то ў нас гэтага няма. Першае заданьне нашай філіі было популярызаваць сябе сярод сялян і рабочых, дзеля чаго на 3-4 дзень па організацыі філіі выдалі сваю часопісь. Бязумоўна, такая пастаноўка справы дала свае вынікі, маладняцкія думкі сталі пашырацца па самых глухіх куткох і моладзь пачала выказваць у лістох свае адносіны да організацыі. Адзін вясковы хлапец чуць не заплакаў, прачытаўшы, што ў Воршы ёсьць свая беларуская часопісь. Наша думка абудзіла больш перадавую частку, і мы мелі шмат матэрыялу, які пачалі і выдаваць. Малая колькасьць—1 сябра і 3 кандыдаты—не давала нам магчымасьці разьвярнуць сваю працу, і мы патрабавалі дапамогі з боку ЦБ. З ЦБ была цесная пісьменная і жывая сувязь. Праз Воршу маладнякоўцы праяжджаюць часта, але Воршы ад гэтага карысьці мала. Застанаўліваюцца нават начаваць ці чакаць цягніка і ўцякаюць. Калі іх цягнеш, просіш зрабіць даклад, дык яны адказваюць, што вы падрыхтуйцеся і дайце тэлеграму. Мы падрыхтоўваемся, даем тэлеграму і што—ні слуху ні духу. Сувязь павінна быць больш наладжана, як пісьменная, так і жывая. Мы ня ведалі добра працы ЦБ і не маглі інформаваць на сходах нашых слухачоў аб ёй. Сходаў масавага характару мы правялі 3. Адзін сярод працаўнікоў асьветы і 3 сярод сяброў. Вынікі былі добрыя, пасьля апошняга сходу на другі дзень мы атрымалі шмат заяў аб уступленьні ў філію. За час працы мы выдалі 2 кніжкі, адну амаль што ня ўласнымі сіламі. Гэта вялікае дасягненьне, дзеля таго што рабочыя і сяляне пачалі прымаць актыўны ўдзел у працы. Мы распачалі працу пры 1 сябры, а маем 5 сяброў і 2 кандыдатаў, калі лічыць Мурашкевіча кандыдатам, які пераведзены ў Слуцкую філію. Рост малы. Да залічэньня ў лік сяброў філіі мы падыходзілі вельмі асьцярожна. Калі Віцебская філія пасьля акруговае конфэрэнцыі яшчэ павялічылася на 2 чалавекі, то я лічу, што зьява гэта ненормальная. Можна вырасьці яшчэ больш, дагнаць і нават перагнаць Віцебскую філію,—мы гэтага проста не хацелі. У сучасны момант у нас ёсьць аддзяленьне ў Горках, якое падае вялікую надзею. Асноўнае нашае заданьне мы поўнасьцю ня выканалі. Мы не маглі весьці шырокую выхаваўчую працу сярод маладнякоўцаў, знаёміць іх з заданьнямі „Маладняка“, бо мала мелі сіл. Мы не маглі пашырыць працы сярод Ленінскай моладзі на раёне. Аднак, можна спадзявацца, што заданьні ўскладзеныя на нас, будуць выкананы. Мы паставім сваю працу больш шырэй і будзем мець большыя дасягненьні.

Старшыня: На гэтым дазвольце сёньнешняе пасяджэньне лічыць зачыненым.

## Пасяджэньне 4.

Старшыня: Слова для справаздачы даецца кіраўніку Барысаўскай філіі т. Аляхновічу.

Тав. Аляхновіч: 4 красавіка г.г. пасьля майго дакладу на агульным сходзе пэдтэхнікуму была закладзена Барысаўская філія. Спачатку ў ёй былі толькі слухачы пэдтэхнікуму, сёньня-ж, апрача пэдтэхнікумаўцаў, маюцца комсамольцы, настаўнікі, студэнты сельска-гаспад. тэхнікуму і інш. Апошнія лічбы нашага складу наступныя: 6 сяброў (1—КПБ, 2—беспартыйныя, 3—комсамольцы—па партыйным складзе; па соцыяльным паходжаньні: 3—сяляне, 3—інтэлігенты і 6 кандыдатаў (4 комсамольцы і 2 беспартыйныя—па партыйным складзе, па соцыяльным паходжаньні: 3—сяляне, 2—інтэлігенты і 1—рабоч ). Тыя таварышы, якія пачалі пісаць, якія йдуць да нас з шэрагаў рабкораў і селькораў, але яшчэ ня зусім выявілі сябе, складаюць нашых студыйцаў. Іх 13 асоб (1—кандыдат КПБ, 6—ЛКСМ, 6—беспартыйных—па партыйным складзе; па соцыяльным паходжаньні: 5—сяляне, 3—рабочыя, 5—інтэлігенты).

Агулам у нас 25 асоб, з іх 2—партыйцы, 13—комсамольцаў, 10—беспартыйных—па партыйным складзе; па соцыяльным паходжаньні: 11—сяляне, 10—інтэлігенты, 4—рабочыя; па полу—21 мужчына і 4 жанчыны. Сходы нашыя прыцягваюць усё большы і большы лік прысутных. Калі на першым сходзе філіі было 18 асоб, дык на апошніх мы маем 50—60 асоб. Сходы адбываюцца рэгулярна 1 раз у тыдзень. Летам у часе вакацый быў зроблены $1^1/_2$ месячны перарыў, бо большасьць сяброў разьехалася. Тады з паасобнымі таварышамі вялася выхаваўчая праца (знаёміліся з новай беларускай і расійскай літаратурай, крытычнымі творамі). За час нашае працы адбылося 15 сходаў і 1 акруговая конфэрэнцыя. З чыткай сваіх твораў выступіла 16 таварышоў; яны выступалі 32 разы і зачыталі 49 твораў. Творы былі зачытаны наступныя: 1 рэцэнзія, 11 апавяданьняў, 2 п'есы і 35 вершаў. На сходах разглядалі і найноўшыя маладнякоўскія творы (Зарэцкага, Чарота і інш.). Трэба адзначыць досыць значную актыўнасьць сяброў філіі: у спрэчках па творах прымала ўдзел каля 30 асоб, якія выступалі 220 раз.

З акругай сувязь слабая. Чаму? Бо грошай мы ня маем і нам прыходзілася карыстацца апаратам акругкому ЛКСМБ. Разасланы па ўсіх Райкомах таварыскі ліст з просьбай аб выяўленьні ўсіх поэтаў і пісьменьнікаў, потым пасылалі і напамінаньні, але... адказу і дагэтуль няма. Грошай на выезды мы ня маем. А цяга да „Маладняка" з вёскі ёсьць. Нядаўна прышоў у філію з вёскі хлапец, дэмобілізаваны чырвонаармеец; ён мастак, у часе побыту ў арміі прымаў удзел на Сыбірскай мастацкай выстаўцы. Цяпер хацеў-бы зьвязацца з „Маладняком".

На вёсцы маюцца поэты і прозаікі, і наша чарговае заданьне выявіць іх.

Цяпер аб выступленьнях. Ня гледзячы на кароткі час працы, на тое, што хлопцы ў большасьці яшчэ пачынаюць пісаць—праведзены выступленьні ў чырвонаармейцаў, Рабклюбе, Клюбе КІМ'у, 5 выступленьняў у пэдтэхнікуме і шэраг выступленьняў паасобных таварышоў. Нашымі сіламі быў праведзены вечар Янкі Купалы.

Сувязь з Комсамолам і АПА акругкому партыі добрая. На політпрасьветкамісіі Акругкому ЛКСМБ мы ставілі 2 даклады аб нашай працы і там яе прызналі здавальняючай.

Справа з выданьнем твораў стаіць дрэнна. Барысаў да апошняга часу ня мае газэты. Мы хацелі супольна з Акругкомам ЛКСМБ да „Дня Ураджаю“ выдаць зборнік. Былі падрыхтаваны матэрыялы, але за адсутнасьцю сродкаў выдадзены ён ня быў.

Адносна самавыхаваньня. Нам трэба беларуская літаратура, а яе філія зусім ня мае. Дый наогул з беларускай літаратурай у Барысаўскіх бібліотэках дрэнна.

Трэба пашыраць „Маладняк“ на раёны, а на гэта трэба грошы, якіх філія ня мае.

Уся наша праца вялася пры моральным падтрыманьні Партыі і Комсамолу.

Старшыня: Слова для справаздачы даецца кіраўніку Полацкай філіі т. Хурсіку.

Тав. Хурсік: Наша філія маладая, існуе ўсяго 8 месяцаў. Закладзена 7 сакавіка 1925 г. На першым пасяджэньні было залічана 6 асоб, большасьць з якіх былі вучні. З прычыны вакацыі летам праца не вялася і ўжо з верасьня месяца пачалася фактычная праца. Сваёй задачай мы паставілі зьвярнуць увагу на моладзь, сярод якой рабіліся даклады. Каля 22 асоб налічвалася ў горадзе. Пасьля перагляду засталося сяброў 4 і кандыдатаў 14. Як вынік нашай мэты пашырыцца за лік вёскі, мы маем 2 вясковыя гурткі. З верасьня мы ўвялі ў практыку чыткі твораў. Праведзена 18 сходаў. У Полацкіх умовах гэта вялікае дасягненьне, па той прычыне, што ў нас у Полацку маецца шмат інтэлігенцыі 4-га разраду, як сказаў т. Дубоўка.

Полацкая філія мае дасягненьні. Ёю падрыхтаваны да друку зборнік Францішка Скарыны. За адсутнасьцю сродкаў ён ня выдадзены. Адначасова мы ўзялі шэфства над комсамольскімі курсамі, мы іх добра пазнаёмілі з „Маладняком“, і яны, паехаўшы на вёску, пашыраць нашы шэрагі.

Старшыня: Слова для справаздачы даецца кіраўніку Слуцкай філіі т. Шукайлу.

Тав. Шукайла: Слуцкая філія організавалася ў канцы мая. У пачатку чэрвеня распачала сваю працу. У сучасны момант філія налічвае 11 сяброў і 17 кандыдатаў. Маецца гэтак сама 2 гурткі „Маладняка“, у якіх 83 сябры. Філія сваю працу аддавала гушчам рабочых і сялян. Зроблена 11 выступленьняў у горадзе і 4 ў вёсцы.

Выдавецтва слабае. Да гэтага часу выдана 3 літаратурныя старонкі ў мясцовай газэце. Адначасова знаходзіцца ў друку зборнік 5 актывістых філіі пад назвай „Слуцкія песьняры“. Падрыхтоўваюцца да друку 5 кніжак паасобна лепшых песьняроў.

Філія мела перашкоды з боку агітацыі беларускіх шовіністых. Так званая „нацыянальная дэмократыя“ (у Слуцку—лістападаўшчына) наладжвала адкрытыя пахабныя напады на „Маладняк“.

У літаратурнай дыскусіі ў Слуцку былі 2 ідэолёгі: 1-ы—„Маладняк“ і другі—Колас.

Нацыяналістыя адкрыта заяўлялі, што ўся Кастрычнікавая літаратура, у параўнаньні з Коласам—нішто. У такім настроі выхоўвалася значная частка Слуцкага настаўніцтва.

Але, ня гледзячы на перашкоды, трэба адзначыць, што аўторытэт філіі сярод рабочых і сялянскіх мас маецца і пэрспэктывы да далейшага росквіту ёсьць.

Старшыня: Слова для справаздачы даецца кіраўніку Калінінскай філіі т. Падабеду.

Тав. Падабед: Наша філія стаіць у шэрагу самых маладых філій „Маладняка“. Організавана ў канцы красавіка г. г. пры ўдзеле

сяброў ЦБ. Сьпярша ў склад філіі ўвашло 5 асоб на чале з т. Палонскім.

Першае, што вырашыў зрабіць прэзыдыум філіі—гэта выявіць літаратурна-мастацкія сілы акругі.

Былі выпрацаваны адозвы да Райкомаў ЛКСМБ і РайАНА з просьбай памагчы філіі ў гэтай справе, бо на выезды для шырокае агітацыі сябры філіі ня мелі грошай. Выпрацавалі і разаслалі анкеты. Наладжвалі сувязь з сямігодкамі больш буйных месцаў. Гэты бок працы даў мала: была выяўлена адна сямілетка (Хацімская), у якой нашчупалі некалькі сяброў, аб'ядналі іх у вадзін гурток, які зараз носіць імя Міхася Чарота. Анкеты паступалі ў прэзыдыум, але яны доўга залежваліся.

Выдавецкая справа: у нашай акрузе выходзіць часопісь „Маладняк Калінінішчыны"—орган Акругкому ЛКСМБ і Калінінскае акруговае філіі. Першы нумар гэтай часопісі выдадзен выключна сіламі сяброў ЦБ, якія прыяжджалі ў Клімавічы.

Другі нумар ужо на сваіх старонках зьмяшчае больш мясцовага матэрыялу, але ўсё-ж пераважны лік твораў не сяброў нашай філіі.

І толькі ўжо ёсьць надзея на 3 №, у якім будуць матэрыялы выключна сяброў мясцовае філіі. Гэты нумар ужо рыхтуецца да друку і толькі стаіць за сродкамі выданьня. Тут, бязумоўна, з боку ЦБ „Маладняка" трэба будзе вялікая дапамога.

Апрача гэтае часопісі, сябры філіі час-ад-часу паказваюцца на старонках акруговае газэты „Наш Працаўнік".

Сувязь з ЦБ спачатку працы філіі была здавальняючая.

Другі пэрыод у разьвіцьці філіі—гэта пэрыод ад чэрвеня па верасень месяц.

Пачатак гэтага перыоду адзначаецца тым, што старшынёй філіі становіцца т. Александровіч. Калі ў першы пэрыод філія брала курс на азнаямленьне з „Маладняком" вёскі (праўда, тут праведзена невялічкая праца: 3 выезды з сябрамі ЦБ), то ў другі бралі курс на азнаямленьне з „Маладняком" гораду.

Тут арганізаваны маладняцкі вечар, да якога філія выпусьціла насьценную газэту і змайстравала кніжную выстаўку.

Але праца гэтым і закончылася. Праўда, тав. Александровіч выехаў па разу ў Мсьціслаўль і Хоцімск.

За гэты пэрыод філія не павялічылася за лік сяброў і кандыдатаў, зацьверджаных ЦБ „Маладняка", хоць на гэта былі мажлівасьці.

Выхаваўчае працы не вялося зусім. Анкеты ляжалі не разгледжанымі... Можа ўсё гэта тлумачыцца і тым, што сябры прэзыдыуму былі загружаны працай, але мне думаецца, што нямала вінават і т. Александровіч. Мэтод кіраўніцтва філіяй быў выбраны т. Александровічам зусім няўдалы: ня ўцягваліся ў працу сябры прэзыдыуму. Тав. Александровіч дзейнічаў індывідуальна.

Далейшая праца:

1) Шырэй разьвярнуць працу па выяўленьні мастацкіх сіл. Мажлівасьці ёсьць. Ужо 5 асоб прыслалі свае творы.

2) Нашчупаць літаратурныя сілы ў Мсьціслаўскім пэдтэхнікуме.

3) Зьвязацца з сямігодкамі для выяўленьня сіл.

4) Арганізаваць Яўрэйскую сэкцыю пры філіі.

5) Узяць крокі для выданьня 3 № „Маладняка Калінінічшчыны".

6) Наладзіць больш сталую выхаваўчую працу пры дапамозе лекцый, асабістых лістоў па раёнах.

7) Склікаць раз у 2 месяцы агульны сход філіі, выклікаўшы сяброў і з раёнаў.

8) Увязацца цясьней з Акругкомам ЛКСМБ і КПБ.

Старшыня: Слова для справаздачы даецца кіраўніку Маскоўскай філіі т. Сянкевічу.

Тав. Сянкевіч: Умовы жыцьця беларусаў у Маскве зусім інакшыя, чымсь у Беларусі.

Пасьля прыезду Чарота і Дубоўкі наша Маскоўская філія „Маладняка“ працавала. З восені праца супынілася. Тлумачыцца адсутнасьцю кіраўніка.

Тым часам, у Маскве маецца значная крыніца для „Маладняка“. Комвузы, рабфакі, утрымоўваючыя ў сабе немалы лік беларускай моладзі, высунулі-б добрых маладнякоўцаў.

У вапошні час у Маскве організавана Цэнтральная сэкцыя філіі „Маладняка“.

Трэба на зьезьдзе адзначыць, што калі ЦБ ня прышле сталага кіраўніка, філія распадзецца, яе ня будзе. Гэтым мы зможам ажывіць працу.

Цяпер па дакладу ЦБ. Бяда наша ў тым што „Маладняк“ хварэе на тую хваробу, якою хварэе ВАПП. Калі прыглядзецца, то кіраўніцтва не стаяла на належнай вышыні. Праца дагэтуль вялася кустарным спосабам. На дрэнныя бакі працы трэба зьвярнуць увагу, бо калі ўвага ня будзе зьвернута на гэта, а „Маладняк“ будзе расьці ў шыр і хварэць, то вынікі будуць ня зусім добрыя.

Старшыня: Слова даецца для садакладу кіраўніку тэатральн. сэкцыі т. Міцкевічу.

Тав. Міцкевіч: Таварышы. У вапошні час заложаны тэатральны гурток пры Бел. студыі. Намі намечан плян працы, праведзены тры сходы. Мы паставілі сабе на мэце організаваць тэатр. сэкцыю „Маладняка“, якая-б уключала 2 галіны: літаратурна-тэатральную і тэатральна-драматургічную, якія-б заклалі беларускі бытавы тэатр, са сваімі спэцыфічнымі адзнакамі.

Старшыня: Слова для справаздачы даецца кіраўніку Гомельскай філіі т. Грашчанку.

Тав. Грашчанка: Пачалі працу ў гэтым годзе. У Пэдтэхнікуме, сярод чырвонаармейцаў маецца два гурткі. Мы былі не аб‘яднаны. Сябры ЦБ (Пушча і Чарнушэвіч) заклалі філію. Хлопцы ўхапіліся за працу, але падрыхтоўка была кепская... Маладнякоўцы ў вёсцы рабілі даклады. У верасьні месяцы г. г. быў першы сход філіі. У нашай філіі маецца 17 асоб: 12 проц. партыйных, 28 проц. беспартыйных і комсамольцаў 60 проц.

Умовы нашай працы: кругом ўсё працуе на расійскай мове. За месяц працы падрыхтаваны часопіс. У нас многа хлопцаў, якія пісалі, але не пабеларуску. Выхаваўчая праца вялася наступная: разглядалі беларускія маладнякоўскія творы і пашыраем мастацкі погляд. Пры Тэхнікуме мы знаёмімся з поэтыкай.

На вечарох у нас бывае каля 100 асоб. Наша настаўніцтва, як дзейная беларуская сіла на вёсцы, нас цікавіць, бо яно дапаможа нам.

З Менскам мы сувязь маем кепскую, нават і ня знялі, што сярод нас толькі два сябры. Творы зьмяшчалі ў „Палескай Праўдзе“ і ў іншых часопісах. У вёсках выпускаюцца насьценныя газэты.

Узаемаадносіны філіі з Губкомам добрыя. Вядзем, галоўным чынам, працу грамадзкую. Выдавецкая—слабая. Мы думаем захапіць беларускую моладзь па губэрні. На студыі мы раскідацца ня думаем.

Сувязь з ЦБ кепская, прыяжджалі з Менску з ЦБ ўсяго толькі 2 разы. З расійскім выдавецтвам сувязі покуль што ня маем.

## Спрэчкі па дакладу ЦБ і садакладах філій.

Тав. Дубоўка: Я спынюся на трох філіях: Аршанскай, Віцебскай і Маскоўскай. Пачну з Віцебскай. Віцебская філія гэта дыяграмная,—хоць, праўда, ёсьць і здольныя хлопцы, але там існуе мастацкая сэкцыя, на якую трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу. Маскоўская філія зрабіла 13 вечароў у Маскве. Сябры філіі вялі сярод студэнтаў літаратурную працу. Часопісь „Змаганьне“ выдала маскоўская філія. Аршанская філія заснавалася нядаўна. Там ёсьць хлопцы здольныя, і працу можна было раскінуць шырэй, але гэтага мы ня бачым. Ганчарык падрыхтаваў быў да друку „Маладняк № 2“ і ён ляжаў некалькі месяцаў. У Аршаншчыне існуе акадэмія. Аршанскай філіі трэба зьвярнуць увагу на гэту акадэмію, каб усе здольныя сілы прыцягнуць да працы. Адным словам, трэба працу павесьці шырэй.

Тав. Мялешка: Я хачу сказаць аб Віцебскай філіі „Маладняка“. Перш чым працаваць, трэба было выявіць, што гэта за філія. Мы даведаліся, што гэта філія клясавая. Мы пасылалі свае творы ў газэты. Акрамя літаратурнай працы, мы праводзілі і працу грамадзянскую. Шмат нашых маладнякоўцаў працуе ў горсавеце, у краязнаўчым бюро, на піонэр працы і г. д. З усяго гэтага мы можам вывесьці, што Віцебская філія праводзіла вялікую працу, і наогул мы будзем працаваць і ў свае шэрагі будзем уцягваць рабочых і сялян.

Тав. Мурашка: Перш за ўсё некалькі слоў аб справаздачах філій. Пачну з Менскай. Тав. Пушча ўсяго не зазначыў. Прыняцьце культшэфства над корэспондэнцкім гуртком 6-га палка—гэта праца Менскай філіі. Далей трэба сказаць некалькі слоў аб сродках „Маладняка“. Пытаньне аб сродках займае найважнейшае месца. Пакольькі мне вядома, Слуцкая філія ў адносінах сродкаў знаходзіцца значна ў лепшых умовах, чым іншыя філіі. Слуцкая філія, хаця я яе ня досыць добра ведаю, але, гаворачы з комсамольцамі на вёсцы, мне прышлося дазнацца, што Шукайла занадта пахваліў сваю філію. Трэба сказаць, што Слуцкая філія карыстаецца аўторытэтам, але нам патрэбна яшчэ большага аўторытэту. Гаворачы аб выхаваўчай працы, трэба сказаць, што выхаваўчая праца стаіць яшчэ слаба.

Тав. Гурскі: Таварышы, дазвольце запрасіць зьезд „Маладняка“ на нашу орыгінальную пастаноўку „Кастусь Каліноўскі“, якая будзе пастаўлена заўтра 28 лістапада.

Тав. Касьпяровіч: Трэба падлічваць умовы, пры якіх прыходзілася працаваць ЦБ „Маладняка“. Калі ЦБ „Маладняка“ здабыло магчымасьць рэалізаваць сваю творчасьць—гэта вялікае дасягненьне. Тут шмат гаварылі аб тым, што ЦБ „Маладняка“ мала рабіла выездаў на месцы, але я скажу, што выездаў было зроблена больш, чым належыць быць. Акрамя таго, сувязь пісьмовая была таксама добрая. Нам хацелася, каб сябры ЦБ часта прыяжджалі ў Віцебск. Нам цікава выявіць далейшы шлях працы „Маладняка“. Папершае, трэба паставіць пытаньне, каб ЦБ „Маладняка“ мела пабольш грошай. Трэба паставіць базу пад падмуркі філій. Трэба канчаткова вырашыць пытаньне, каб мы мелі грашовыя выдаткі на мясцовыя растраты. У „Маладняку“ знаходзяцца ня толькі поэты, але мастакі, драматургі і г. д. „Маладняк“ пашыраецца. І каб нам выявіць здольнасьць таго ці іншага поэты, мастака і г. д., то для гэтага трэба мець поўную магчымасьць друкавацца.

Тав. Пушча: Тут шмат гаварылася аб працы філій, аб тым, якую ўвагу зьвяртала ЦБ на працу філій, але што мы маем у рача-

існасьці? Калі сябры ЦБ выяжджалі на акругі, то выезды, як сказаў т. Грашчанка, ня мелі жаднай карысьці. Гэта, бязумоўна, няпраўда. Першую літаратурную старонку, якая вышла пры газэце „Заря Запада" і якая мела вялікае значэньне, гэта ўсё была праца сяброў ЦБ. У кожнай філіі павінна весьціся грамадзянская праца,—гэта добра; але тады кожны маладняковец ня здолее працаваць сам над сабою і над якасьцю сваёй творчасьці. Мы ведаем, што Слуцкая філія яшчэ маладая, але яна ўжо падрыхтавала да друку невялічкі зборнічак твораў сваіх песьняроў. Каб паставіць на ногі выхаваўчую працу, патрэбна, каб кожная філія мела сваю невялічкую бібліотэку. Трэба паставіць працу так, каб кожны маладняковец там на мясцох мог пачытаць тую ці іншую кніжку і зьвярнуць яе другому. Трэба, каб мясцовая ўлада лічылася з маладнякоўцамі. Часамі ў „Маладняк" пападаюць элемэнты, якія ня маюць ніякага дачыненьня да мастацкай творчасьці. На мой погляд, гэтакіх асоб нельга залічваць у „Маладняк".

Тав. Гадзінскі: Я павінен сказаць, што ў вас добрая спайка паміж таварышамі. Тут былі закіды на тое, што з ЦБ „Маладняка" ня было сувязі. Але паперка нічога ня зробіць, а толькі жывая сувязь таварышоў значна пашырыць працу. Мы павінны зьнішчыць традыцыі мінулага, не чакаючы загадаў з места. Трэба, каб да другога зьезду „Маладняка" праца на мясцох паглыбілася, а праца ЦБ каб значна пашырылася. Мы павінны памятаваць, што мы—пісьменьнікі, і грамадзянская праца між нас павінна займаць меншае месца, чым творчая. Грамадзянскіх ухілаў павінна быць менш. Мне здаецца, што справа выдавецтва для „Маладняка" асабліва важна. Трэба раз назаўсёды пакончыць з кустарніцтвам у адносінах выдавецтва. Кожны практычны працаўнік выдавецтва можа мець сродкі на ўзмацаваньне філій. Мы павінны паслаць матэрыялы, а выдавецтва будзе распарадкаваць іх. Трэба перайці на комэрцыйную дарогу ў адносінах выдавецтва.

Тав. Шукайла: У адносінах напрамку ЦБ Маладняка ніхто не сказаў ні слова. Калі мы прасочым даклад, то бачым, што праца праводзілася без належных сродкаў. Гэта—вялікае дасягненьне ЦБ „Маладняка".

Цяпер з політычнага боку. „Маладняк" узмацніўся. У нас былі хібы. Гэта гаворыць за тое, што трэба ўзяць моцны політычны напрамак—гэта трэба зрабіць яшчэ ЦБ „Маладняка". Тав. Пушча ня праў у тым, што выхаваўчая праца павінна заняць частку грамадзянскай. Трэба працаваць самім над сабой. Ніхто не застанавіўся на соцыяльным складзе „Маладняка". Нашы філіі больш былі ў пэдтэхнікумах, профшколах і г. д. У далейшым трэба ад гэтага адмовіцца. Трэба зьвярнуцца, каб „Маладняк" меў посьпех сярод гушчаў сялян і рабочых. Далей аб выдавецтве і матэрыяльнай базе на мясцох. Тав. Мурашка казаў, што ў Слуцку справа абстаіць добра. Слуцкая філія не атрымала грошай ні ад якой установы. Мне думаецца, каб дакладчык у заключным слове гаварыў аб матэрыяльнай базе.

## Пасяджэньне 5-е.

Тав. Аляхновіч: Загана Цэнральнага Бюро ў тым, што яно не выдае інформацыі (бюлетэню) аб працы філій. Таксама многа гаварылася аб скідцы на кнігі для маладнякоўцаў, а дагэтуль гэта пытаньне яшчэ ня вырашана. Цяпер аб выхаваньні. Каб пісаць творы, трэба мець тэорытычныя веды,—у гэтым напрамку ЦБ нічога ня зроблена. У провінцыях вялікі недахват у кнігах тэорытычных і наогул у літаратуры. ЦБ не клапацілася высылкаю літаратуры ў філіі.

Тав. Якімовіч: Мяне цалкам выклікаў з словам тав. Шукайла. Шукайла выступіў прадстаўнікам аднаго напрамку. Як відаць было з прамоў, погляды разыходзіліся на дзьве часткі: адзін погляд, як зазначаў Пушча, другі—Шукайла. Пушча, Дубоўка, Гадзінскі зазначалі, што трэба больш зьвярнуць увагі на творчую продукцыю „Маладняка", а Шукайла—весьці больш масавую працу. Я лічу, што погляд толькі весьці арганізацыйную і масавую працу няправільны. Некаторыя сябры разумеюць філію, як школу нейкіх сыстэматычных заняткаў, кажуць, што трэба навучаць таварышоў пісаць. Трэба самым вучыцца. У „Маладняку" выявіўшыхся асоб 40—50 і, значыць, на погляд тав. Шукайлы яны павінны быць нейкімі настаўнікамі. Мой погляд, што сыстэматычна весьці заняткі ня дасьць продукцыйных вынікаў. Ніхто не адмаўляе, што няшкодны даклады, але калі яны будуць часта, таварышы ня змогуць даць творчай продукцыі. Адгэтуль такі вывад: трэба самым выхоўвацца. Цяпер аб выдавецтве і друкаваньні. Каб друкавацца, трэба перш мець матэрыял. Калі-ж сябры скардзяцца, што яны ня могуць друкавацца, рэалізаваць сваёй творчасьці, дык гэта затым, што яна слабая,—мы гэта бачым на прыкладзе. Слуцкая філія пачала выдаваць літстаронку. Ня трэба закрываць вачэй, гэта было адзначана і ў ЦБ, што яна слабая і правалілася. Мае вывады такія: 1) я лічу, патрэбна больш самастойнай працы над сабой; 2) вызначыць абавязкі філій у грамадзкай працы; 3) больш зьвярнуць увагі на выданьне твораў, бо на мясцох часта выдаюцца вельмі слабыя творы.

Тав. Грашчанка: Цікавае пытаньне ўзьняў тав. Пушча—гэта адносіны філій да грамадзянскай працы. Таварышы, калі мы на адчыненьні зьезду мелі прывітальныя лісты і водгукі сялян аб „Маладняку", гэта вынік грамадзянскай працы. Як яна павінна стаяць—гэта пытаньне другое, і я думаю, што тав. Вольны ў заключным слове вызначыць месца філій у грамадзянскай працы. Я толькі супроць Гадзінскага, які сказаў, не залазьце ў грамадзкую працу і вызначыў яе 30 проц. Памойму, ён перагнуў кій: пакуль мы не популярызаваны сярод мас, трэба больш ставіць дакладаў, а пасьля ўжо, калі мы выйдзем з арганізацыйнага пэрыоду, тады мы павінны будзем ўсю ўвагу зьвярнуць на творчую працу. У нас налічваецца 200 сяброў, з якіх ня ўсе ведаюць маладняkоўскія абавязкі, і арганізацыйнае пытаньне працягнецца можа яшчэ два гады, а то і больш. Наконт выдавецкай працы трэба згадзіцца з тав. Гадзінскім, гэта значыць—перайці на коопэрацыйны мэтод.

Тав. Барашка: Сьпярша адкажу Грашчанку. „Маладняк"—арганізацыя ў пераважнасьці літаратурная, а не грамадзкая. У нас, як грамадзкая арганізацыя, існуе Комсамол, і ня справа „Маладняка" аддавацца ў большасьці гэтай працы. Аб выездах трэба адзначыць, што яны рабіліся няплянава і надалей трэба ўвесьці плянавасьць. ЦБ мае сродкі, якія цесна зьвязаны з выдавецтвам яго і выездамі і трэба іх скарыстоўваць больш мэтазгодна.

Тав. Дудар: Калі Маладняк змог так разьвярнуцца, разрасьціся, дык гэта залежыць ад тэй структуры, па якой ён пабудованы. У філіях-жа запрыкмячаецца арганізацыйныя вывіхі, напрыклад, у Полацкай філіі назіраюцца выпадкі, калі протоколы ЦБ не зачытваюцца, далей, філія складаецца з 20 чалавек, а бюро выбіраецца з 7 асоб, гэта значыць—трэцяя частка складу філіі. Таксама заўважаецца, што філіі займаюцца краязнаўствам і г. д.,—гэта ўхіл шкодны.

Тав. Вольны *(заключнае слова)*: Вынікла пытаньне, у якую сувязь паставіць літпрацу з грамадзянскай. Уся літаратурная праца павінна йсьці ў разрэзе з грамадзянскай. Цяпер па справаздачы бюро ня выказаліся наконт сувязі з замежнымі літарганізацыямі. З Украінскай

організацыяй ГАРТ у нас сувязь моцная. З расійскімі організацыямі ніяк ня можам дагаварыцца. Нам давалі проц. месца ў ВАПП'е. Яны хацелі ўзяць верх над нацыянальнымі літаратурамі. Мы, вядома, ад гэтага адмовіліся, хацелі пабудаваць па іншай структуры ВАПП. Творчы шлях „Маладняка“,—гаварыць аб ім цяжка, бо мастацкія дасягненьні, як сказаў Дубоўка, яшчэ ня вывучаны, але „Маладняк“ усё-ж такі зрабіў тут многа. „Маладняк“ даў пролетарскія мотывы, мотывы гораду ў асобе Александровіча. Таксама трэба адзначыць вялікія мастацкія дасягненьні Дубоўкі, Пушчы, Чорнага, Дудара і інш. „Маладняк“ таксама зьмяніў рытміку. Чарот першы ўнес новую рытміку. Аб мове „Маладняка“ трэба сказаць, што яна крышталюецца. Тут казалі, што няма плянавасьці ў выездах ЦБ. Па магчымасьці ЦБ рабіла выезды, і тав. Барашка ня праў у гэтым, бо на выезды патрачана 105 дзён. Ці-ж гэта ня плянавасьць? Даклады з месцаў выявілі працу ў філіях. Некаторыя філіі вялі працу добра, а ў некаторых былі хібы, як, напрыклад, у Віцебскай. Калі ў Віцебску адбывалася сэсія ЦВК, ЦБ дало тэлеграму аб падрыхтоўцы маладнякоўскага вечару. Віцебская філія гэтага ня выканала. Трэба вызначыць, што самая моцная Слуцкая філія, якая павінна стаць узорнай для другіх па організацыйным пытаньні. Менская філія працавала больш за ўсе, аб гэтым скажа сёнешні вечар, ахвяраваны юбілею. Менская філія давала тон усім філіям. Зазначу, што, ня гледзячы на „пуфы“, якія былі ў Віцебскай філіі, ёю ўсё-ж такі праароблена вялікая праца. Выдавецкая справа стаіць добра. Як тут казалі, наша выдавецтва абагнала БДВ. Выдавецкі плян БДВ у галіне прыгожага пісьменства на 1925/26 г. 100 друкаваных аркушоў, а Маладняк за поўгода выдрукаваў 48. Цяпер наш бюджэт абмяжованы і йдзе выключна на выдавецтва, так што адпушчаць філіям грошай няма ніякай магчымасьці. Да красавіка ў нас ня было ні капейкі, з красавіка былі вылучаны сродкі 500 руб. у месяц, амаль на ўсе выдалі кніжкі. Умовы нашай працы самыя мізэрныя. Далей нам трэба зьвярнуць увагу на выхаваньне сяброў у філіях, пашырыць марксыцкі сьветагляд і тады можна сказаць словамі Дубоўкі. „Няхай жыве „Маладняк“!“

## Творчы шлях „Маладняка“.

*Даклад А. Бабарэкі.*

Перш, чым гаварыць пра творчы шлях „Маладняка“, неабходна, на мой погляд, таварышы, вызначыць само разуменьне мастацтва, як пэўны крытэры, які дасьць магчымасьць больш-менш правільна ацэньваць тую ці іншую літаратурна-мастацкую зьяву.

Ясна, што ў даным выпадку нам няма патрэбы выдумваць гэта адзначэньне і гэты крытэры. „Маладняк“ у сваёй дэкларацыі вызначыў, як сваю задачу, правядзеньне ідэй марксызму на загонах беларускай літаратуры. А гэта значыць, што і за адзначэньнем мастацтва мы павінны зьвярнуцца да марксызму, менавіта да яго тэорэтыкаў. Гэта пытаньне тым больш важнае і насьпелае, бо ад яго разьвязаньня залежыць накіраванасьць крытычнай думкі. Трэба-ж зазначыць, што ў беларускай сучаснасьці існуе ў асноўным два кірункі яе, з якіх абодва прэтэндуюць на ортодоксальнасьць. Я не кажу пра прамежныя, бо яны часта падыходзяць то да аднаго, то да другога асноўнага кірунку. Выявіць гэтыя кірункі, ацаніць іх і стаць у пэўнае да іх дачыненьне, мне здаецца, гэта павінна быць сёнешняй задачай „Маладняка“, тым

больш, што пытаньню аб крытыцы і партыя ўлучыла вялікую ўвагу ў рэзолюцыі аб мастацкай літаратуры.

Дык вот-жа паглядзім сьпярша, як адзначаецца мастацтва марксыстымі. Пляханаў адзначыў яго коратка, а іменна, як мэтод пазнаньня жыцьця. Яго вучні, прыкладам, Варонскі, гэта адзначэньне дапаўняюць яшчэ тым, што мастацтва пазнае жыцьцё з дапамогаю вобразаў, у форме пачуцьцёвага сугляданьня (сузэрцаньня). Уласна кажучы, гэта не дапаўненьне, а толькі раскрыцьцё зьместу разуменьня „мэтод", разлажэньне яго на больш конкрэтныя разуменьні, а іменна, „вобразы і формы пачуцьцёвага сугляданьня". Але калі зьвернемся яшчэ да Пляханава, як ён вызначаў задачы марксыцкай крытыкіі, то ўгледзім азначэньне мастацтва ў другой формулёўцы. „Задачы крытыкі,—кажа ён,— у тым, каб перавесьці ідэю данага мастацкага твору з мовы мастацтва на мову соцыолёгіі" і. г. д. Адгэтуль вынікае, што зьместам мастацкага твору зьяўляюцца ідэі, выказаныя моваю мастацтва. Мастацтва мае сваю мову, як сродак выказваньня і комунікацыі. Гэтай мовай выказваюцца тыя ці іншыя ідэі, якія маюць пэўны соцыолёгічны эквівалент. Апроч таго, далей ў тым-жа артыкуле Пляханаў зазначае, што „асаблівасьці мастацкай творчасьці ўсякай данай эпохі заўсёды знаходзяцца ў самай шчыльнай прычыннай сувязі з тым грамадзкім настроем, які ў ёй выказваецца. Грамадзкі настрой усякай данай эпохі абумоўліваецца ўласьцівымі ёй грамадзкімі адносінамі". Такім чынам, мастацкай творчасьцю выказваюцца і грамадзкія настроі. Далей, Пляханаў кажа: „Мастак павінен індывідуалізаваць тое агульнае, што складае зьмест яго твору. А раз мы маем справу з індывідуумам, то перад намі зьяўляюцца пэўныя псыхолёгічныя процэсы..., а тут ужо патрэбен псыхолёгічны аналіз". Знача, у мастацтве адбіваюцца і псыхолёгічныя процэсы. Пры гэтым Пляханаў кажа, „што процэсы, якія адбываюцца ў душы асобных людзей, зьяўляюцца адбіткам гістарычнага руху". Тут трэба заўважыць, што гэтыя-ж процэсы ня ёсьць нешта адцятае, а процэсы з пэўным конкрэтным зьместам. Адгэтуль і з усіх вышэй пададзеных зазначэньняў вынікае, што мастацтва фактычна зьяўляецца асобнаю моваю псыхікі чалавека. А паскольні ідэі, настроі, рознага роду пачуцьці складаюць зьмест псыхікі, якая абумоўліваецца пэўнымі грамадзкімі адносінамі, пастолькі мастацтва зьяўляецца і іх выказьнікам, пастолькі гэтыя зьявы зьяўляюцца зьместам мастацтва, як адбітак грамадзкіх адносін. Але гэта калі гаварыць пра творчасьць асобнага індывідууму. Калі-ж справа йдзе пра творчасьць наогул, пра мастацтва пэўнай эпохі, то яно фактычна зьяўляецца моваю ідэолёгіі гэтай эпохі моваю самапазнаньня гэтай эпохі. У такім сэнсе, мне здаецца, трэба разумець „мову мастацтва" Пляханава. Справа ў тым, што само мастацтва мае некалькі сродкаў ці спосабаў выказваць ідэі, настроі і г. д., а менавіта, вобразы, словы, гукі, фарбы, лініі, рухі і інш. Для мастака яны зьяўляюцца матэрыялам, з якога ён будуе пэўны мастацкі будынак, дзе і ажыцьцяўляецца і ідэя тая ці іншая, і настроі і г. д., іначай кажучы, мастак шые жывую адзежу для матэрыялізацыі свайго стану псыхікі. У вагульнай-жа складанасьці гэтых жывых адзеж пэўнага пэрыоду і пэўных груп мастакоў утвараецца „жывая адзежа ідэолёгіі" (выказ Пляханава) гэтай групы і гэтага пэрыоду.

Я так доўга спыніўся на поглядах Пляханава і вывадах з іх, бо, на мой погляд, у іх менавіта трэба шукаць самага шырокага і глыбокага адзначэньня мастацтва. Адзначэньне мастацтва, якое знаходзім у Бухарына, менавіта, што „мастацтва ёсьць сыстэматызацыя пачуцьцяў у вобразах", а таксама Луначарскага („мастацтва, як концэнтрацыя жыцьця"), Брусава („мастацтва—акт пазнаньня, пазнаньня ісьціны, не-

вядомага цераз вядомае"), Багданава („арганізацыя пачуцьцяў і волі"), Н. Чужака („вытворчасьць патрэбных клясе і чалавецтву каштоўнасьцяй"),—усе яны расплываюцца ў вышэйпададзеным адзначэньні. Справа ў тым, што ўсе гэтыя погляды адыходзяць ад пункту гледжаньня назначэньня мастацтва, а не таго, што яно ёсьць. З гэтага-ж апошняга трэба прызнаць, што, паскольki мастацтва ёсьць мова людзкой псыхікі, форма матэрыялізацыі сьвядомасьці, пастолькі ў яго разуменьне зьмяшчаецца і сыстэматызацыя пачуцьцяў і концэнтрацыя жыцьця і будаўніцтва жыцьця і г. д. Мастацтва нельга разглядаць у яго адцятасьці, бо гэта, урэшце, даводзіць да погляду на мастацтва, як на нешта самаіснае, ні ад каго незалежнае, як на самамэту. На мой погляд, правільнае разуменьне мастацтва можна выявіць толькі па лініі дыялектычнага разрэзу, якая паказвае, перш за ўсё, што мастацтва—продукт творчай дзейнасьці людзкой. Маючы гэта на ўвазе, можна далей ужо казаць, якавы гэты продукт, з чаго зроблены, чым выкліканы, якое мае прызначэньне, значэньне, што выклікаў сваім зьяўленьнем у сьвет і г. д. Зусім адпадае пры такім разуменьні патрэба дашуквацца існасьці мастацтва, як „рэчы ў сабе", і гадаць, што першапрычыны—зьмест ці форма, што чым кіруе, як гэта робіць адзін з сучасных кірункаў у беларускай сучаснасьці, бяручы за аснову як быццам матэрыялізм. А адкуль-жа тады падвойнасьць гэта? Ці не пераліцаваньне гэта толькі эклектызму, якое робіцца пад фірмай матэрыялізму? Мне здаецца, што „Маладняку" гэта трэба выявіць, а выявіўшы, зрабіць адпаведныя вывады. Я болей ня буду спыняцца на пытаньні аб мастацтве. Ужо зазначанага досыць, каб падысьці з пэўнай меркай да характарыстыкі і ацэнкі творчага шляху „Маладняка".

Калі мы глянем з гэтага пункту на гісторыю беларускай літаратуры, то яна раскрываецца перад намі ў новым сьвеце. І сапраўды, я ў сваім дакладзе на пленуме ЦБ казаў, што беларуская літаратура перажывала кірунак адраджанізму, а ў кругабезе пасьля кастрычнікавым уступіла на шлях маладнякізму. Мо' тэрмін няўдалы, ня ў гэтым рэч. Пленум яго адкінуў, але факт нараджэньня новага літаратурнаграмадзкага кірунку ў разьвіцьці беларускай літаратуры пленум сьцьвердзіў. Поруч з гэтым, пленум у пункце восьмым рэзолюцыі на даклад аб „месцы „Маладняка" ў літаратуры" характарызуе гэты кірунак, як форму, у якой матэрыялізуецца клясавая сьвядомасьць пролетарска-сялянскае клясы ў эпоху Кастрычніка на Беларусі. Мне здаецца, што ў гэтым адзначэньні зьмяшчаецца якраз і погляд „Маладняка" на існасьць мастацтва. Калі-ж гэта так, то ў сьвеце гэтага погляду гісторыя беларускай літаратуры, гісторыя кірункаў яе, разьвіцьця зьяўляецца формай, у якой матэрыялізавалася барацьба беларускага працоўнага люду за сваё вызваленьне, за існаваньне, за вызваленьне сваіх творчых сіл з тых рамак, у якія яны былі апраўлены гістарычнымі ўмовамі жыцьця. Вось кірунак адраджанізму. Выступае Багушэвіч. Дае „Дудку", „Смык". Гэта продукты барацьбы за вызваленьне творчых сіл працоўнага люду, за вызваленьне яго душы з-пад тэй кары, у якую царскае самаўладзтва пастаралася загнаць гэтыя сілы і душу.

Тут агаварваюся. Хоць адзін паважаны крытык нядаўна сказаў, што цяпер душа адмяняецца, і можна і трэба без яе абыходзіцца, але я, не знашоўшы покуль што нічога другога, чым-бы яе льга было замяніць, г. зн. адзначыць псыхіку чалавека,—самыя што называюцца матэрыяльныя процэсы, буду карыстацца душою, хай яна ўжо на мяне не пакрыўдзіцца.

Дык вот-жа вазьмеце, скажам, верш Багушэвіча „Мужык". Ці ня ёсьць гэта продукт нішчэньня кары, якая з добрай ласкі паноў набыла

назву „мужык“. Ці ня форма гэта прабіваньня на паверх вось тых творчых сіл, што былі пад карою? Далей прыходзіць Купала і яшчэ з большай рашучасьцю пачынае зьдзіраць кару. Яго герой творчасьці кажа, „што я мужык, усе тут знаюць“. І вось тут выплывае само сабой пытаньне, а ці знаюць, што пад мужыком-жа чалавек?—Ня дарма Купала заяўляе ўрэшце: „але хоць колькі жыць тут буду, ніколі, братцы, не забуду, што чалавек я, хоць мужык“. Хіба-ж гэта не барацьба за існаваньне і вызваленьне з-пад кары мужыка затаеных творчых сіл? Або вось М. Багдановіч піша, здаецца, звычайны вершык „Слуцкія ткачыхі“. У чым справа? Гэта—Беларусі мінулае. Ну, былі такія, і што-ж там? Але калі зьвернем увагу на тое, што ёсьць гістарычныя весткі аб тым, што слуцкія паясы ткаліся у майстэрнях адумысловых, а ткалі іх майстры ды за добрую плату, то вынікае пытаньне, чаму-ж так? Што? Багдановіч ня ведаў гісторыі, на вошта-ж і чаму яго верш не адпавядае гістарычнай рачаіснасьці? Не, мусіць ня так. Багдановіч з вышэйшай асьветай. Дый чаму ён зьвярнуў увагу на той факт, што „тчэ забыўшыся рука замест пэрсыцкага ўзору цьвяток радзімы васілька“. Чаму раней да яго ніхто на гэта не зьвярнуў увагі? А вельмі проста, яшчэ ня было творчага вопыту, яшчэ ня было глебы, на якой мог-бы ўзрасьці падобны твор. Справа ў тым, што Багдановіч і сам, а таксама бачыў і яшчэ падобныя факты, быў узяты ў панскі палац ткаць залатыя паясы на пэрсыцкі ўзор, г. зн. атрымліваў асьвету ў чужой школе і вучылі яго там будаваць чужую культуру, а ён „забыўшыся“, як дастаў асьвету, стаў працаваць над адраджэньнем роднай культуры—стаў ткаць узор цьвятка радзімага. І то-ж не адзін ён—і Багушэвіч, і Цётка, і Купала, і Колас, і шмат іншых вучыліся ня ў родных школах,—і вось раптам, толькі дзякуючы таму, што „забыліся“ ткачыхі, паясы вышлі ня пэрсыцкія, а слуцкія—беларуская культура пачала адраджацца. Ці не констатаваньне гэта факту, сучаснага Багдановічу? Ці не адкрыцьцё гэта пад карою, якую Багушэвіч, Купала і іншыя садралі з беларускага працоўнага люду, вось гэтай здольнасьці, калі так льга сказаць, „забывацца“? Ці не знаходзім мы гэтага мотыву і ў народных казках пра жывёл? Успомніце казку пра каня, якога прагнаў гаспадар на старасьці і які паказаў льву, як з каменя выціскаюць іскры, а не ваду. Быць можа ўсе гэтыя разважаньні вельмі суб'ектыўныя, але яны якраз выплываюць з таго погляду на мастацтва, на які я зазначыў раней. Такіх ілюстрацый можна прывесьці гібель, бо фактычна ўся беларуская літаратура, якая ў свой час разьвівалася ў кірунку адраджанізму, такая. Гэта ўсё я кажу не дзеля таго, каб яе хваліць, а дзеля таго, каб вызначыць конкрэтней зьмест, з якога складаецца разуменьне кірунку адраджанізму, бо на пленуме вызначаліся толькі яго агульныя контуры. Гэта важна яшчэ і дзеля таго, што пасьлякастрычнікавы кругабег стварыў новы літаратурна-грамадзкі кірунак у разьвіцьці беларускай літаратуры. Важна і таму, што гэты кірунак, які я называў маладнякізмам, вырас з адраджанізму і на яго грунце.

І вось, калі я на пленуме казаў, што беларуская літаратура ня ведае кірункаў романтызму, сымболізму, імпрэсыянізму ў іх чыстым выглядзе, а іх элемэнты ўвашлі ў склад самабытнага кірунку адраджанізму, то гэтым самым ужо вызначылася і другая адзнака адраджанізму, праўда, у вагульных рысах, іначай кажучы, вызначаўся характар мовы мастацтва гэтага кірунку, яе, так сказаць, эстэтычныя асаблівасьці. Але дазволю сабе і цяпер на іх ня спыняцца. Зазначу толькі, што ўсе яны адзначаюцца тымі ідэямі, настроямі, пачуцьцямі, якія матэрыялізаваны ў мастацкай творчасьці адраджанізму. (Згушчэньне фарбаў, рэалістычны сымболізм і інш.).

Але далей. З адраджанізму вырас маладнякізм. Кастрычнік зьнішчыў у жыцьці тую кару, у якую былі закуты творчыя сілы беларускага працоўнага люду. Гэтыя сілы вызваліліся і ёсьць вядома, што першым словам іх на волі—была радасьць, радасьць вялікая, нячуваная, бадзёрасьць непамерная, юнацкая захопленасьць, пафос барацьбы і поўныя грудзі самых сьветлых надзей на будучыну. Такі зьмест гэтага новага літаратурна-грамадзкага кірунку, па якім пашло далей разьвіцьцё беларускай літаратуры. Гэта яго нараджэньне, яго першы кругабег. Ці маглі ў гэты кругабег вызваленьня творчыя сілы, кінуўшыся з безашчадную барацьбу за ўмацаваньне сваёй волі, гаварыць мовою адраджанізму, ці маглі яны на розныя лады казаць „невясёлая старонка", нудна, цёмна, сумна і г. д. і г. д. Ясна, што не. Ці маглі яны карыстаць у той час мастацкую творчасьць для зьнішчэньня яшчэ нязьнішчанай мяздры, што асталася на вызваленай душы? Ці маглі яны стварыць такія „клясычныя" творы, якія знаходзім у беларускай літаратуры, калі яна разьвівалася ў кірунку адраджанізму? Ясна, што не. Бо сілы йшлі на рэальную барацьбу, бо сілы накіраваны былі на працу грамадзкую, на нішчэньне ўсякай кары зброяй зусім мо' не мастацкаю, але затое вярнейшаю, такою, што адразу давала рэальныя вынікі і залівала душу радасьцю барацьбы і перамогі. Няма „клясычнага", бо гэта—маладое, новае, дасюль нячуванае,—вось першая адзнака нараджэньня маладнякізму. І хай некаторыя усьміхаюцца, калі я ўспамінаю першы кругабег маладнякізму. Мо' хто скажа: глупства—адна бурапена была, да рыканьне раніцы, кіданьне з сонцам на нажы, рожкі, да ноты розныя. А мы скажам: так бурапена, бо й трудна было знайсьці другога вобразу (мо' кепскі, дык ня было часу тады шукаць лепшых), каб выказаць бушаваўшую на волі радасьць вызваленьня творчых сіл. Бурапена—бо босыя на вогнішчы. Босыя—без кары. Як было йначай выказаць паўнату новай энэргіі, адчуваньне шырыні творчых магчымасьцяй колектыву рабочых і сялян. Так, бурапена; закліканьні, дэкляраваньні, „песьня-кліч свайго народу", як сказаў, здаецца, Чарот,—вось той матэрыял, з якога будаваўся мост для пераходу беларускай літаратуры ў новы літаратурны кірунак. Так: бурапена—гэта той будынак, у якім ажыцьцёвілася радасьць, гэта тое, з-пад чаго „зарунела, зарунела аксамітам". Гэта тое, з-пад чаго „маладняк, бач, кудравіць, ахіляе край іскравым лісьцем". Ясна, што ўсяму свой час. Была і бурапена, і плытагонства, і вяславаньне; і калі-б з-пад іх не зарунела аксамітам, калі-б з-пад іх не закудравіў „Маладняк", то, бязумоўна, мастацтва беларускае апынулася-б у крытычным становішчы, бо бурапена рэч не даўгавечная. Сунімецца бура, астаіцца, прастыне—і бурапена зьнікае, растае—астаецца адна слата. Але гэтага ня сталася на загонах беларускай літаратуры. Закудравіў „Маладняк". Гэта быў выхад з таго бураломнага становішча адраджанізму, у якім ён апынуўся ў пасьлякастрычнікавую пару. Праўда, ня трэба плюшчыць вочы, што бурапена, апрача станоўчай ролі, адыграла і адмоўную—гэта тое, што яна нарадзіла самагонную вытворчасьць мастацкіх „тавараў" сурагатнай якасьці, нарадзіла нюняньне гімнаў, адаманцыю і іншыя гожасьці, з якімі „Маладняк" ужо пачаў змагацца і з якімі і надалей трэба весьці рашучую барацьбу.

Так, гэта першы кругабег нашай сучаснасьці. А што адраджанізм, яго прадстаўнікі? Як ня дзіўна, а ў той кругабег яны як-бы спужаліся вось тых творчых сіл на волі, за вызваленьне якіх самі змагаліся праз творчасьць. І ў выніку сярод іх разьбежнасьць, адгалоскі якой і цяпер часамі прабіваюцца, калі ня ў творчасьці, то ў другой форме.

Прадстаўнікі адраджанізму апынуліся на раздарожжы перад будучынай і фактычна сталі толькі завяршаць слаўны ў свой час кіру-

нак адраджанізму. Іначай нельга ацэньваць такія літаратурныя зьявы, як „Спадчына, Безназоўнае, Водгулле, Новая Зямля, Пад родным небам, Буралом, Трэскі на хвалях“ і іншыя сямімільныя крокі па разбураных Кастрычнікам сьцежках адраджанізму. Нават больш таго, у гэтых-жа зьявах адсьвечваліся часткова натугі кінуцца ў бок стварэньня самамэтных кірункаў з тых элемэнтаў, якімі ў свой час карысталіся адраджаністыя, як сродкамі мастацкага выяўленьня. Але гэтыя натугі так і засталіся натугамі, часамі нават і да сёньнешняга дня. Чаму-ж так? З аднаго боку, таму, што ўзмацненьне сучаснага палітычнага ладу і разьвіцьцё творчай працы дало магчымасьць прадстаўнікам адраджанізму зрабіць пераацэнку сваіх сьветаглядаў і нанова абмеркаваць ролю і значэньне сучаснай гістарычнай пары. З другога боку, узрост маладнякоўскай руні як колькасны, так і якасны, урэшце, прывялі іх да прызнаньня, што

Маладняк нараджае багата,
Увесь пранізаны творчаю працаю,
Чыніць новыя сьветлыя сьвяты
У новай хаце ён.

(Бядуля).

А адгэтуль ужо і сьвядомасьць у неабходнасьці выхаду на новы шлях, як гэта выявілася ў закліканьні Бядулі кінуць „у тлань паднявольніцу-спадчыну“ і адагнаць „думкі цьмы—недабіткі з кроснаў матчыных“. Гэты новы шлях бачыць і Янка Купала, калі ў дзень свайго 20-і гадовага юбілею кажа:

Сягоньня ўжо працерабіўся гэты шлях:
На гонях родных не пануе нелюдзь,
З душы спадае перад будучынай жах,
Да новага жыцьця сьцягі віднеюць.

І далей, як вынікам з гэтага, поэта вклікае:

Дык-жа шумі, красуй у волі, родны край!
Зьвіні у свой звон, сялянска пролетарскі звон!
Сьпявай ты, Беларусь, у радасьці сьпявай!
Твайго народу сёньня і права і закон.

Але далей, калі зарунела—значыць добра, значыць радасьць новая. Але сяйбіт—Кастрычнік—ён і добры гаспадар і настаўнік. Ён ведае, што „засохне прыбалотны хмызьняк, калі песьня журбу не прагоніць“, як сказаў, здэцца, Дубоўка. А фактычна „Маладняк“ першага кругабегу быў толькі прыбалотным хмызьняком, калі хочаце. І журбы тэй было многа. „Хоць у горадзе і ў новых ботах ды з журбой васільковай у вачох“, казаў А. Вольны. Рунь узышла, але й журба ёсьць, журба, каб ня толькі духоўна, але й матэрыяльна вызваліць душу беларускага працоўнага люду, журба, каб па дроту сонца ў вёску пусьціць. Апроч таго, сюды далучылася журба і тая, якая нараджалася ад бурапены. Вось якімі нотамі вызначаецца пачатак другога кругабегу беларускай літаратуры ў кірунку маладнякізму. Да радасьці, бадзёрасьці, нявычарпанай энэргіі і раптам далучылася журба. Што думаеце, гэта мо' пачатак упадніцтва, дэкадэнсу, як некаторыя з крытыкаў абзывалі? Не, гэта журба не ад няма чаго рабіць, а ад таго, што вельмі многа працы, і ад жаданьня, як найхутчэй зрабіць гэту працу, бо-ж босыя на вогнішчы, а босаму пячэцца. Вось якая гэта журба. Не, гэта не інтэлігенцкая, а здаровая—маладнякоўская. Так, бо і сапраўды трэба песьня, каб не засох прыбалотны хмызьняк. Трэба паглыбляцца ў мастацкай працы. Трэба рунь неяк гадаваць і ахоўваць, каб „нечаканыя пагоні“ жыта ня зьбілі.

Вось тут і пачынаецца зьбіраньне мастацкіх сіл і іх аб'яднаньне. Кідаецца гасла бадзёрасьці ў творчасьці, што дае магчымасьць сабраць лепшыя сілы. І вось тут першыя рожкі са „старымі“, першыя рожкі, за права на існаваньне на літаратурнай ніве, за ўплывовасьць на масы, за панаваньне ў літаратуры пролетарскай ідэолёгіі. Словам, жыцьцё літаратурнае было ўзбурана. Зачокалі кілішкі, праўда, яшчэ ня буйных слоў, але заўсёды сьмелых. Зышліся ў рожкі і адчулі патрэбу яшчэ большую ў буйных словах, у моцнай песьні, патрэбу большай організованасьці, колектыўнай аформленасьці і заўладаньня мастацкімі сродкамі. Пачынаецца шырокая грамадзка-літаратурная праца. Адна за другой паўстаюць філіі, і сьпярша невялічкая група „Маладняка“ вырастае ў працягу году ва Ўсебеларускае Аб'яднаньне поэтаў і пісьменьнікаў. Творчасьць за гэты час як-бы слабее, бо сілы накіраваны на творчасьць організацыйную. І вось, як ня дзіўна, а „формаю“, у якой матэрыялізавалася клясавая сьвядомасьць у гэты кругабег, былі, калі хочаце, протоколы, статуты, дэклярацыі, перапіскі, выезды, выступленьні, масавыя вечары і г. д. і г. д. Скажаце, якая-ж гэта мастацкая праца,—а я скажу,—вось якая: выяўлена каля 500 маладых сіл. Не скажу, што ўсё гэта—мастацкія сілы, што ўсё гэта—ужо сталыя пісьменьнікі, поэты. Не, гэта толькі яшчэ босыя на вогнішчы, але ўжо з прагным жаданьнем тварыць палац працы, тварыць тую песьню і тыя буйныя словы, ад якіх не засохне прыбалотны хмызьняк, ад якіх уцячэ журба, ад якіх жыта зашуміць буйнымі каласамі. Тварыць тое, што зьнішчыць быльнікавыя межы і саломены крык і творыць ня толькі ў галіне мастацкай літаратуры, але ва ўсіх галінах беларускага мастацтва. Вось чаму новы кірунак—маладнякізм пленумам названы ня толькі літаратурным, а літаратурна-грамадзкім, бо сама грамадзкасьць, як ні парадоксальна, асталася формаю творчасьці. Калі я сказаў, што протаколы былі формаю творчасьці, мо крыху і перасаліў, бо поруч з імі йшла і творчая праца, праўда, прыцішаным крокам. У гэты кругабег уваходзяць: „Комсамольская нота, Беларусь бунтарская. Па беларускім бруку, часопісь „Маладняка“, Комсамольскі вечар“, друкуюцца маладнякоўскія творы ў газэтах і іншых часопісах. Выдаецца № 1 „Маладняка“ Калінінщчыны, выдаюцца маладнякоўскія насьценныя газэты (Масква, Клімавічы, Хоцімск і інш.). „Маладняк“ ідзе ў масы, там правярае свой шлях і той кірунак, па якім пашло разьвіцьцё беларускай літаратуры, імкнучыся да пролетарскай. І гэта ўсё таксама форма матэрыялізацыі клясавай сьвядомасьці. Сродкі мастацтва нітуюцца з сродкамі грамадзкімі. У выкананьне запавету Леніна праводзіцца праца па зьбліжэньні мастацтва з жыцьцём, імкненьне да таго, каб мастацтва стала ўсенародным. І вось тут якраз пункт, у які заўсёды цалялі ў „Маладняк“ тыя, каму „Маладняк“ стаў бяльмом у ваччу. Незразумеласьць—іх быў канёк, хоць і цяпер часамі ня выводзіцца, толькі набывае інакшыя формы. Ня ведаю, судзеце самі, ці на правільным шляху стаяў і стаіць „Маладняк“, калі лічыць, што да таго, каб мастацтва стала ўсенародным, каб мастацтва зьнітавалася з жыцьцём, трэба не мастацтва зьніжаць да прымітыўнасьці, а рабоча-сялянскія масы ўзьнімаць да мастацтва праз ліквідацыю сярод іх, калі льга так сказаць, мастацкай няпісьменнасьці. Філіі „Маладняка“, яго літаратурна-грамадзкая праца, студыйная—гэта сродкі і шляхі да разьвязаньня гэтай задачы.

І сапраўды, „незразумеласьць“ у той час, калі масы работніцка-сялянскай моладзі папаўняюць рады „Маладняка“—цікавае зьявішча. Выходзіць, што не разумеюць творчасьці, а ў „Маладняк“ ідуць. Што такое? А справа ў тым, што не „незразумеласьць“ крыецца ў закідах на

„Маладняк“, а крышку нешта іншае. Пад відам нападак на „незразумеласьць“ уцішку праводзілася змаганьне з тэй пролетарскай ідэолёгіяй, з тэй марксыцкай пляцформаю, на якую стаў „Маладняк“, і праводзілася тымі, хто адчуў, як пачынае выбівацца з-пад іх ног глеба для ўплывовасьці на масы. Другая справа, калі на незразумеласьць скардзяцца самі рабоча-сялянскія масы. Гэта толькі кажа пра тое, як шмат яшчэ трэба працаваць над ліквідацыяй няпісьменнасьці, каб тая ці іншая песьня ці наогул мастацкі твор стаўся ўсенародным здабыткам. Праўда, ня трэба плюшчыць вочы, што часамі незразумеласьць вынікае і ад таго, што ў мастацкім творы ды якраз вось і бракуе самой мастацкасьці. З гэтым „Маладняк“ змагаецца і надалей павінен усімі сіламі весьці змаганьне з сурагатамі мастацтва. Так нам мысьліцца існасьць пытаньня „незразумеласьці“. І трэба цьвёрда праводзіць межы тых асноў, якія крыюцца пад відам „незразумеласьці“.

Але далей. Праходзіць год існаваньня „Маладняка“. Сілы больш-менш сабраны, колектыўна аформлены, шляхі вызначаны, маяк відаць, у творчасьці мова мастацтва паглыбляецца, набывае больш сталасьці, „абмацваецца грунт“, як адзін з пісьменьнікаў быў пасьмяяўся. А фактычна і было так—абмацваньне грунту творчага. Адны яго шукалі ў народнай творчасьці, адкуль паводка вобразаў, другія—у мастацкай літаратуры папярэдняй, трэція—у суседніх літаратурах, а чацьвертыя—проста ў жыцьці, палажыўшы ў аснову сваёй творчасьці прынцып творчасьці Кастрычніка, а іменна, зьмену высокіх жанраў нізкімі ў тым сэнсе, што герояў у сваёй творчасьці шукалі ў самым жыцьці рабочых і сялян, бралі іх з самых звычайных будняў. Гэта пачатак апошняга кругабегу, пачатак зацішша. Гэта другі год існаваньня Маладняка. Маладнякоўцы ўглыбляюцца ў студыйную працу пад аформленьнем індывідуальным у творчасьці, бо ведаюць, што без індывідуальнага творчага аформленьня мастацкая літаратура разьвіцца далей ня зможа. Вось гэта праца, гэты перагляд і пераацэнка, быць можа, у некаторых сяброў сваіх твораў і пуцін творчасьці (збоку тэхнічнага, вядома); гэта праца нікому нявідная, а таксама-ж зьяўляецца формаю матэрыялізацыі клясавай сьвядомасьці. Гэта праца ўжо зьвязана і з чарнавікамі, а ня толькі з друкам, часамі нават скорасьпелых твораў. Тут ужо і сталае студ'яваньне клясыкаў (у сэнсе здабыткаў мінулага) як сваіх, так і літаратур чужаземных. Тут якраз і пачатак убіраньня ў сябе ўсяго каштоўнага з мінулага і пераапрацоўкі яго на глебе пролетарскай ідэолёгіі. Як вынік гэтага—зьяўленьне перакладаў з расійскай, украінскай, нямецкай і ангельскай моў, якія робяцца маладнякоўцамі. З нямецкай пераклады ўжо зьявіліся ў друку з Гейнэ і Шылера, з ангельскай здаецца ў друк Аскарда Уальда „Баляда Рэдынгскай турмы“. Што „Маладняк“ зацікаўлены студыйнай працай сваіх сяброў, а таксама ліквідацыяй мастацкай няпісьменнасьці сярод мас, аб гэтым сьведчыць і такі факт, як набыцьцё да выданьня ў маладнякоўскай кніжніцы перакладу з грэцкае: „Антыгоны“—Софокля, зробленага не маладнякоўцам. Вынікам гэтай „чарнавой“, калі так льга сказаць, творчай працы зьяўляецца таксама і маладнякоўская літаратура, якая ўжо ёсьць і факта стварэньня якое ніхто ня можа адкінуць.

Вось тут ужо мы можам сказаць, што даў „Маладняк“ рэальнага беларускай літаратуры, а цераз гэта і наогул беларускай культуры, як вялікаму чыньніку социялістычнага будаўніцтва, і конкрэтна вызначаць зьмест таго новага літаратурна-грамадзкага кірунку, а калі хочаце, маладнякізму, па якім ідзе разьвіцьцё беларускай літаратуры сёньня. Фактычна мэта адна—менавіта, літаратура пролетарская, як адзін з сродкаў будаўніцтва будучай культуры соцыялістычнай, як адзін з ма-

гутных чыньнікаў гэтага будаўніцтва. І ўсе шляхі, (калі казаць пра тэхніку творчасьці), якія вялі да яе, так і вядуць. Мы маем (я буду называць іменьні сяброў „Маладняка“, як іменьні, з якімі зьвязваецца ўжо пэўнае прадстаўленьне аб творчасьці) Гурло, Чарота, Дубоўку, Вольнага, Александровіча, Дудара, Пушчу, Труса, Якімовіча, К. Чорнага, Зарэцкага, Крапіву. Гэта большасьць аформіўшаяся і цэлы шэраг другіх, якія знаходзяцца ў стане аформленьня. Назаву такія іменьні, як Хурсік, Дубовік, Туміловіч, Бобрык, Звонак, Серада, Пфляумбаўм, Вішнеўская, Бандарына, Слуцкія песьняры—Шукайла, Сукала, Атава і г. д.

І вось, калі пераглядаеш творчасьць названых поэтаў і пісьменьнікаў, то перш за ўсё паўстае пытаньне, ці зьяўляецца маладнякоўская літаратура працягам мастацкіх (не ідэолёгічных) традыцый літаратуры мінулага, на якой глебе яна ўзрастае, ці зьяўляецца яна працягам гісторыі барацьбы за існаваньне і поўнае вызваленьне душы (няхай выбачаць крытыкі некаторыя за душу), душы працоўных, душы беларускага рабочага і селяніна ад тых пут і кары, якія засталіся яму спадчынай ад мінулага, ад панаваньня на яго карку памешчыка, фабрыканта і царскага самаўладзтва? Тут якраз і розьніца адраджанізму ад маладнякізму. Першы давёў літаратуру да тэй ступені, калі рабочы і селянін скідае з сябе путы нацыянальнай няволі і разбурае рамкі няволі соцыяльнай, другі вядзе далей да тэй ступені, калі рабочы і селянін пераступае парог у соцыялізм і комунізм, калі дашчэнту вызваляецца ад матэрыяльных пут. Дык вось трэба сказаць, што маладнякоўская літаратура не парвала мастацкіх (не ідэолёгічных, зноў падкрэсьліваю) традыцый, яна не пераскочыла праз вопыт мінулага, яна толькі вырасла з тых рамак, у якіх разьвівалася папярэдняя літаратура і тым самым разбурыла рамкі адраджанізму і вышла на ширшы шлях, адкінуўшы тое, што ўжо зроблена ў сэнсе змаганьня за права на існаваньне беларускай душы. Не дарма-ж адзін беларускі дзеяч выхад у сьвет „Босых на вогнішчы“—Чарота кваліфікаваў, як крымінал. І сапраўды, у адносінах да адраджанізму „Босыя на вогнішчы“ ўчынілі крымінал. Гэта ясна. Маладнякоўская літаратура йдзе поплеч з жыцьцём, цьвёрда стоячы на грунце марксыцкіх ідэй, як адыходнага пункту.

І сапраўды, вось творчасьць Чарота. Хто герой яе? Бязумоўна, ня „я“, як індывідуальная адзінка, да чаго дакочваюцца некаторыя з старэйшага пакаленьня, „гайдаючыся ў рыхт па кірунку дзяроў“, як сказаў Цішка Гартны. Герой творчасьці Чарота—гэта „я“ босага на вогнішчы. Гэта „я“, якому імя комунар. У „Завірусе“ мы бачым яго мяцежнага, бунтарскага, бачым трыбуна і барацьбіта, які жыве аднэй думкай—старое спаліць, а на руінах новы палац пабудаваць, які верыць, што сам будзе мераць усю зямлю. У „Босых на вогнішчы“ гэта „я“ выступае ўжо ў шматлікім вобразе і імя яго—„мы“. „Мы дзеці краіны, дзе бура бушуе... Мы на прадвечных руінах працы палац пабудуем“...—вось іх твар. Гэты герой праходзіць і ўрэшце твораў Чарота. Так, у „Чырвонакрылым вяшчуне“ гэта „я“ выяўляецца як вобраз, які ўбірае ў сябе ўсю шырыню кругагляду. Гэта прогноз на будучы лёс разьвіцьця грамадзкага руху. У „Беларусі Лапцюжнай“ гэта „я“ босага на вогнішчы выступае ў постаці да краёў перапоўненай цьвёрдаю ўпэўненасьцю ў свае сілы і шырыню іх магчымасьцяй. Гэта яно адважна і сьмела заяўляе: „Ня жыць таму, ня мае хто адвагі, ня верыць хто ў пабеду сваіх сіл“. Нарэшце, апошняя поэма—„Карчма“. І тут адчуваецца прысутнасьць галоўнага героя усёй творчасьці Чарота.

Калі ў ранейшых творах гэты герой выступаў, як адважны падарожнік да сьвету новага і вялікага, як падарожнік, які ня гіне ў завірусе, то ў апошняй поэме ён увасабляе сабою ці, я-б сказаў, зьяўляецца як-бы жывой конструкцыяй тэндэнцый разьвіцьця сёнешняга грамадзкага руху. Сёньня ён сапраўды будаўнік, зямляўпарадкваецца. І тут для яго няма перашкод ў розьніцы нацый, бо босых злучае ў адно „мы" не нацыянальныя адзнакі, а тое, што яны босыя і што на вогнішчы. І хіба-ж гэта ня ёсьць форма матэрыялізацыі клясавай сьвядомасьці рабочых і сялян, хіба герой чаротаўскай творчасьці ня ёсьць жывая постаць вызваленай душы беларускай, якая выяўляе ў барацьбе і працы адну самую галоўную ўласьцівасьць—гэта веру ў свае творчыя сілы, у сілу колектыву? Гэтае „я" чаротаўскае ці ня ёсьць яно выяўленьнем у самым жыцьці, у барацьбе і працы вось якраз таго, што выяўлена ў вершы Купалы „Мужык" словамі: „я буду жыць, бо я мужык"?

Далей возьмем Дубоўку, які даклярыруе слухаць „як гамоняць каласы ў купальскай хвілі. Нечаканыя пагоні капытамі жыта зьбілі"... Асноўнае яго творчасьці—гэта тое жывучае, тое прагнае да жыцьця, якое разьліта ўва ўсёй прыродзе таго краю, дзе шуміць трысьцё. Яго жывучасьць—гэта жывучасьць самога трысьця. Гэта жывучасьць і прагнасьць,—завіць смагу жыцьця ў вянок усяго жывога на зямлі,—для Дубоўкі зьяўляюцца сынонімамі прыгожасьці-красы. Яго асабовае—гэта ня толькі яго ўласнае, гэта такое, як подых „і жывіцы сасновай, а таксама хварэе чым дуб". А дуб хварэе тым, што карэньні глыбока ў зямлю запусьціў і што жыве сотні год. Так і гэта асабовае, яго „рукі карэньням ў жвір і глей" у самы звычайны, а вочы нурцуюць у неабсяжных прасторах. Гэта асабовае—гэта тая жыцьцёвая сіла, якая ня гоніцца за захмарнымі краямі, як гэта ёсьць у некаторых з старэйшых, а моцна трымаецца зямлі, бо ведае, што прыгожасьці шмат тут у нізе, блізка, вось пад рукамі, што прыгожасьць у самым жыцьці (росьце, красе, змаганьні), што „сіньшы за неба ад соку лён". І вось гэта жыцьцёвасьць, гэта прагнасьць завіцца ў вянок жывога, ажыцьцявіцца ў яго каралях, гэта безаглядная прагнасьць жыць і пусьціць свае парасткі ў заўтрашняе—гэта яно галоўнае і ва ўсіх поэмах Дубоўкі. Яно адзінае і мэта яго адзіная—жыць, жыць і жыць, хоць мяняючы вопратку, мяняючы формы, свайго ажыцьцяўленьня, але жыць і шыршыя колы жывога сабою паіць. Такая вось асноўная струна творчасьці Дубоўкі. У ёй адчуваецца кроў вось якраз той народнай акавіты, якая цячэ ў жылах беларускіх рабочых і сялян і якая іх ускрасіла да новага жыцьця. Апроч таго, творчасьць Дубоўкі—гэта сынтэз вопытаў папярэдняй літаратуры ў галіне выяўленьня шырыні і глыбіні імклівасьці беларускай душы. Каб слухаць трысьцё, трэба сьпярша прайсьці вось гэтыя папярэднія даліны. Іначай будзе тое, што поэта выказаў словамі „у душы поэта чорт зламае карак". Вось якая бывае незразумеласьць. Праўда, на гэта ён ня будзе скардзіцца, бо не вінават-жа той, хто падыходзіць к трысьцю, што ён быў дасюль бяз долі, што яго трымалі ў цемені пад караю мужыка. Праўда, крыўда вялікая, і поэта кажа далей: „Плач душою, а часіны прыдуць, сьлёзы завіюцца ў каралі", бо і восень жуaравінамі плача. І сапраўды, ці-ж не завіліся ў каралі сьлёзы, якіх так многа ў беларускай літаратуры да кастрычнікавай пары? Так, калі песьня журбы не прагоніць, яе не адкіне далонь,—вось сынтэз вопыту адвечнага па беларускіх загонах.

Трэцюю старану душы беларускай выяўляе Ан. Вольны. Гэта—васільковая журба, гэта—адвечная цяга беларуская да зямлі, жаданьне

бязьмернае абняць жытнёвыя палі, пусьціць у вёску сонца па дроце. Гэта-ж чырвонай ніткай праходзіць і ў поэме „Кастусь Каліноўскі“ і ў „мне і тут без Беларусі цесна“.

Далей Пушча. Асноўнае яго творчасьці—гэта „я“ мастака-сугля-дальніка, выгадаванага на прыполе прыроды, сярод яе шматфарбных вобразаў. Гэта „я“—быццам чарка возера, у якім адбіваюцца і з якога выплываюць адзін за адным вобразы успрынятай нутром вакольнасьці. І да ўсяго гэта „я“ падыходзіць з нейкай пяшчотнасьцю замілаванага мастака. „Сахою я гонейкі песьціў, кілзаючы сонца ў шлеі“. Не араў, а песьціў, ня выходзіў у поле ўсходам сонца, а кілзаў сонца ў шлеі. Гэта „я“—буян, але і буяніць яно ня ломячы, ня крышачы, а раніцай, раніцай, якая ўмывае сонейка, каб выганяла пасьвіць на сіні выган дзень, якая зганяе смугу памялом. Гэта „я“ буяніць тым, каб увесь край умыць сьветлымі і яснымі фарбамі радасьці. Для яго Беларусь ня проста Беларусь, а Маладзіца, у якое ўсё на паслугах: і раніца, і сонца, і песьні. А песьні ня проста песьні, а музыка слоў, шуманьне вобразаў сьмелых паводкаю. Песьня—гэта сяліба, пазалота. Гэта „я“—маладняцкі паўстанец, поўны веры, што радасьць паўдня за кустом яго песень усьміхнецца. Гэта „я“ падняло золата раніцы з сьмецьця, бо яно мастак, і увесь сьвет, здаецца, размалявала-б у сьветлыя радасныя фарбы. Ці-ж ня новы куток магчымасьцяй беларускай душы адчыняецца перад намі ў творчасьці Пушчы? Той куток, які ў Янкі Купалы адклікаецца на музыку-гаворку неба, сонца, месяца і г. д., песьняй, а ў Я. Пушчы ўбірае ў сябе фарбы і праз песьню імі ўспрыгажае сваю Маладзіцу-Беларусь.

Процілежны калі так льга сказаць, Ан. Вольнаму куток душы адкрываецца ў творчасьці Дудара. Гэта тое, што ад вёскі цягнецца ў горад, тое, што знаходзіць „айчыну другую ў сталёвым лёскаце варстатаў,“ гэта тое, што знаходзіць Беларусь у „старых гарадзкіх сутарэньнях“, для каго Беларусь у фабрычных трубах, Беларусь нікім яшчэ ня зьмерана, для каго спыніць працу на момант — знача стагодзьдзі назад, для каго „палаюць агнямі думкі, — а Беларусь—недасяжным узвышшам“. І гэты герой творчасьці дзеля таго, каб Беларусь на ўзвышшы ўзьняць, ахапляе шырокія кругі жыцьця. Адпаведна гэтаму пашыраецца і аўладаньне мастацкімі сродкамі. Так, зборнік Дудара „Сонечнымі сьцежкамі“ аб гэтым яскрава сьведчыць. Тут бачым перабіраньне тых формаў, якія першым унёс у беларускую літаратуру Багдановіч. Гэта адыходны пункт і дарога цераз зоры, што „рассыпалі песьні каля возера ў трысьці“.

Дудар, як поэта гораду, выступае ўжо другім. Першым на гэтую ніву выступіў А. Александровіч і паказаў аблічча Беларускага бруку ў тых засьцілах, якія сёньня яго ўкрываюць. Першы ўносіць новыя гарадзкія мотывы. Так, гэта два поэты, якія працягваюць у даным выпадку традыцыю М. Багдановіча. Так, „стукаюць тут цяжкія молат за молатам, сыплюцца іскры за іскраю золатам, бляскі кладуць на зямлі... Цяжкаю працаю заняты тут волаты: жыцьцё куюць кавалі“. Вось як констатуе ў мастацкай творчасьці творчую працу найстарэйшы маладняковец А. Гурло. Так, гэта каваньне жыцьця, жыцьця ў мастацкай творчасьці і цераз мастацкую творчасьць.

Нарэшце, мне хочацца яшчэ адзначыць творчасьць Кузьмы Чорнага, якая таксама мае свайго улюбёнага героя—гэта чалавека ціхага (як яго звычайна лічаць) суглядальнага, напоўненага радасьцю існаваньня, для якога на сьвеце важна „тое, чалавекам створанае, чым можна заглушыць воўчыя галасы ў быльнікавых межах і саломенны крык вёскі, пад ударамі буйнага ветру“. Вакол гэтага героя К. Чорны

і паказвае жыцьцё так, як яно ёсьць, паказвае сьвет тыпаў беларускіх нізін, якія ціха, здаецца, і нявідна для другіх, а будуюць новае сьветлае жыцьцё бяз быльнікавых меж. У вапошні час сваю творчасьць К. Чорны як-бы падагуліў у вапавяданьні „Вечар“, дзе дадзены вобраз жыцьця ў яго, так сказаць, папярэчным разрэзе, дадзены псыхолёгічныя, я-б сказаў, конструкцыі людзей, схваченых вокам у вадзін міг жыцьця.

„Вечар“—гэта выяўленьне багацьця жыцьця нізіны, яе шырокія псыхолёгічныя засьцілы, яе рознастайнасьць, шматфарбнасьць і рознагучнасьць. І ў той-жа час гэта выяўляецца як нейкая дзівосная гармонія, якою замілаваўся мастак-музыка. Асаблівасьць, наогул, усёй творчасьці Кузьмы Чорнага ў тым, што жыцьцё перад ім—гэта як-бы вялікая кніга, якую ён чытае з захапленьнем. Адначасна з гэтым ён як-бы йграе на дзівосным жывым інструмэнце, і яго пальцы асьцярожна яшчэ кратаюцца клявішаў жыцьця, але ад гэтага дакрананьня вырываюцца гукі, і Кузьма Чорны іх як-бы выпрабоўвае, вывучае, падбірае тоны, каб даць той ці іншый акорд. І вось ёсьць гукі, тоны, паасобныя акорды, але, трэба сказаць праўду, няма яшчэ мэлёдыі, няма дыалектычнага разьвіцьця акордаў, няма яшчэ таго, што ўтварае мэлёдыю—пэўнага мотыву ў сюжэтным разгортаньні. Яго далейшы шлях—гэта шлях да стварэньня мэлёдыі жыцьця. І Кузьма Чорны ўжо ступіў на гэты шлях. Яго „Вечар“—гэта мастацкая споведзь, споведзь мастака аб сваім адчуваньні жыцьця, аб сваіх шляхох яго пазнаньня. Адгэтуль пачынаецца і пашырэньне творчага шляху, аб чым сьведчаць адрыўкі з апавяданьня „Раніцаю“ і „Па дарозе“. Адгэтуль пачынаецца ўжо творчасьць на шырокіх палотнах.

Ня буду больш стрымліваццa на характарыстыцы творчасьці рэшты маладнякоўцаў. З аднага боку, яе цяжка рабіць, бо няма часта яшчэ акрэсьленага афармленьня, а з другога боку, кожны новы дзень прыносіць новыя каралі ў Маладнякоўскі вянок мастацкай творчасьці. Вось хоць-бы ўзяць Паўлюка Труса. Яго творчасьць можна толькі параўнаць з бурнай веснаплыньню прабіўшайся з беларускіх нетраў крыніцы, якая імкліва нясецца наперад і наперад, ломячы ўсякія перашкоды і ўбіраючы ў сябе ручайкі і рачулкі, якія булькочуць на мастацкіх далінах. Крыніца гэта з кожным днём пашыраецца і набывае ўсё новыя і новыя адценьні колераў ад таго, што ўбірае ў сябе новыя воды, і ад таго, што выбіваецца на новай прасторы. І цяпер яшчэ рана казаць, што вынясе з сабою гэта крыніца. Можна толькі казаць, што яна ў сабе зьмяшчае поруч з нейкім музычным лірызмам і акавіту беларускай гумарыстыкі. Можна казаць, што гэта крыніца шмат абяцае беларускай літаратуры, бо карэньні яе моцна ўростаюць у жвір і глей сучаснасьці, у жвір і глей народнага вопыту ў мастацкай творчасьці. Тое самае трэба зазначыць і пра першыя выступленьні, я-б сказаў, наймаладшых маладнякоўцаў у васобах Дубовіка, Серады, Глебкі, А. Звонака і шмат іншых. Асаблівасьць творчасьці гэтых апошніх у тым, што яны новых песень звонкія гаммы носяць-тояць сьпярша за пазухай, аж пакуль яны ня выліваюцца ў цьвёрдыя, гібкія і аточаныя звонкія формы, што яны адыходзяць у сваёй творчасьці ад тых узвышкаў, на якіх стаіць ужо разьвіцьцё беларускай літаратуры сёньня, што яны аднолькава вітаюць, як творчы вопыт і хмель вясны і маркоту ўвосень, слухаюць песьні і дажынак і дакосін, слухаюць скаргу апаўшых лістоў, бо з гэтага-ж творчага вопыту яны пазналі, што „мастацкай“ пагоды нязьменнасьць—сухмень выпаляе і збожжа і травы“, што „моногамы пачуцьцяў пякней расквітаюць бяз рам і апрavы“, (М. Дубовік), ясна бяз рам і апраvы адраджанізму. І пяюць гэтыя „намалодшыя“ якраз пра

тое, пра што не ўспамінаў яшчэ ніхто. Гэта новыя „ветры ў худую даліну сыплюць звонкія песьні бяроз“. Да слова сказаць, у гэтай новай плыні маладнякоўскай творчасьці знаходзім як ня трэба лепшую ацэнку сучаснай творчасьці прадстаўнікоў адраджанізму, якая выказваецца ў Серады словамі „Лістападам пяюць вераб'і, сьпевы віснуць журбою ў лістох“, а ў Звонака словамі „Над голаю раўнінаю не калыша вецер каласоў. Ціха так. І сэрцу неяк дзіўна...“ І сапраўды, творчасьць адраджаністых—гэта лістапад, завяршэньне толькі свайго ранейшага кола. Адгэтуль і ціха так у вапошні год сярод іх. І вось што ціха так і рвецца слова цёплае з душы маладых, бо як сказаў, здаецца, Казлоўскі, „дні як-бы тыя вагоны мігацяць. Ляцяць ланцугом..“, бо ад таго, што ціха так, „бунт уздымае душа і трывогу на сэрцы сьцеле“ за лёс беларускага мастацтва. Вось з якіх узвышшаў узьнімаецца новая плынь творчасьці, і шлях яе адзін—гэта тварэньне беларускага мастацтва, як магутнага чыньніка соцыялістычнага будаўніцтва, будаўніцтва такога, пры якім „Беларусь больш ня стане крыжам пры дарозе з хрыстом расьпятым“, як кажа Серада. І ці трэба перакладаць ідэі з мовы мастацтва маладнякоўскага на мову соцыолёгіі, каб адшукаць соцыолёгічны эквівалент гэтых літаратурных зьяў? Мне здаецца, што маладнякоўская літаратура гэта якраз той вобраз, у якім матэрыялізавалася наша грамадзкая сучаснасьць з яе імкнёнасьцю да соцыялізму і комунізму. І сапраўды, нават тое асноўнае, што выяўляецца з творчасьці Чарота, Дубоўкі, Дудара, Вольнага, Пушчы, Чорнага і шмат іншых, яно ні больш ні менш, як адбітак асноўнага ў грамадзкім руху пасьля кастрычнікавай пары, як вобраз яго дзейных сіл, вызваленых Кастрычнікам і накіраваных да соцыялізму. Вось чаму і кірунак, па якім ідзе разьвіцьцё беларускай літаратуры я называю маладнякізмам, бо ўсё гэта маладое, здаровае, жыцьцёвае з імклівасьцю да росту і росту.

Мне здаецца, што гэтых невялічкіх ілюстрацый досыць дзеля таго, каб сказаць, што творчыя традыцыі маладнякізмам увабраны ў сябе ад адраджанізму, і што новы літаратурна-грамадзкі кірунак у разьвіцьці беларускай літаратуры мае ўжо цьвёрдую глебу для свайго далейшага разьвіцьця, што ў форме гэтага кірунку вызваленыя творчыя сілы шырока выявілі ўжо сябе і стварылі станаўленьне таго маладога, што складае існасьць усякага мастацтва. Гэта выяўленьне душы вольных рабочых і сялян, выяўленьне ідэй і настрояў грамадзкага руху зьяўляецца фактычна *адраджэньнем жыцьця і яго станаўленьнем у беларускай мастацкай творчасьці.*

Адгэтуль выплываюць і далейшыя задачы, якія стаяць перад маладнякоўскай літаратурай—ахапляюць як мага шырэйшы круг праяўленьня асноўнага ў творчасьці кожнага маладнякоўца.

Другая задача—вышываць па канве марксыцкай ідэолёгіі ўзоры гэтага асноўнага на шырокіх палотнах жыцьця і ня толькі ў яго папярэчным разрэзе, але і ў прадоўжным.

Маладнякоўцы павінны пашырыць рамкі ўбіраньня ў сябе творчага вопыту як народнай творчасьці і папярэдніх беларускіх пісьменнікаў, так і творчага вопыту літаратур Захаду і Ўсходу, каб на гэтым грунце стварыць *станаўленьне новага жыцьня мастацтва, як формы матэрыялізацыі вялікага стыку Захаду і Усходу.*

Нарэшце хочацца зазначыць яшчэ на адну задачу—гэта на чыстату мовы беларускай у мастацкай творчасьці. Некаторыя маладнякоўцы, асабліва з малодшых, не асабліва ўважна адносяцца да гэтай стараны творчасьці.

Гэта ўсё тое, што патрэбна для поўнага станаўленьня маладога жыцьця ў мастацкай творчасьці. І тады, што сёньня здаецца марамі, заўтра будзе здабыткам жыцьця.

## Прамова таварыша Чарвякова на 1-ым Усебеларускім зьезьдзе „Маладняка“.

Таварышы, з вялікай прыемнасьцю вітаю ваш зьезд, а разам з гэтым усю вашу організацыю. Мне здаецца, што ўсякі, хто працуе над пабудовай соцыялістычнага парадку, будзе вітаць вашу організацыю. Яна зьявілася як вынік рэволюцыйнага ўздыму, які зрабіў вялікі Кастрычнік, які паставіў нашу краіну на цьвёрды шлях пабудовы соцыялізму. Ваша організацыя, таварышы, зьявілася папаўненьнем да ўсяго таго, што ў нас стварылася разам з Кастрычнікам. Яна прышла трохі пазнавата, але ўсё-ж яна прышла ў пару. Наша праца над пабудовай матэрыяльнай часткі нашага жыцьця ў першыя гады рэволюцыі ня мела свайго мастацкага афармленьня. Нашы старыя мастакі, якія адыгралі вялікую ролю ў мінулым, якія адносяцца да так званага пэрыоду адраджэньня ў пераважнай большасьці не змаглі пайсьці крок у крок з Кастрычнікам. І пагэтаму мы, у першыя гады сваёй працы, ішлі ўперад без рэволюцыйнай беларускай песьні, без беларускага рэволюцыйнага песьняра. Мы ня мелі такога мастака, які-б адчуваў вялікае значэньне Кастрычніка для працоўных мас Беларусі; мы ня мелі таго, хто даў-бы мастацкі прызыў свайму падняўшаму галаву народу. Усё гэта, таварышы, нясе з сабою „Маладняк“. Ён павінен запоўніць тое, чаго нам не даставала, і таму ясна, што, як адыгрываючаму надзвычайна вялікую ролю ва ўсёй нашай працы, ва ўсім нашым жыцьці, мы нясем „Маладняку“ наша шчырае прывітаньне. *(Воплескі).*

Ясна, таварышы, што, вітаючы „Маладняк“, адзначаючы яго ролю ў жыцьці, мы разам з гэтым павінны ясна разумець тыя задачы, якія стаяць перад „Маладняком“ і якія ён павінен выконваць у сувязі з умовамі нашага жыцьця, у сувязі з агульнымі задачамі, якія стаяць перад намі ў Беларусі.

Мы творым, таварышы, соцыялізм. Гэты соцыялізм мы творым у пераважна сялянскай краіне. Да соцыялізму мы ідзем праз Савецкі парадак, у якім кіруючую ролю йграе рабочая кляса. І вось нам, таварышы, трэба дапамагчы беларускаму селяніну зразумець, што ён павінен пайсьці па шляху дыктатуры пролетарыяту, што ён павінен добраахвотна прыняць сабе за правадыра рабочую клясу, каб разам з ёю будаваць соцыялізм.

Да гэтага, таварышы, мы будзем ісьці рознымі дарогамі; і мы будзем ісьці з розных бакоў як шляхам экономічнага будаваньня, так і шляхам ідэолёгічным. І вось, маючы ў падставе новае соцыялістычнае будаваньне, трэба дапамагчы беларускаму селяніну ідэолёгічна зрасьціся з задачамі Кастрычніка, і гэта павінен зрабіць наш новы пясьняр, радзіўшыся разам з Кастрычнікавай рэволюцыяй, пранікнуты сам ідэямі Кастрычнікавай рэволюцыі.

Мы зрабілі толькі першую частку сваёй працы. Мы пакульшто зруйнавалі галоўныя падставы капіталістычнага парадку у быўшай Расіі, а разам з гэтым і ў Беларусі. Мы ўзялі ў рукі рабочае клясы цэлы шэраг падстаў, апорных пунктаў, на якія ён цяпер апіраецца і вядзе за сабой сялянства па шляху пабудовы соцыялізму. Але мы, таварышы, зруйнаваўшы падставы капіталістычнага панаваньня, толькі пачалі замацоўваць соцыялістычныя элементы ў горадзе і праз гэта стараемся цяпер будаваць новае соцыялістычнае ў вёсцы, руйнуючы сярод сялянства ўсе тыя падставы, якія зьяўляюцца падставамі адраджэньня і

ўзмацненьня ізноў капіталістычных адносін. Мы зруйнавалі буйных капіталістых, але мы не зруйнавалі асаблівасьцяй сялянскай гаспадаркі; мы не зруйнавалі той сялянскай экономікі, якая пабудована на падставе прыватнай уласнасьці. Гэтыя асаблівасьці сялянскай экономікі зьўляюцца тэй падставай, на якой ізноў і ізноў могуць вырастаць капіталістычныя адносіны, на якіх яны ўзмацняюцца, на якіх яны ізноў могуць разьвівацца, а разам з гэтым перашкаджаць нашай працы па пабудове социялізму.

Сучасны момант якраз характарызуецца тым, што паміж нашымі імкненьнямі да пабудовы социялізму і паміж гэтымі капіталістычнымі элемэнтамі ідзе змаганьне. Ад таго, якія сілы перамогуць у гэтым змаганьні, будзе залежаць будаваньне социялізму.

Мы перашлі цяпер у такі пэрыод, у які нам трэба руйнаваць у сялянскай экономіцы ўсё тое, што зьяўляецца падставай да зараджэньня капіталістычных адносін. І руйнуючы ўсё гэта, нам трэба, таварышы, прыстасаваць наша сялянства да тых соцыялістычных элемэнтаў нашага жыцьця, якія ўжо ёсьць, і якія мы з кожным годам павінны пашыраць і паглыбляць.

Вось гэтая надзвычайна вялікая задача, якую нам трэба вырашыць, больш цяжкая, чым вырашаная ўжо намі першая задача—зьніштажэньня буйнага капіталу—патрабуе ад нас таго, каб мы напружылі ўсе свае сілы, каб мы мобілізавалі і матэрыяльныя і духоўныя нашыя магчымасьці і каб шырокім фронтам пашлі ўперад.

Вялікае значэньне павінен мець пры вырашэньні гэтых задач новы рэволюцыйны пясьняр. Усё тое новае, што нараджаецца ў нашай вёсцы трэба аформляць, замацоўваць ідэолёгічна; трэба даваць мастацкія прыклады таго новага, да чаго мы павінны йсьці; трэба мастацкімі малюнкамі вызываць нянавісьць да таго старогa, што яшчэ і цяпер цягне нас назад, што можа нас адкінуць ізноў назад да капіталістычнага парадку. Усё гэта—заданьні „Маладняка“.

Такім чынам, таварышы, мы глядзім на вашую організацыю, як на такую, якая дасьць рэволюцыі *песьняроў дынамікі соцыялістычнага будаваньня.*

У вашай працы вы будзеце сустракаць шмат перашкод. Важнейшай і галоўнейшай перашкодай у вашай працы будзе тое, што вы, самі нарадзіўшыяся ў глухіх кутках нашай вёскі, знаходзіцеся ў пастаяннай сувязі з вёскай, а таму і будзеце падпадаць пад уплывы ўсяго таго, і новага і старога, што перажывае наша вёска, усяго таго, што вядзе селяніна да соцыялізму, а разам з гэтым і таго, што адцягвае нашу вёску назад, што перашкаджае ўстанаўленьню сувязі сялянства з дыктатурай пролетарыяту.

І вось, моцна стоячы на грунце новага, да чаго заве Комуністычная партыя, вы павінны руйнаваць старое, перамагаць перашкоды і гэтым самым дапамагаць і нашай вёсцы, нашаму бяднейшаму сялянству таксама вызваляцца ад цяжкіх ланцугоў старога.

Ня гледзячы на тое, што мы налічваем толькі два гады існаваньня „Маладняка“, яго праца ўжо дала нам прыклады таго, што „Маладняк“ зразумеў шлях, па якім ён павіненісьці, ён зразумеў, што Беларусь прысьці да лепшага жыцьця можа толькі праз Савецкі парадак, толькі пры дыктатуры рабочае клясы, як тэй клясы, на якую гістарычна выпадае роля правадыра да соцыялізму. Вы павінны, таварышы, гэты шлях, на якім вы сталі, на якім цяпер стаіцё, не пакідаць і ў далейшым. Той, хто ня з намі, з рабочай клясай, з дыктатурай пролетарыяту, з Комуністычнай партыяй—той проціў нас.

Хто не зразумее гэтага, той, ня гледзячы на самае шчырае імкненьне дапамагчы беларускаму селяніну ў яго барацьбе за лепшую

будучыну, об'ектыўна становіцца ворагам сялянства, ворагам Савецкай улады, ворагам Комуністычнай партыі. Мы маем шэраг прыкладаў, як сярод беларускай інтэлігенцыі, якая суб'ектыўна зусім шчыра хацела-б лепшага будучага для працоўнага сялянства Беларусі, ёсьць ухілы об'ектыўна варожыя Савецкаму парадку, бо гэтыя інтэлігенты не зразумелі дыктатуры пролетарыяту і ролі Комуністычнай партыі. Аб гэтых ухілах вы тут гаварылі і ў сваіх выступленьнях ўжо асуджалі. Нам трэба берагчыся гэткіх ухілаў, нам трэба для гэтага заўжды прыстасоўваць задачы Савецкай Беларусі, да агульных мэт, якія стаяць перад пролетарыятам, перад Кастрычнікавай рэволюцыяй.

Я ўпэўнен, таварышы, у тым, што вы, радзіўшыяся ад Вялікага Кастрычніка, будзеце вернымі сынамі гэтага Кастрычніка; я ўпэўнен, таварышы, што нашае патрабаваньне, каб вы былі песьнярамі дынамікі соцыялістычнага будаваньня, вы выканаеце. Вы будзеце ня толькі песьнярамі, але разам з гэтым і будаўнікамі таго новага, што называецца соцыялізм.

Дык пажадаю-ж, таварышы, выканаць тое, чаго ад вас у сучасны момант і ў будучым патрабуе Кастрычнікавая рэволюцыя. Пажадаю вам, таварышы, каб вашы шэрагі пашыраліся, каб у вашы шэрагі прыходзілі ўсе тыя, хто шчыра жадае лепшага будучага для нашага працоўнага народу і хто гэтага лепшага будучага будзе дамагацца праз дыктатуру рабочае клясы, праз савецкі падарак, пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі. *(Доўгія аплёдысмэнты, якія перашлі ў овацыю).*

## Садаклад тав. Дубоўкі па дакладзе „творчы шлях „Маладняка“.

Формальна-мастацкі бок беларускага прыгожага пісьменства ў агуле не дасьледаваны. Можна пералічыць усе артыкулы, якія напісаны на гэтую тэму. Няма досьледаў аб паасобных аўтарах. Тым больш цяжка казаць аб дасягненьнях цэлага аб'яднаньня маладых поэтаў і пісьменьнікаў у гэтай галіне. Шаноўныя чытачы прымуць гэта пад увагу: маёй задачай, у дні маладнякоўскага зьезду і сьвяткаваньня другой гадавіны, зьяўляецца папярэдні абеглы аналіз. Толькі разгледзеўшы паасобныя галіны, падсумаваўшы тэхнічныя прыёмы, можна будзе даць больш-менш сталы нарыс.

Першае, што ўнесьлі маладнякоўцы ў беларускае прыгожае пісьменства (апрача тэматыкі, на чым я зусім ня буду спыняцца)—новыя мэтры і рытмы. Поэма Міхася Чарота „Босыя на вогнішчы“ разглядалася некаторай часткай чытачоў, як нейкі „гвалт над формай“. „Няроўныя радкі“, новы энэргічны рытм для вуха, звыкшага да павольных 4-5 стопных ямбаў і хорэяў—прымаліся як „кошчунства“ нейкае. За Чаротам пашлі іншыя маладнякоўцы. Вольны верш—дольнікі—паўзьнікі чаргаваліся адзін за адным, паступова зьмяняючыся, атрымоўваючы, я-б сказаў, беларускую ахварбоўку. У гэты час пануючыя мэтры—вольны верш, паўзьнікі на падставе (пераважна) анапэстаў і невялікая частка клясычных разьмераў. Гэтыя апошнія вар'іруюцца з дапамогаю іпостас (замена аднаго разьмеру другім), строфічнай пабудовы і пераносу частак сказаў з аднаго ў другі радок.

Некаторыя паасобныя таварышы ўхіляюцца ў бок запазычаных разьмераў беларускай народнай песьні. Пакуль што гэта адзіночныя выпадкі (Я. Пушча, М. Чарот), але трэба пажадаць, каб маладнякоўцы не закідалі і гэтага: вывучэньне і ўжываньне ва ўласнай творчасьці народных рытмаў можа даць цікавыя вынікі.

Ясна, што зацікаўленасьць да народнай творчасьці адбіваецца ня толькі на рытміцы: за гэтым ідзе і мова, і мілагучнасьць, і композыцыя. Я папрабую ўвязаць разгляд гэтага з агульнымі прыёмамі мастацкай творчасьці.

Перш-на-перш—мова.

Беларуская мова ворагамі яе кваліфікавался як „зборная" і „мяшаная". Бачылі „шмат" запазычаньняў з расійскай, польскай і хто ведае яшчэ з якой.

Гісторыкі нашае мовы давядуць абсурднасьць гэткай кваліфікацыі, але яны не адмовяцца ад таго, што значны лік русыцызмаў і полёнізмаў у нашай мове ёсьць (калі ўзяць гэта ў проц. адносінах, дык будзе 1,5 проц.). Да гэтага трэба дадаць беднасьць нашае *літаратурнае* мовы ў фразэолёгіі і адценьнях, пры нязвычайным багацьці *народнай* мовы ў гэтых адносінах. Тлумачэньне кароткае: большасьць нас, грэшных, выхоўвалася ў расійскіх, а то і польскіх школах. Народная мова забывалася. Цяпер прыходзіцца праводзіць значную працу, каб пазбыцца гэтае хібы. Вядзецца яна Інстытутам Беларускае Культуры, але вядзецца і ператвараецца ў творах, у жывым слове і маладнякоўцамі.

Прынцыпы, якія кладуцца ў падставу гэтага, наступныя:

1. Кожнае слова *жывой народнай мовы*, а таксама і паасобных гутарак,—мае права і павінна быць уведзеным у літаратурную мову. Калі на адно паняцьце ёсьць некалькі слоў, іх можна скарыстаць для ўзбагачэньня адценьняў (сум, туга, журба, жуда, нуда, маркота; барвовы, пярэсты, стракаты; сьцюжа, холад, золкасьць і г. д. і г. д.).

2. Ад кожнага слова жывой народнай мовы можа быць утворана новае. Ад таленавітасьці пісьменьніка залежыць, каб наватвор атрымаў „правы грамадзянства". У свой час М. Багдановіч час-ад-часу прабаваў рабіць гэта. Я прывяду адзін прыклад. Аналёгічна з расійскім „окропит" М. Багдановіч утварыў быў слова „акрынічыць", „акрынічыла". Маладнякоўцы ўтварылі цэлы шэраг новых слоў, некаторыя з якіх прашлі ўжо ў жывую мову (крынічыць, лявоніць, мклівасьць і г. д.).

Зразумела, што толькі прынцыпы колектыўнасьці дапамогуць маладнякоўцам праводзіць плённую працу ў гэтым напрамку. Вялікую ролю адыграе і „естественный отбор". Так, калі якое-небудзь слова ўжытае ў поэтычным творы, другімі ня ўжываецца,—яго трэба адкідаць, прабуючы новае. Толькі гэтым шляхам можна пазбыцца штучнасьці і стварыць блізкую да ўсяго працоўнага народу мову, не адарваную ад яго, як большасьць літаратурных моў сьвету адарвана ад сваіх народных моў.

Дасягнуць гэтага можна шляхам грунтоўнага вывучэньня народных гутарак, народнай творчасьці, а таксама шляхам азнаямленьня маладых поэтаў са слоўнікамі. Ня трэба палохацца цяжкасьці перачытваньня нашых слоўнікаў па разу і па два: вынікі гэтага будуць значныя.

Нашто ўжо апрацавана французская або расійская мова, а і французскія пісьменьнікі,—напрыклад, Хозэ Марыя Д'Эрэдыа,—у свой час па некалькі разоў перачытвалі свае акадэмічныя слоўнікі. Тым больш трэба рабіць гэта ў нас.

Шліфуючы мову, крышталізуючы яе, маладнякоўцы не забываюцца на мілагучнасьць.

У № 8 часопісу „Маладняк" дадзены агляд вершаў Я. Пушчы, у якім крыху зачэплена і мілагучнасьць. Усе прыёмы мілагучнасьці можна знайсьці прыгожа-перавітымі ў маладнякоўскіх творах (анафора,

эпіфора, а цыкл, інтэркаляцыя і г. д. [1]). Апрача таго, выпрацоўваюцца ўласныя, беларускія. Можна сьмела сказаць, што ў адносінах да мілагучнасьці некаторыя маладнякоўскія творы стаяць на эўропэйскім ўзроўні.

Прывяду толькі адну цытату, якая пададзена ў памянёным артыкуле:

Сонца бліскучым пласконьнем
Іскры ў тумане губляе,
Ветры, пужлівыя коні,
Рвуцца ў мурожныя далі.

**(Я. Пушча).**

Нельга не закрануць тут і рыфмоўкі. Дзеяслоўныя рыфмы ў маладнякоўскіх творах паступова „выганяюцца“. Шліфоўка рыфмы, паколькі большасьць піша рыфмаваным вершам, не прымушае чакаць лепшага.

Ізноў-жа, і ў гэтых адносінах прыходзіцца трымаць орыентацыю на народную творчасьць. Той, хто хоць крыху знаёмы з ёй, пасьведчыць, што ў адносінах сугучнасьці канчаткаў народная творчасьць стаіць высока. Я ня буду прыводзіць прыкладаў на поўнагучныя рыфмы. Скажу толькі, што рыфмоўка на дысонансы, што ўведзена ў расійскай літаратуры сымболістымі і пашырана імажыністымі,—ёсьць у нашай народнай песьні. Прыклад—

На капусьце дробна л і с ь ц е,
Памаленьку хлопцы л е з ь ц е...

Гэткую-ж самую падставу дае наша народная песьня і для маладнякоўскіх вобразаў. Дарма некаторыя „крытыкі“ лаюць маладнякоўцаў у „імажынізьме“, у незразумеласьці вобразаў.

Даволі ўзяць некалькі прыкладаў народнай песьні, зьмешчаных у „Гісторыі бел. літар.“ М. Гарэцкага—

Думамі надумала лясы цёмныя,
Сьлёзамі зьліла рэчкі-возеры...

**Альбо—**

Ах мілы мой, глуміўся мной:
Сеяў палын на маім сэрцы,
Клаў агні на маіх плечках,
Рабіў скрыпкі з маіх ручак,
Пускаў сьлёзы з маіх вочак,
Увязваў коні да маіх косак...

Нязвычайнае хараство гэтых прыкладаў *проста такі вымагае* ад нашых поэтаў, каб яны вялі далей стварэньне мастацкіх вобразаў, узбагачаючы тым формальна-мастацкі бок і паглыбляючы зьмест поэтычных твораў.

У кароткім артыкуле нельга спыняцца на прыкладах (гл. вершы М. Чарота, Я. Пушчы, А. Дудара і інш.); прыходзіцца толькі спасылацца на творчасьць тых ці іншых паасобных таварышоў.

Адзінае, што знаходзіцца ў „загоне“ ў маладнякоўцаў—гэта строфічная композыцыя (увязка радкоў). Праўда, гэта зьява агульная для нашых дзён—пашырана яна і ў расійскай літаратуры.

Ня ідзе тут гутарка аб ухіле ў бок формальна-мастацкі, ня ідзе тут гутарка аб звароце да сонатаў, трыолетаў і іншых клясычных формаў. Але ўсё-ткі трэба констатаваць *беднасьць* нашай строфікі: чатырохрадкоўе—пануючая форма. Трэба зьвярнуць вялікую ўвагу на гэта пытаньне як з боку тэорытычнага, так і з боку практычнага.

---

[1]) Глядзі № 8 „Маладняка“.

Крыху лепш стаіць справа з агульнай композыцыяй лірычных вершаў. Але і тут шмат што трэба рабіць. Ізноў-жа народная творчасьць павінна быць тэй крыніцай, з якой маладнякоўцы будуць чэрпаць орыгінальныя, сьвежыя прыёмы, стылізаваць іх і пашыраць.

Тыя композыцыйныя прыёмы, якія ўводзіліся расійскімі сымболістымі, мелі вялікую сувязь з народнай творчасьцю.

Возьмем, прыкл., верш З. Гіппіус.

— Окно мое высоко над землею,
высоко над землею...

Народная песьня:

Пераступі, Адарка, нізкі парог,
нізкі парог,
Кланяйся татку нізка да ног,
нізка да ног...

Таксама ў галіне сюжэтнай композыцыі. У зборніку „Опояз" (Ленінград, 1919 г.) *„Поэтыка"* зьмешчаны цэлы артыкул на гэту тэму, які ў значнай частцы грунтуецца на беларускіх народных казках. Калі нашы суседзі цікавяцца нашай народнай творчасьцю для ўзбагачэньня тэхнічных прыёмаў, дык тым больш, у першую чаргу, павінны пацікавіцца гэтым мы самі.

Толькі прымаючы пад увагу ўсё сказанае, пашыраючы запас сваіх вед і навыкаў у галіне формальна-мастацкай, „Маладняк" здолее даць і Беларусі, а ў далейшым і сьвету, сапраўды высока-мастацкія творы.

Будзем спадзявацца, што маладая сіла здолее дасягнуць усяго гэтага.

## Прывітальнае слова Галубка.

Я, як працаўнік сярод гушчаў сялянства, скажу: працуйце больш для вёскі, для гарапашнага сялянства. Яму патрэбна братняе, друкаванае слова.

Наш селянін сёньня стаіць і не дае веры, якое шчасьце стаіць перад ім.

„Малядняк" павінен працаваць для беларускае вёскі.

Будучы ў глухім Палесьсі, бачыў я, што будуецца царква—сьціснула маё сэрца. Цемра пануе ў вёсцы, таварышы, яшчэ дагэтуль, і „Маладняк" павінен рваць, выкарчоўваць яе з карэньнем.

У Барысаве я бачыў, што будуюцца 2 сінагогі, у Лепелі—тож самае. Запытаўся я: на якія сродкі будуеце вы гэта?

Мне адказалі: Амэрыканскі доляр!

Таварышы маладнякоўцы, капіталістыя Захаду даюць грошы, каб гэтым самым трымаць сярмяжную Беларусь у цемры!

Маладнякоўцы!

Я, як народны рабоча-сялянскі актор, буду прабіваць вам шлях да зьнішчэньня гэтае цемры.

А вы ідзеце за намі са сваім друкаваным словам, бо думкі ў нас—адны.

Хай расьце і квітнее „Маладняк"!

## Пасяджэньне 5.

*9 лістапада 1925 году.*

### Спрэчкі па дакладзе Бабарэкі і Дубоўкі.

Тав. Касьпяровіч: Мы заслухалі даклад аб творчым шляху „Маладняка" ў сэнсе зьместу і садаклад у сэнсе формальна-мастацкіх дасягненьняў. Але трэба будзе ў заключным слове адзначыць бліжэйшае будучае нашага творчага шляху. Апрача паказаных дакладчыкамі

дасягненьняў, мы маем і іншыя ў галіне крытыкі. У да-Кастрычнікаўскі кругабег нашае літаратуры зьбіраньнем біографічных матэрыялаў займаўся Земкевіч. Максім Гарэцкі і іншыя працуюць спосабамі гісторыка-біографічнымі. Антон Навіна і іншыя даюць соцыяльна-публіцыстычныя разгляды творчасьці. Максіма Багдановіча цікавіла эстэтычная крытыка беларускай пісьменнасьці. Як беларуская літаратура перабывала ва ўсіх літаратурных кірунках, ня ўзяўшы сабе якога-небудзь з іх як самамэтнага, так і беларуская крытыка карысталася прыёмамі розных крытычных школ, у большасьці ўжываючы эклектычную, гэта значыць, выбарчую крытыку, не выліваючыся ў сталую форму якой—колечы крытычнай школы. Яна таксама, як і літаратура, мела ў сваёй аснове адраджанізм. Пасьля Кастрычніка ў нас зьяўляюцца першыя спробы маркысцкай крытыкі. Як вядома, заданьне крытыкі—пазнаёміць шырокія масы з творам, або выправіць няправільныя разуменьні яго, або ўсьведаміць гэтае разуменьне. Гэту справу ў адносінах да маладнякоўскай творчасьці маглі рабіць адны асобы, якія зьяўляюцца часткай „Маладняка". Гэта заданьне і выконваюць Бабарэка і Дубоўка. Бязумоўна, яны зрабілі вялікія дасягненьні. Іх задача, апрача разгляду творчасьці, падняць шырокія колы да разуменьня гэтай творчасьці, а ня спушчаць творчасьць да мастацка-няпісьменных мас.

Калі філіі зьбіралі народную творчасьць і знаёміліся з ёю непасрэдна, а не па тэндэнцыйных зборніках, дык гэта добра. На аснове народнай творчасьці мы будзем тварыць новы стыль. Але ня трэба ўдавацца ў этнографізм. Праз нацыянальныя формы творчасьці і мысьленьня мы павінны імкнуцца да інтэрнацыянальных.

Тав. Вольны: Калі гаварыць аб дакладзе Бабарэкі, то можна сказаць словамі Валайтэса па дакладзе Крыніцкага. „У васнове можна згадзіцца". Трэба паклапаціцца аб выхаваньні марксыцкага сьветапогляду. Цяпер аб Шукайле. Шукайла казаў аб васільках і мілагучнасьці. Без мілагучнасьці поэзіі няма. Нашы творы павінны быць ня толькі ідэолёгічна вытрыманымі, але і мастацкімі. Валайтэс ідэолёгічна вытраманы, а Есенін—памастацку, у Шукайлы ёсьць месца: „Сукін сын і смаркаты" —нельга казаць, што тут найглыбейшая поэзія. Ня ўсякі агроном крытык.

Тав. Мазуркевіч: Я ня зусім згодзен са зьбіраньнем народнай творчасьці на мясцох. Мне здаецца, што гэта карысна, і Пушча быў праў, калі гаварыў, што трэба вывучаць народную творчасьць. Ня толькі браць са сваёй літаратуры, а з іншых браць карысна.

### Заключнае слова тав. Дубоўкі.

Тут гаварылася шмат цікавага. Калі я гаварыў, што мы павінны знаць сваю бацькаўшчыну, дык гэта факт. За падставу мы павінны ўзяць народную творчасьць. Я дазволю сабе сказаць аб рыфмоўцы, аб якой я ўчора не казаў. Я вам прывяду рыфму з народнай творчасьці:

Пашоў дзед у грыбы
Баба ў апенькі
Найшоў дзед тры рублі
Баба ні капейкі

Вось такой рыфмоўкі пажадана, каб і ў нас была. Шукайла кажа, як пачнуць аб народнай творчасьці, дык тут монархізм і г. д. Калі ўзяць народныя казакі, дык іх можна і цяпер надрукаваць. Наконт этнографіі я сказаў, што мы павінны адыходзіць ад этнографіі. Трэба даваць такія творы, якія перакладаліся-б на іншыя мовы.

З Валайтэсам можна пагадзіцца, што ня трэба занадта залазіць у народную творчасьць.

Адносна прозы. Асноўнае сучаснай прозы, што старыя монатонныя формы аджылі свой век. „Скокі цаліны“ зьяўляюцца паказальнікам, якой прозы не павінна быць. Кожны пісьменьнік павінен ведаць аб поэзіі і наадварот. Павінна быць мілагучнасьць і ў прозе. У прозе павінна быць і вобразнасьць і чыстата мовы.

### Заключнае слова т. Бабарэкі.

Пачнем з адраджанізму. Трэба сказаць, што я вызначыў літаратурныя кірункі па тым асноўным, што ёсьць у творчасьці. Калі я казаў, што раней у літаратуры была барацьба за лепшае, дык там ужо знаходзяцца і формы.

Маладнякізм, выходзячы з формы модэрнізацыі формаў, я кажу, што магло новае даць пасьля Кастрычнікавай рэволюцыі. Тут трэба скарыстаць вопыт мінулага.

Далей Валайтэс сказаў, трэба цурацца шкоднага. Але не сказаў нічога аб гэтым шкодным, не падышоў да яго з вядомай меркай. Ясна, што з папярэдняга мы павінны ўзяць вопыт у сэнсе мастацтва.

Хачу яшчэ спыніцца на непаразуменьнях выступленьня Валайтэса. За цытаты Леніна, дзякуем, але і мы ведаем. І ведаем, што мастацкі твор павінен рабіць уплыў на псыхіку мас. Хачу спыніцца на „Нёмане“. Гэты верш напісаны да рэволюцыі. Трэба глыбей адносіцца да творчасьці. Гэта заўважаецца ў Шукайлы. Калі ўзяць творчасьць Багдановіча. Гэтым ён выяўляў сучаснасьць. І калі гаварыць, што ў „Сонечных сьцежках“ няма нічога маладнякоўскага, дык гэта таксама падыход нягрунтоўны.

Валайтэс раіць вучыцца ў расейцаў. Але расійская літаратура вучылася ў заходняй. І браць тое, што артыстых сілай прымушалі іграць, гэтага мы ня будзем пераймаць. Далей да васількоў.

У рэзолюцыі ЦК зазначана ясна, што і ўжываньне васількоў і ветру ня ёсьць што-небудзь нявытрыманае.

Дасягненьні мясцовыя яшчэ трудна адзначаць.

Апошняе вось што. Якімі шляхаміісьці далей. Вывучэньне народнай творчасьці: каб пазнаць прынцыпы творчасьці, мы павінны быць вучнямі жыцьця.

Пропозыцыя аб выбраньні камісіі па выпрацоўцы рэзолюцыі па дакладзе творчы шлях „Маладняка“.

Камісія зацьвярджаецца ў наступным складзе: 1) Бабарэка; 2) Дубоўка, Гадзінскі, Александровіч, Пушча.

## Справаздача мандатнай камісіі.

*(Язэп Пушча).*

I.

| | |
|---|---|
| Усіх дэлегатаў | 71 |
| а) З рашаючым голасам | 63 |
| б) З дарадчым | 8 |

II.

**Па нацыянальнасьці:**

| | |
|---|---|
| а) Беларусаў | 64 |
| б) Украінцаў | 2 |
| в) Яўрэяў | 3 |
| г) Немцаў | 1 |
| д) Літоўцаў | 1 |

III.

**Соцыяльны склад.**

| | |
|---|---|
| а) Рабочых | 12 |
| б) Сялян | 48 |
| в) Інтэлігентаў | 11 |

IV.

**Партыйны склад.**

| | |
|---|---|
| а) Членаў і кандыдатаў КПБ | 15 |
| б) Членаў і кандыдатаў ЛКСМБ | 24 |
| в) Беспартыйных | 32 |

V.

**З якіх рэспублік.**

| | |
|---|---|
| а) БССР | 61 |
| б) УССР | 2 |
| в) РСФСР | 8 |

VI.

**Адукацыя.**

| | |
|---|---|
| а) Вышэйшая | 10 |
| б) Сярэдняя | 57 |
| в) Хатняя | 4 |

VII.

**Ўзрост.**

| | |
|---|---|
| а) Да дваццаці гадоў | 26 |
| б) Ад 20 да 30 | 39 |
| в) Звыш 30 | 6 |

VIII.

| | |
|---|---|
| Зборнікі маюць | 15 |

### Рэзолюцыя па дакладзе сакратара ЦК КПБ т. Крыніцкага.

Першы Ўсебеларускі Зьезд „Маладняка" цалкам далучаецца да політыкі ЦК КПБ(б), якая вядзецца па адбудаваньні соцыялістычнае Беларусі, і зазначае, што праца „Маладняка" можа быць толькі пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі.

Зьезд ганьбуе тую невялікую частку беларускай інтэлігенцыі, якая вядзе барацьбу супроць дыктатуры пралетарыяту і імкнецца павесьці працоўныя масы Беларусі па нацыянальна-дэмократычнай дарозе.

Зьезд упэўнены, што пераважная большасьць беларускай інтэлігенцыі рашуча асудзіць такія выпадкі і надалей, як і зараз, будзе працаваць пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі.

Зьезд даручае Цэнтральнаму Бюро ад імя 1-га Ўсебеларускага Зьезду Поэтаў і Пісьменьнікаў „Маладняк" вітаць усебеларускую партыйную конфэрэнцыю і запэўніць яе, што „Маладняк" заўсёды будзе стаяць на варце заваёў Кастрычніка і заветаў Леніна.

### Рэзолюцыя па справаздачы ЦБ „Маладняка".

Першы Зьезд Усебеларускага аб'яднаньня Поэтаў і Пісьменьнікаў „Маладняк" лічыць лінію працы ЦБ правільнай. Першы кругабег працы „Маладняка" быў, пераважна, організацыйны; па лініі выхаваўчай сябры „Маладняка" за мінулы час значна вырасьлі, і гэта выяўляецца ў пашырэньні тэматыкі і ва ўдасканаленьні формальна-мастацкага боку. Зьезд лічыць, што ў другім кругабегу „Маладняк" павінен будзе зьвярнуць найвялікшую ўвагу на сваё выхаваньне.

Папершае, гэта павінна выяўляцца ў пашырэньні марксыцкага сьветапагляду.

Падругое, у грунтоўным азнаямленьні з дасягненьнямі нашых суседзяў у галіне формальна-мастацкай і, пераважна, у вадносінах прозы і драмы.

У выдавецкай галіне наша мэта—даць зразумелы па зьмесьце мастацкі твор для комсамольскай, рабоча-сялянскай моладзі, настаўніцтва, інтэлігенцыі. У выдавецкай працы зьезд прапануе імкнуцца, побач з паляпшэньнем тэхнікі выданьня, і да ўдзешаўленьня кнігі. Адначасна зьезд лічыць, што трэба зьвярнуць большую ўвагу на выданьне тэатральных твораў, мастацкай прозы і перакладаў сучасных твораў з чужаземных моў.

Зьезд зазначае, што трэба надалей у плянавай працы ЦБ зьвярнуць большую ўвагу на сувязь з мясцовымі філіямі і выхаваньне адзіночак.

### Рэзолюцыя па дакладзе „Творчы шлях „Маладняка".

Першы Ўсебеларускі зьезд па дакладзе „Творчы шлях „Маладняка" сьцьвярджае, што:

1. Гісторыя беларускай літаратуры, гісторыя кірункаў яе разьвіцьця зьяўляецца гісторыяй формаў, у якіх матэрыялізавалася ба-

рацьба беларускага працоўнага люду за сваё вызваленьне, за сваё існаваньне, за вызваленьне сваіх творчых сіл з тых рамак, у якія яны былі апраўлены гістарычнымі ўмовамі жыцьця.

2. Кірунак адраджанізму ёсьць вынік гэтага змаганьня. У пасьлякастрычнікаўскую эпоху беларуская літаратура разбурае літаратурныя кірункі мінулай літаратуры, як клясава аджытыя, і пачынае разьвівацца ў новым літаратурна-грамадзкім кірунку.

3. Першым выяўленьнем гэтага кірунку зьяўляецца большае зразуменьне сучасных заданьняў беларускай літаратуры, выяўленьне ўздыму вызваленых творчых сіл Беларусі цераз колькасны ўзрост арганізаваных літаратурных сіл і палепшаньне якасьці іх творчай продукцыі.

4. Другім выяўленьнем новага літаратурна-грамадзкага кірунку зьяўляецца нітаваньне сродкаў мастацкіх са сродкамі грамадзкімі ў справе разьвіцьця беларускай літаратуры: зьбіраньне мастацкіх сіл, колектыўнае іх аформленьне, змаганьне за аўладаньне мастацтвам, як зброяй клясавых змаганьняў.

5. Шуканьне творчага грунту, імкненьне да індывідуальнага аформленьня маладнякоўцаў у творчасьці цераз студыйную працу, цераз паглыбленьне сваіх ведаў—гэта трэцяе выяўленьне новага літаратурна-грамадзкага кірунку. Гэта зьвязана з фактычным утварэньнем маладнякоўскай літаратуры.

6. Мастацкі зьмест новага літаратурна-грамадзкага кірунку вызначаецца асноўным у творчасьці маладнякоўцаў, якое зьяўляецца станаўленьнем у беларускай літаратуры маладога жыцьця вызваленых творчых сіл. Апошні пэрыод маладнякоўскай творчасьці характарызуецца адраджэньнем жыцьця мастацтва.

7. Далейшы творчы шлях „Маладняка“ ляжыць цераз далейшае нітаваньне грамадзкай і літаратурнай працы, цераз далейшае паглыбленьне разьвіцьця мастацкай прозы пад знакам творчага аформленьня маладнякоўцаў. Маладнякоўцы павінны пашырыць як рамкі ўбіраньня ў сябе творчага вопыту народнай творчасьці і непасрэдных беларускіх пісьменьнікаў, так і вопыту літаратур Захаду і Усходу, каб на гэтым грунце стварыць станаўленьне новага жыцьця мастацтва, як формы матэрыялізацыі вялікага стыку Захаду і Усходу.

**Рэзолюцыя па дакладзе аб організацыйным пытаньні.**

„Маладняк“ яднаецца не па прынцыпе формальна-мастацкіх або літаратурных формаў і кірункаў, а яго яднае адзіны социяльны грунт, адзіная пролетарская ідэолёгія, адзіны сьветапогляд на літаратуру, як на зброю клясавай барацьбы за хутчэйшае пабудаваньне комуністычнага ладу.

Літстудыі і літгурткі філіі могуць організоўваць там, дзе ёсьць рабочыя і сяляне, якія імкнуцца да выяўленьня сваёй літаратурна-мастацкай здольнасьці.

„Маладняк“ у штодзеннай сваёй працы трымае моцную сувязь з літаратурнымі групамі нацыянальных меншасьцяй, адзінай з імі ідэолёгічнай пляцформы, і падрыхтоўвае грунт дзеля аб'яднаньня з „Маладняком“ у вадзінае ўсебеларускае аб'яднаньне пролетарскіх поэтаў і пісьменьнікаў.

У барацьбе з буржуазнымі і дробна-буржуазнымі ўхіламі ў літаратуры „Маладняк“ будзе ў цэнтры і на мясцохісьці рука ў руку з ВАПП'ам.

Зьезд даручае ЦБ распрацаваць пытаньне аб больш цеснай сувязі з усесаюзнымі аб'яднаньнямі пролетарскіх пісьменьнікаў, а таксама з пролетарскімі пісьменьнікамі ўсіх Саюзных Рэспублік.

## 1-шы пленум ЦБ „Маладняка“ новага скліканьня.

1-шы пленум Цэнтральнага Бюро „Маладняка“ 29 лістапада адразу па зачыненьні зьезду сабраўся дзеля разьмеркаваньня абавязкаў сяброў ЦБ.

Па абгаварваньні пытаньня, пастанавілі сакратарыяту не ствараць, а замест яго скласьці гэткі прэзыдыум:

*Старшыня прэзыдыуму ЦБ т. Чарот Міхась, адказны сакратар ЦБ Александровіч Андрэй, загадчык оргаддзелу—т. Вольны Анатолі, выхаваўчы аддзел—Зарэцкі Міхась, крытычна-дасьледчы—Бабарэка Адам, рэдакцыйна-выдавецкі—Я. Пушча* (ён-жа і літсакратар).

Пленум даручыў прэзыдыуму выдаць бюлетэнь зьезду, які і разаслаць па філіях і іншых організацыях.

# Чытайце і распаўсюджвайце „Маладняк“

**літаратурна-мастацкі і грамадзка-палітычны часопіс ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ.**

Пад рэдакцыяй:

**Александровіча, Адзінца, Гэсена.**

*У лютым вышаў „Маладняк“ № 10.*

**Літаратурна-мастацкі аддзел.**

1. **К. Чорны**—Вечар (апавяданьне). 2. **Алесь Дудар**—Браты (верш.). 3. **М. Дубовік**—Хай восень... (верш). 4. **М. Дубовік**—А я—пайду...(верш). 5. **Янка Кавалёнак**—З лясных мэлёдый. 6. **А. Дудар**—Легенда. 7. **Міхась Дуброўскі** — З вянка сонэтаў. 8. **Адам Бабарэка** — Званіў званар. 9. **А. Якімовіч** — Восень (верш). 10. **Туміловіч**—Я пакінуў (верш). 11. **Янка Бобрык**—Песьня і праца (верш). 12. **Янка Бобрык**—У дарозе (верш). 13. **Ф. Шыльлер**—Чаканьне (верш). 14. **Ф. Шыльлер**—Вечар (верш, пераклады Гаўрука). 15. **Глебка П.**—З песень аб „Маладняку“. 16. **Я. Журба**—Маладняцкая песьня.

**Сатыра.**

17. **Крапіва**—Пад грукат кол (апавяданьне). 18. **Крапіва**—Чырвонец (байка).

**Грамадзка-палітычны аддзел.**

19. **Н. Зімін**—Комсамол Беларусі. 20. **Ус. Ігнатоўскі**—Увагі да выніканьня беларускага руху. 21. **А. Паннекук**—Марксызм і дарвінізм. 22. **І. Барашка**—Рэволюцыя 1905 году на Меншчыне.

**Крытыка, кнігапіс, хроніка.**

23. **Адам Бабарэка**—З далін на ўзвышша. 24. **Ул. Дубоўка**—Два гады „Маладняка“.

**Дадзены рэцэнзіі на зборнікі:**

1) „Там дзе кіпарысы“—Дубоўка. 2) Вершы—Паўлюк Трус. 3) „Сутарэньне“—А. Александровіч. 4) Выбраныя вершы—Чарот. 5) „Срэбра жыцьця“—Кузьма Чорны. 6. „Сонечныя сьцежкі“—А. Дудар. 7. Аршанскі Маладняк № 2.

**Хроніка.**

## У сакавіку выйдзе № 11.

**Літаратурна-мастацкі аддзел.**

**К. Чорны**—Буланы (апавяданьне); А. **Дудар**—На раздарожжы (верш); **Я. Пушча**—Спаткаем усе мы долю... Я ня знаю нашто ветру дуцца... і Студзёнаю зімою (вершы); **Я. Бобрык**—Ціха, так ціха наўкола... (верш); **А. Лясны**—Яна (верш у прозе); **З. Бандарына**—Завіруха (верш); **Я. Пфляумбаум**—Я маладая... (верш); **В. Маракоў**—На бярозавым шляху (верш у прозе); **Я. Туміловіч**—Не наганяе сум... (верш);

**П. Трус**—Сонэт; **Іл. Барашка**—Гіерогліфы Яэля (верш у прозе); **Суінборн**—З песень у гадзіну працы (пераклад з ангельскае мовы М. Дуброўскага); **А. Звонак**—На ростані (верш); **П. Галавач**—Рубанаўскі вузел (апавяданьне); **Аўтобіографія Сяргея Есеніна. Л. Троцкі**—А (С. Ясеніну (крытычны артыкул); **А. Гурло**—На сьмерць С. Есенін верш); **М. Лужанін**—(верш).

**Сатыра.**

**Крапіва**—Стварэньне сьвету (адрыўкі з бібліі).

**Грамадзка-політычны аддзел.**

**Ус. Ігнатоўскі**—Увагі аб вынікнавеньні руху на Беларусі; **А. Паннекук**—Марксызм і дарвінізм (пераклад з ангельскае мовы Г. Парэчына) **Ю. Дрэйзін**—Проблемы нацыянальнае музыкі; **Майзеліс**—Шляхі сучаснага мастацтва, першая Ўсебеларуская мастацкая выстаўка і організацыя мастацкіх сіл на Беларусі.

**Крытыка, кнігапіс і хроніка.**

**Кожны комсамолец, кожны настаўнік, кожны студэнт і грамадзкі працаўнік павінен чытаць і выпісваць адзіную літаратурна-мастацкую і грамадзка-політычную часопісь для моладзі „МАЛАДНЯК“.**

## Творы маладнякоўцаў.

### Друкуюцца і падрыхтаваны да друку.

1. **Дубовік**—„Сьвітаньне“—вершы.
2. **Дарожны і Плаўнік**—Зборнік вершаў.
3. **Лужанін**—„Занізь“—вершы.
4. **Глебка**—Вершы.
5. **Дудар**—Збор вершаў.
6. **Вольны**—„Песенны хмель“—вершы.
7. **Нікановіч**—Апавяданьні—„Золак“.
8. „ —Апавяданьні—„Радасьць“.
9. **Кузьма Чорны**—Дзьве аповесьці.
10. **М. Чарот**—„Сьвінапас“ (аповесьць).

**Прадаюцца:**

1. **А. Александровіч**—Па беларускім бруку. 1924 г.
2. „ —Паўстанцы. Поэма. 1925 г.
3. „ —Сутарэньне. Апавяданьні. 1925 г.
4. „ —Прозалаць. Вершы. 1926 г.
5. **А. Александровіч, А. Вольны і А. Дудар**—Ваўчаняты. Роман беларускіх лясоў. 1925 г.
6. **А. Бабарэка**—Апавяданьні. 1925 г.
7. **Бандарына, Вішнеўская, Пфляумбаум**—Вершы. 1926 г.
8. **А. Вольны і А. Александровіч**—Комсамольская нота. Вершы 1924 г.
9. **А. Вольны**—Два. Аповесьць. 1925 г.
10. „ „ на яўрэйскай мове „Цвей“. 1925 г.

11. **А. Вольны**—Чорнакудрая радасьць. Вершы 1926 г.
12. **А. Гурло**—Барвенак. Вершы. 1924 г.
13. „ —Спатканьне. Вершы. 1926 г.
14. „ —Сузор'е. Вершы. 1926 г.
15. **Ул. Дубоўка**—Строма. Вершы. 1923 г.
16. „ —Там, дзе кіпарысы. Поэма. 1925 г.
17. „ —Трысьцё. Вершы. 1925 г.
18. „ —Credo. Вершы. 1926 г.
19. **А. Дудар**—Беларусь бунтарская. Вершы. 1925 г.
20. „ —Сонечнымі сьцежкамі. Вершы. 1926 г.
21. „ —Шанхайскі шоўк. Поэма. 1926 г.
22. **Ул. Жылка**—На ростані. Вершы.
23. „ —Уяўленьне. Поэма.
24. **М. Зарэцкі**—У віры жыцьця. Апавяданьні. 1925 г.
25. „ —Пела вясна. Апавяданьні. 1925 г.
26. „ —Пад сонцам. Апавяданьні. 1926 г.
27. **Звонак, Туміловіч, Бобрык**—Пунсовае раньне. Вершы. 1926 г.
28. **Крапіва**—Асьцё. Сатыры. 1925 г.
29. „ —Крапіва. Сатыры. 1925 г.
30. „ —Апавяданьні. Сатыры. 1926 г.
31. „ —Біблія (Друкуецца).
32. **Я. Пушча**—Раніца рыкае. Вершы. 1925 г.
33. „ —Wita. Вершы. 1926 г.
34. **Я. Падабед**—Вершы. 1926 г.
35. **Слуцкія песьняры**—Вершы. 1926 г.
36. **Л. Родзевіч**—Пакрыўджаныя. Драма. 1921 г.
37. „ —Беларусь. Вершы. 1923 г.
38. **П. Трус**—Вершы. 1925 г.
39. „ —Сірата Алеся. Поэма. (Друкуецца).
40. **С. Хурсік**—Першы паўстанак. Апавяданьні. 1925 г.
41. **Хадыка**—Суніцы. Вершы. 1926 г.
42. **М. Чарот**—Завіруха. Вершы. 1922 г.
43. „ —Босыя на вогнішчы. Поэма. 1923 г.
44. „ —Веснаход. Апавяданьні. 1924 г.
45. „ —Выбраныя вершы. 1925 г.
46. „ —Пастушкі. Алеська і Данілка. П'есы. 1925 г.
47. „ —Карчма. Поэма. 1926 г.
48. „ —Марына. Поэма.
49. **К. Чорны**—Апавяданьні. 1925 г.
50. „ —Срэбра жыцьця. Апавяданьні. 1926 г.

---

51. **О. Уайльд**—Баляда Рэдынгскай турмы (пераклад з ангельскай мовы М. Дуброўскага).
52. **Софокль**—Антыгона. Трагедыя (пераклад з стара-грэцкае мовы Ю. Дрэйзіна).

# ЗЬМЕСТ.

Стар.

Прывітаньні зьезду . . . . . . . . . . 3
Адчыненьне зьезду 25 лістапада . . . . . . 8

**Пасяджэньне першае.**

Даклад тав. Крыніцкага . . . . . . . . 20
Спрэчкі па дакладу . . . . . . . . . 28

**Пасяджэньне другое.**

Заключнае слова т. Крыніцкага . . . . . . 35
Справаздача ЦБ Маладняка . . . . . . . 38

**Пасяджэньне трэцяе.**

Справаздача Менскай філіі . . . . . . . 46
Даклад Аршанскай філіі . . . . . . . . 47
Даклад Віцебскай філіі . . . . . . . . —

**Пасяджэньне чацьвертае.**

Справаздача Барысаўскай філіі . . . . . . 48
" Полацкай філіі . . . . . . . 49
" Слуцкай філіі . . . . . . . —
" Калінінскай філіі . . . . . . —
" Маскоўскай філіі . . . . . . 51
" Гомельскай філіі . . . . . . —
Спрэчкі па дакладу ЦБ і садакладах філій . . . 52

**Пасяджэньне пятае.**

Працяг спрэчак па дакладу ЦБ . . . . . . 53
Творчы шлях „Маладняка"—даклад Бабарэкі . . . 55
Прамова тав. Чарвякова . . . . . . . . 68
Творчы шлях „Маладняка" (садаклад Дубоўкі) . . 70
Спрэчкі па дакладу і садакладу . . . . . . —
Заключнае слова Бабарэкі . . . . . . . 75
Справаздача мандатнай камісіі . . . . . . 76
Рэзолюцыі па дакладах . . . . . . . . 77
1-шы пленум ЦБ Маладняка . . . . . . . 79